№№33–34
(2553–2554)

1 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

АНОНС!

Чытайце Быкава!

На жаль, не ўсе творы В.Быкава былі надрукаваны пры яго жыцці. Такі лёс напаткаў і яго аповесць «АФГАНЕЦ». С сённяшняга нумара «Народная воля» пачынае друкаваць гэты твор (гл. стар. 5—6).

АФІЦЫЙНА

Візіт зноў перанесены

У трэці раз перанесена дата візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кіеў. Аднак афіцыйныя крыніцы сцвярджаюць, што візіт не адменены.

Спачатку магчымай датай сустрэчы называлася сярэдзіна лютага. Тыдзень таму ў сакратарыяце прэзідэнта Украіны ў якасці папярэдняй даты візіту А.Лукашэнкі называлі 26 лютага. Зараз пра магчымыя тэрміны прыезду Аляксандра Лукашэнкі гавораць менш дакладна: у сакавіку.

Па адной з версій, сустрэча Лукашэнкі і Юшчанкі адкладваецца з-за арганізацыйных праблем, звязаных з пераразмеркаваннем паўнамоцтваў ва ўкраінскім урадзе. Па другой — у сувязі з тым, што Юшчанка як пасланнік Еўропы пакуль не атрымаў канчатковай прапановы, якую павінен агучыць беларускаму лідэру.

Ул.інф.

ДАРЭЧЫ

Беларускія ліквідатары накіравалі ліст Віктару Юшчанку

Некалькі беларускіх ліквідатараў чарнобыльскай аварыі даслалі зварот на імя прэзідэнта Украіны. Аляксандр Валчанін, Васіль Сільверст і Іван Нікітчанка распавялі Віктару Юшчанку пра сённяшняе становішча ліквідатараў, фактычна пазбаўленых ільгот. Паводле іх слоў, *"нармальнай практыкай стала непрызнанне сувязі паміж захворваннямі і фактам знаходжання ў зоне радыеактыўнага забруджвання"*. Таксама ліквідатары згадалі пра распаўсюджаную ў Беларусі практыку вяртання ў гаспадарчы абарот земляў, забруджаных радыенуклідамі.

Беларусы звяртаюцца да ўкраінскага прэзідэнта з просьбай закрануць чарнобыльскае пытанне падчас перамоў з прэзідэнтам Беларусі, паведамляе сайт pbnf.org.

Аляксандр Казулін — рыцар года

Гэтая падзея стала ўжо добрай традыцыяй. Напярэдадні 23 лютага незарэгістраваны рух "Абаронцы Айчыны" імя Юрыя Захаранкі ўручае мужным людзям, адданым ідэалам дэмакратыі, прэмію "З адкрытым забралам".

Падобная прэмія сёлета ўручалася ў трэці раз.

На гэты раз намінантам стаў экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, які пазбаўлены волі на пяць з паловай гадоў.

"Сумневу ў тым, што менавіта Аляксандр Казулін варты гэтай узнагароды, не было, — кажа адзін з ініцыятараў незарэгістраванага руху "Абаронцы айчыны" **Алег Волчак.** — *Савет руху вырашыў, што менавіта экс-кандыдат у прэзідэнты сваімі паводзінамі і ўчынкамі заслужыў ганаровае званне рыцара нашага часу. Пачынаючы з мінулай прэзідэнцкай кампаніі, Аляксандр Уладзіслававіч быў прыкладам сапраўднага чалавека гонару, паказваў сапраўдную мужнасць, моц духу і беззапаветную адданасць свайму народу. У сваіх выступах ён смела агучыў і ўскрыў язвы кіруючага рэжыму, аргументавана даказаў, што будучага ў Беларусі пры гэтым рэжыме няма. Казулін — сапраўдны рыцар нашага часу. Ён і за кратамі працягвае сваю барацьбу, каб Беларусь як мага хутчэй стала сапраўды свабоднай і дэмакратычнай краінай".*

Прэмія "Рыцар года-2006" была ўручана жонцы лаўрэата — **Ірыне Іванаўне Казулінай.** Копію дыплома сваякі Аляксандра Уладзіслававіча збіраюцца ў хуткім часе накіраваць у калонію "Віцьба-3", дзе і ўтрымліваецца экс-кандыдат у прэзідэнты.

Дарэчы, рыцарскія якасці Аляксандр Уладзіслававіч праяўляў яшчэ задоўга да выхаду на палітычную арэну. *"Ён усё жыццё не мог мірыцца з хамствам і несправядлівасцю,* — кажа Ірына Іванаўна і ўзгадвае выпадак, які адбыўся літаральна на трэці дзень пасля іх вяселля: — *Я, Саша і яго бацька пайшлі ў кінатэатр "Кастрычнік". Гляджэлі нейкую меладраму. Перад намі сядзела некалькі маладых людзей. Яны раз-пораз адпускалі непрыстойныя каментары. Аляксандр зрабіў ім некалькі заўваг, на што яны паабяцалі разабрацца з ім пасля сеанса. Кіно скончылася. Хлопцы, што сядзелі перад намі, накіраваліся да выхаду. Казулін за імі. Я за яго і кажу: маўляў, не трэба... А ён мяне толькі папярэдзіў: калі што, якая бойка, ты, Ірына, у баку стань і не ўмешвайся. Карацей, бойка адбылася. З дваімі Саша разабраўся лёгка, але, калі са спіны раптоўна наскочыў трэці, яго бацька сказаў: "Двое на аднаго — яшчэ ладна, але трое..." І пайшоў выручаць сына".*

Дарэчы, калі я гляджу кадры з Палаца чыгуначнікаў, дзе на мужа накідваюцца ззаду, то часцяком успамінаю той выпадак... Тое, што Аляксандр сапраўдны рыцар, я ведала ўсё жыццё".

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ПОЗИЦИЯ

Слово о Конгрессе

Судя по прессе, разные структуры по-разному понимают предназначение и функции предстоящего Конгресса демократических сил. Не сильно маскирует свой интерес к теме и "Красный дом". Его специализация — дискредитация самой идеи форума как высшего представительного, постоянно действующего органа, обладающего высокой степенью легитимности. В общественное мнение, по принципу работы дятла, вбивается восприятие Конгресса исключительно как инструмента борьбы за портфели и ресурсы. Домашнее задание агитпропа и учеников Степана Сухоренко — опустить форум и всех, кто связан с ним, до уровня аллергического восприятия. Это не высшая математика, это арифметика начальной школы. Для решения этой задачи используются не только потенциал силовых структур, но и разногласия в среде оппонентов власти. В "Красном доме", в отличие от части демократов, понимают, что Конгресс в переходный период может принять на себя функции и полномочия органа, принимающего решения по формированию легитимных структур власти в Беларуси. Тем более с учетом того, что в него интегрирован Верховный Совет 13-го созыва, сохраняющий легитимность в соответствии с Конституцией 1994 года. Уже только ради выполнения этой функции Конгресс как институция достоин всяческой поддержки. Для понимания этого не надо иметь ума палату.

И это не единственное достоинство Конгресса. При его разумном использовании это самая эффективная площадка для объединения и консолидации всех сторонников перемен. Форум обладает уникальной способностью сделать претендента единым кандидатом в президенты, проект решения превратить в план действий для идеологически разных политических структур, заявление озвучить так, что оно будет услышано во всех ответственных международных организациях. Конгресс — это политический тяжеловес, способный поднимать тяжести, которые не в состоянии осилить политики и организованные структуры сами по себе.

Но иногда случается очевидное-невероятное. Планы власти и намерения части демократической оппозиции переклись. На Могилевщине даже родился почин сбора подписей против проведения форума. Трудно на глазок определить, чего здесь больше — стечения обстоятельств, нехватки информации или управляемого процесса? А может, все это следствие нашего длительного пребывания в оболочке нынешней системы и тех экспериментов, которые проводятся длительное время в стране. Нельзя не признать, что вирус лукашизма проник в подсознание не только сторонников правителя. Иначе чем объяснить, что, критикуя вертикаль власти как модель управления, часть из нас предлагает строить вертикаль, но только свою, демократическую. Это занятие, наверное, более приятное и прибыльное, нежели создавать эффективную коалицию. Нас возмущает правитель с царскими полномочиями, но к светлому демократическому будущему должен обязательно вести лидер с широчайшими полномочиями. При этом ему напрямую должны подчиняться и коммунисты, и националисты, и все остальные не сертифицированные по идеологическому признаку. Для обоснования этого мы эксплуатируем риторику, освоенную властями.

Переход к концентрации всех полномочий в одном портфеле мы объясняем тем, что находимся в состоянии войны с режимом. Дескать, этого требует острота момента. Но этот же режим точно так же втюхивает обывателю чрезвычайщину — тоже необходимостью борьбы с врагами, которыми окружена страна. Мы изобретаем велосипед, зная, что и в Югославии, и в Грузии, и в Украине акцент был сделан именно на сильные, дееспособные коалиции, которые вместе реализовали одну стратегию, один план, а не на строительство одной партии. И лидеров там предъявляли обществу не за пять лет, а за год-полтора до начала президентской кампании.

Только ленивый не поупражнялся в метании дротиков в Конгресс. В этом преуспели и политики, и политологи. Как маститые, так и начинающие. В обращение даже был запущен оборот "конгрессить" как синоним занятия чем-то бессмысленным и второстепенным. В этой ситуации не остается ничего, как задать несколько простых вопросов.

Скажите, если бы в октябре прошлого года не было Конгресса, сколько бы мы имели претендентов в президенты от демократов? Правильно, дюжину, а то и больше. А позвольте уточнить, с таким количеством возможно ли было провести акцентированную, внятную избирательную кампанию? По всем законам выборов — нет. А в такой ситуации состоялась бы площадь Калиновского? НЕТ! НИКОГДА! Истоки относительного успеха, точнее отсутствие провала, мы находим в Конгрессе и той работе, которая была проведена до и после форума. Все дивиденды, как, например, международное внимание, премии, обучение молодых людей в зарубежных университетах и прочее, — это все следствие, которое вытекает из источника под названием "Конгресс". Непонимание будет до тех пор, пока мы будем рассматривать Конгресс как разовое мероприятие по решению главного кадрового вопроса.

Конгресс можно и нужно было провести сразу после завершения президентской кампании. Без шумовых спецэффектов и излишнего ажиотажа. И сделать это было по силам с минимальными затратами. Власть пока еще выдает разрешения на проведение акций на площади Банголор. Для такого формата мероприятия желателен, но не обязателен комфортный зал и трехразовое горячее питание.

Зачем необходим был быстрый Конгресс? Чтобы поблагодарить делегатов за активное, зачастую жертвенное участие в избирательной кампании. Во-вторых, для отчета тех, кому Конгресс выдал полномочия на четко зафиксированный период времени. Единый кандидат, штаб, Политсовет, Национальный комитет... Да, это вопрос, может быть, и процедурный, но он дисциплинирует и подчеркивает взаимоответственность друг перед другом. В-третьих, чтобы утвердить документы, касающиеся ответа на вопрос, что делать в обозримом будущем. Как доказывает практика, решения, принятые с участием 900 человек, крепче стоят на ногах и лучше выполняются, нежели те, что проголосованы 12-ю. Даже если это руководители политических структур. И тогда во многих регионах люди не сравнивали бы себя с комодом, о котором забыли при переезде в новую квартиру. И тогда не были бы слышны возгласы: когда мы были нужны вам, вы за нами транспорт присылали, чтобы доставить на собрания, где избирались делегаты на Конгресс.

И еще раз о самом главном. Коалиция, состоящая из разных структур, может успешно функционировать только в рамках соглашения, которое определяет правила совместной деятельности и накладывает на его участников ответственность и взаимные обязательства. Предыдущее соглашение закончилось 19 марта 2006 года. Поезд остановился, потому что впереди не было рельсов. Мы вроде бы остались в одном вагоне, но без движения вперед. Некоторые это заметили только тогда, когда постучалось время с наивным вопросом: "А где результаты?"

Актуален ли Конгресс теперь? Безусловно! Нужно прокладывать рельсы, нужно новое соглашение с взаимными обязательствами и взаимной ответственностью. По-другому не получится. Если это не делать, то мы теряем самое значимое достижение последнего времени — объединение разных структур под знаменем одной цели.

Впервые после 1996 года у Объединенных демократических сил появилась реальная возможность стать субъектом белорусской политики, а значит, способность влиять на ситуацию в стране. Уже в ходе избирательной кампании в местные Советы было заметно, как меняется самочувствие и настроение у людей. У многих граждан проснулся интерес к позитивной альтернативе, которую предлагают оппоненты нынешней власти. Конечно, это в значительной степени следствие развернувшейся энергетической войны. Но это очевидный факт. Тот, кто даст ясный и понятный ответ на вопросы, которые волнуют людей, за той силой и пойдут граждане Беларуси. И если мы говорим о малой Конституции, о платформе, содержащей послание по социально-экономической проблематике, то Конгресс должен утвердить этот пакет документов и дать старт большой кампании по продвижению позитивной альтернативы в народ. За этими словами скрывается колоссальный объем черновой работы.

Можно бесконечно говорить, что организация и управление — это далеко не самое сильное место оппонентов власти. Структуры коалиции в ее нынешнем виде не в состоянии выполнять амбициозные задачи. Конечно, "Красный дом" устроило бы нынешнее положение вещей. Его удовлетворяет ситуация, когда принятые решения остаются в большинстве своем в том же помещении, где они принимаются. А посему власть готова и дальше вкладывать немалые ресурсы в сохранение нынешней ситуации. Конгресс — это как раз тот форум, который в состоянии реорганизовать структуры коалиции. Для меня суть реформы в улучшении взаимодействия центра и регионов, в привлечении региональных структур к выработке принимаемых решений. А также создание и вовлечение коалиций неправительственных организаций вместе с их ресурсами и потенциалом в реализацию общих стратегии и плана действий. А это означает необходимость закрепления за регионами и коалициями неправительственных организаций мест в Политсовете ОДС.

Давайте еще раз с позиции логики взглянем на жидкие аргументы, звучащие против Конгресса. Дескать, это борьба за портфель. Но позвольте, большинство субъектов ясно высказались за то, чтобы вынести данный вопрос за скобки повестки дня этого Конгресса. Только Александр Милинкевич и его окружение выступали за избрание лидера с широкими полномочиями. Для них это главный пункт повестки дня. Но когда политические партии согласились с этим требованием, похожим на ультиматум, это не привело к развязыванию узла. Александр Милинкевич заявил, что на такой Конгресс он также не пойдет, так как его состав не является достаточно представительным. Тогда навстречу компромиссу был сделан еще один шаг. Его суть в предложении объединить делегатов предыдущего Конгресса и тех, кто заработал право быть участником очередного форума. С одним ограничением: по кадровым вопросам голосуют только те, кто получил мандат делегата через активную работу с избирателями в период политической кампании "местные выборы". Однако и это оказалось неприемлемым для окружения Александра Милинкевича. Впрочем, как и должность председателя Политсовета с фиксированными полномочиями. Круг замкнулся. Такое ощущение, что наших коллег устроит только Конгресс, который изберет лидером только конкретного человека. Но это уже не компромисс, это ультиматум.

Звучат какие-то примитивно-идиотские толкования принципа ротации в управлении коалицией. Будто бы руководители политических партий безумно жаждут порулить штурвалом Политсовета. Но речь идет не о ротации лидеров, а структур, которые берут на себя выполнение организационной работы и ответственность за результаты. При этом речь идет исключительно о реализации принятой стратегии и плана действий, а не программы ПКБ или Партии БНФ. А вот определить зоны ответственности действительно предлагается. К примеру, никто не оспаривает потенциал и возможности Милинкевича во взаимодействии с международными организациями. Пусть представляет белорусскую демократию в международных контактах. Вдруг проснулось у того же Милинкевича желание организовывать уличные акции — зеленый свет. Продемонстрировал результат — вот ты и лидер.

Конгресс — это территория политического компромисса и взаимных обязательств. Это не общие слова. За плечами совместный опыт и практика. Сегодня посрамленные пессимисты поднимают голову. Им стоит напомнить, как они доказывали невозможность объединения коммунистов и националистов. Как громко предрекали, что какое бы решение ни принял Конгресс, его не будут выполнять проигравшие. И сегодня надо объединяться вокруг того, что объединяет. Эту стратегию разделяет не только большинство членов коалиции, включая четыре наиболее крупные партии, но и региональные коалиции. Альтернативы Конгрессу не существует!

Анатолий ЛЕБЕДЬКО.

Ліст-зварот да Аляксандра Лукашэнкі

Паважаны Аляксандр Рыгоравіч!

Зьвяртаемся да Вас, як да беларускага грамадзяніна які дэ-факта выконвае абавязкі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

Мы вельмі ўсьцешаныя, што Вы нарэшце зразумелі, што курс на стварэньне "саюзнай дзяржавы " цалкам праваліўся.

Мы вельмі ўсьцешаныя, што Вы нарэшце зразумелі, што без шчыльнага і маштабнага супрацоўніцтва з Эўрапэйскім Зьвязам Беларусь ня здолее мадэрнізаваць сваю эканоміку ў тым аб'ёме і ў той якасьці, каб пасьпяхова супрацьстаяць энэргетычнаму шантажу Крэмля.

Але мы вельмі засмучаныя, што Вы пакуль не разумееце, што для супрацоўніцтва з Эўразьвязам Вы павінны выканаць іх мінімальныя ўмовы па дэмакратызацыі Беларусі:

1. Вызваліць палітвязьняў;
2. Даць свабоду незалежнай прэсе;
3. Дапусьціць у падліковыя выбарчыя камісіі прадстаўнікоў усіх кандыдатаў (і ў дэпутаты, і ў прэзідэнты);
4. Правесьці свабодныя выбары бяз фальсыфікацыяў (у любы бок).

Мы зразумелі, што Вам псыхалягічна цяжка вытрымліваць такія рэзкія павароты і прапануем пачаць з малага — афіцыйна дазволіць аб'яднаным дэмакратычным сілам, якія ўжо 20 год змагаюцца за Свабоду і Незалежнасьць Беларусі, дазволіць правядзеньне 25 Сакавіка ўрачыстага шэсьця з плошчы Незалежнасьці да плошчы Перамогі, мітынгу і канцэрту ў парку Горкага.

Дазвол Вамі мірнага шэсьця і мітынгу 25 Сакавіка пад лёзунгамі: "За Свабодную і Незалежную Беларусь!" будзе тым станоўчым сыгналам як для беларускай, так і эўрапэйскай грамадзкасьці, які дасьць магчымасьць распачаць той дыялёг, які прывядзе да шырокамаштабнай эканамічнай дапамогі Беларусі з боку Эўразьвязу і ЗША.

Жыве Свабодная і Незалежная Беларусь!

Аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзеньні Дня Волі — 25 сакавіка:

Вінцук ВЯЧОРКА,
старшыня аргкамітэту — старшыня Партыі БНФ.
Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ,
старшыня Палітрады
Аб'яднаных дэмакратычных сілаў.
Анатоль ЛЯЎКОВІЧ,
намесьнік старшыні БСДП (Грамада).
Ігар ШЫНКАРЫК,
намесьнік старшыні АГП.
Уладзімір КОЛАС,
старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі.
Сяржук БАХУН,
сустаршыня незарэгістраванага "Маладога фронту".
Уладзімір НАВАСЯД,
старшыня аргкамітэту па стварэнні
Партыі прагрэсу і справядлівасьці
Алесь АРЭСТОВІЧ,
намесьнік старшыні аркамітэту па стварэньні БСДП (Народная Грамада).
Дзьмітрый БАНДАРЭНКА,
каардынатар грамадзкай ініцыятывы "Хартыя-97".
Станіслаў ШУШКЕВІЧ,
старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады.

ЧУЛІ?

Сяргей Скрабец будзе ствараць маладзёжны рух

Былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і былы палітвязень Сяргей Скрабец абвясціў, што стварае маладзёжны рух імя Кастуся Каліноўскага.

— **Чаму Вы вырашылі менавіта так назваць свой рух?** — запытаў карэспандэнт "Народнай волі" ў **Сяргея Скрабца**.

"Гэта мая ідэя з назвай, — адказвае той. — *Справа ў тым, што мяне судзілі ў Вярхоўным судзе менавіта ў дзень нараджэння Кастуся Каліноўскага, і я тады ў сваім слове папрасіў вызваліць мяне ў сувязі з юбілеем вядомага чалавека. Калі суддзя запытаў: "Якая сувязь паміж юбілеем Кастуся Каліноўскага і маім судовым працэсам?", я адказаў, што лічу сябе прадаўжальнікам яго ідэй. Вядома ж, што Каліноўскі ў свой час змагаўся за свабоду, за дэмакратыю, супраць тыраніі. Змагаўся за тое, што актуальна і зараз".*

Па словах Сяргея Скрабца, стваральнікі разлічваюць, што новы рух аб'яднае каля 50 тысяч чалавек ва ўзросце ад 20 да 40 — тых людзей, якія не задзейнічаны ў палітычных партыях, але накіраваны на агульнасусветныя дэмакратычныя каштоўнасці. Вядуцца перамовы з іншымі незарэгістраванымі грамадскімі аб'яднаннямі, не выключае спадар Скрабец і таго, што адным з заснавальнікаў іх руху стане незарэгістраваны "Малады фронт".

"У гарвыканкам мы ўжо аднеслі заяўку на правядзенне 16 сакавіка ў Мінску на плошчы Бангалор пікету, прысвечанага абароне правоў чалавека і за вызваленне палітзняволеных, — кажа Сяргей Скрабец. — *Гэта будзе, так бы мовіць, наш дэбют".*

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

Сяржук БАХУН, сустаршыня незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт»: «Каліноўскі змагаўся за Беларусь на нашай беларускай зямлі...»

— Спадар Скрабец абвясціў аб стварэнні новага маладзёжнага руху імя Кастуся Каліноўскага. Памкненні паважанага экс-дэпутата нешта змяніць заслугоўваюць павагі. Але ці мае спадар Скрабец маральнае права называць свой рух імем Кастуся Каліноўскага? Ці адказна ён аднёсся да назвы руху?

Хачу нагадаць, што герой Кастусь Каліноўскі змагаўся і ахвяраваў сваім жыццём за беларускія нацыянальныя каштоўнасці.

"Каго любіш? - Люблю Беларусь! — Дык узаемна!" — гэта быў пароль паўстанцаў Каліноўскага.

Каліноўскі здолеў аб'яднаць людзей пад сцягам нацыянальнага вызвалення.

Ён усё сваё жыццё, ад нараджэння да скону, любіў Беларусь і аддаў сябе без астатку служэнню Бацькаўшчыне.

Апошнія Кастусёвы словы былі: *"Толькі тады беларус зажывеш шчасліва, калі маскаля над табой ужо ня будзе".*

Ён і думкі не дапускаў, што дапамогу можна шукаць у Маскве, і меў рацыю!

Спадар Скрабец кажа, што ягоны рух будзе праводзіць пікеты ў Маскве, Кіеве, Празе, Варшаве. Нагадаю, што Каліноўскі змагаўся за Беларусь на нашай беларускай зямлі. Калі зараз у кагосьці ёсць шмат актывістаў за мяжой, дык няхай яны прыязджаюць у Беларусь. Бо лёс нашай краіны мусіць вырашацца на нашай зямлі, і змагацца трэба тут.

Я не збіраюся вучыць спадара Скрабца жыццю, але ён мусіць ўсвядоміць, што калі і называць рух імем чалавека, дык трэба, каб гэты рух адпавядаў ідэалам названага героя. Варта было б і самому Сяргею Скрабцу дасканала задумацца над назвай руху, каб не толькі змагацца за спыненне манархічнай тыраніі (да стварэння якой ён у свой час прыклаў руку), але і адраджаць нацыянальную ідэю, за якую аддаў сваё жыццё малады Кастусь.

Калі каму не зразумелае маё абурэнне, дык раю перачытаць наноў гісторыю Беларусі...

Марына КОКТЫШ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 САКАВІКА 2007 г.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Марна чакала маці сына...

Дасюль невядома месцазнаходжанне актывіста АГП з Віцебска Дзяніса Дзянісава, затрыманага 16 лютага на чыгуначным вакзале ў Гомелі. У Гомелі кажуць, што Дзянісава трэба шукаць у віцебскім ізалятары, у Віцебску — што ў гомельскім...

Актывіста АГП затрымалі ў рамках крымінальнай справы, узбуджанай Віцебскай абласной пракуратурай пасля таго, як летась у чэрвені ў горадзе з'явіліся графіці і лістоўкі ад імя незарэгістраванай арганізацыі "Бунт". Крымінальная справа была распачата супраць Дзяніса Дзянісава і яшчэ адной віцябчанкі Таццяны Елавой за арганізацыю масавых беспарадкаў у грамадскім месцы: двое маладых людзей раздавалі ў людным месцы лістоўкі са словамі "Далучайся да негвалтоўнага супраціву! Дзейнічай у імя свабоды сваёй краіны!".

Ужо ў гомельскім ізалятары Дзянісу Дзянісаву прад'явілі пастанову, на падставе якой адбыўся арышт. У дакуменце фігурыруе артыкул 342 частка 1 Крымінальнага кодэкса "Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак".

Увогуле, крымінальная справа супраць Дзяніса Дзянісава цягнецца паўгода. За гэты час на допытах пабывалі больш за 80 чалавек, неаднаразова праводзіліся вобыскі на кватэрах тых, каго праваахоўнікі падазраюць у дачыненні да дзейнасці "Бунту". Абвінавачанне прадугледжвае да 3 гадоў пазбаўлення волі.

Напачатку Д.Дзянісава накіравалі ў лінейны аддзел міліцыі ў Гомелі, пазней перавялі ў СІЗА. Але на момант здачы гэтага нумара ў друк афіцыйнае абвінавачанне так і не было прад'яўлена.

Маці затрыманага — Раіса Дзянісава — атрымала ў гомельскім СІЗА пацвярджэнне, што сына адправілі ў Віцебск, але супрацоўнікі віцебскага ізалятара не пацвярджаюць, што хлопец прыбыў да іх. Маці з перадачай сустракала на чыгуначным вакзале ўсе начныя цягнікі з Гомеля. Але сына так і не дачакалася.

Раіса Дзянісава абураецца паводзінамі супрацоўнікаў сілавых структур, якія адмаўляюцца даваць нават мінімум інфармацыі пра месцазнаходжанне яе сына. *"Ніхто нічога не кажа! Увогуле ніхто не хоча са мной размаўляць! Я напісала скаргі і ў Гомельскую пракуратуру, і ў Віцебскую пракуратуру. Чаму яго затрымалі? Хіба ён злачынца, хіба ён забіў каго? Але мне ніхто нічога не кажа, увогуле не хочуць ніякай інфармацыі даваць!"* — абураецца жанчына.

Дзяніса Дзянісава мусілі перавесці ў СІЗА №2 Віцебска яшчэ 24 лютага. Аднак дагэтуль ніякай інфармацыі пра месцазнаходжанне хлопца не маюць ні знаёмыя, ні сям'я.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Беларускія расіяне

З кім ні пагавару апошнім часам, даведваюся: ці сын паехаў працаваць у Расію, ці зяць, ці ўнукі. А наогул, колькі беларусаў пражывае ў Расіі?

І.С.Семчанка, г. Вілейка.

Дакладных звестак на гэты конт няма. Самыя апошнія датуюцца 2002 годам, калі праводзіўся Усерасійскі перапіс насельніцтва. Высветлілася, што беларусаў у Расіі не так ужо і мала: па колькасці яны займаюць 9-е месца сярод прадстаўнікоў 160 нацыянальнасцяў, якія жывуць у Расійскай Федэрацыі. У складзе 145 мільёнаў расіян 815 тысяч — этнічныя беларусы.

Дарэчы, па звестках нашага пасольства ў Маскве, у Расійскай Федэрацыі працуе каля 80 грамадскіх арганізацый беларусаў. Найбольш кампактна яны пражываюць у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Карэліі, Краснадарскім краі і ў Калінінградскай вобласці.

Колькасць тых, хто зараз знаходзіцца ў Расіі на часовых заробках, — невядомая.

Лілія ВОРАНАВА.

Рэдактар прагназуе спыненне выхаду часопіса

Рэдакцыя часопіса "Arche" атрымала два папярэджанні Міністэрства інфармацыі.

Як паведаміў галоўны рэдактар часопіса Валер Булгакаў, абодва папярэджанні за подпісам першага намесніка міністра інфармацыі Ліліі Ананіч датаваныя 12 лютага і вынесеныя за тое, што пасля трохмесячнага прыпынення выдання ў 2006 годзе рэдакцыя на працягу аднаго месяца выпусціла ўсе тры затрыманыя нумары часопіса.

На думку В.Булгакава, сапраўднай прычынай папярэджанняў з'яўляецца размяшчэнне ў часопісе публікацый, у якіх крытыкуюцца вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы. *"Так, у першым сёлетнім нумары часопіса мы надрукавалі некалькі такіх матэрыялаў, у тым ліку тэкст вядомага дыпламата Ханса-Георга Віка "Як выйсці з беларускага тупіка?". Дыпламат дае ацэнкі выбарам у Беларусі і структурам улады, а таксама крытыкуе нямецкі палітычны істэблішмент за тое, што ён да гэтай пары не стварыў фонд падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасці"*, — сказаў рэдактар.

В.Булгакаў заявіў, што рэдакцыйны курс не будзе зменены і наступны нумар часопіса адкрыецца вялікай падборкай матэрыялаў, прысвечаных мясцовым выбарам.

Рэдактар нагадаў, што ў сярэдзіне верасня 2006 года часопісу выносілася папярэджанне за змену тэматыкі і размяшчэнне ў "Arche" публікацый грамадска-палітычнага характару, пасля чаго Мінінфармацыі на тры месяцы прыпыніла выданне часопіса.

Паводле слоў В.Булгакава, у снежні 2006 года, пасля трохмесячнай паўзы, выйшлі тры нумары (№№10—12). *"Калі б так не адбылося, "Белпошта" скасавала б падпіску, а чытачы засталіся б без аплачаных нумароў "Arche"*, — патлумачыў В.Булгакаў. Ён заявіў, што калі выданне часопіса будзе спынена другі раз, "Arche" будзе знішчаны. *"Для аднаўлення выдання нам будзе патрэбна віза ідэалагічнага ўпраўлення Мінгарвыканкама, што немагчыма ў цяперашніх варунках"*, — лічыць В.Булгакаў.

Ён прагназуе спыненне выдання часопіса, бо спроба размясціць "Arche" у Інтэрнеце патрабуе кардынальнай ломкі фармату часопіса, а друкаванне яго за мяжой і дастаўка ў Беларусь патрабуюць дадатковых сродкаў. *"Каб паказаць нашу пазіцыю і падкрэсліць варварскі характар закрыцця "Arche", мы хутчэй за ўсё спынім гэты праект"*, — заначыў В.Булгакаў.

Марат ГАРАВЫ.

СІТУАЦЫЯ

«Невыязны» міністр ляціць у ЗША

Але так і не вядома, хто ж выдаў яму візу. Міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў вылятае ў ЗША — па афіцыйнай версіі, для ўдзелу ў міжнароднай канферэнцыі па пытаннях барацьбы з гандлем людзьмі.

Аднак, нагадаем, што гэты чыноўнік з'яўляецца адным з фігурантаў "спісу невыязных" — тых беларускіх службовых асоб, якія так стараліся забяспечыць перамогу Аляксандру Лукашэнку на мінулых прэзідэнцкіх выбарах і зараз не маюць права выезду ў краіны Еўрапейскага Саюза і ЗША. Нагадаем, што ў красавіку 2006 года, адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў, кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў краін Еўрасаюза на пасяджэнні Савета па знешніх справах і агульных пытаннях у Люксембургу адзінагалосна ўвялі забарону на ўезд на тэрыторыю краін ЕС Аляксандру Лукашэнку і 35 высокапастаўленым беларускім чыноўнікам. Прозвішча У.Навумава значыцца пад нумарам 34. Аналагічныя санкцыі ў сваю чаргу ўвялі і Злучаныя Штаты Амерыкі.

Што ж азначае сакавіцкая "камандзіроўка" міністра?.. І што ж гэта за санкцыі, калі іх так лёгка абысці?..

Дарэчы, гэта не першы візіт "невыязнога" беларускага чыноўніка ў краіны Еўрапейскага Саюза і ЗША апошнім часам: у снежні 2006 года ў Злучаных Штатах пабывала намеснік кіраўніка прэзідэнцкай Адміністрацыі Наталля Пяткевіч. Тая ж Пяткевіч, якая займае адзін з верхніх радкоў у спісе невыязных, у складзе ўрадавай дэлегацыі з 13 па 16 лютага 2007 года знаходзілася ў Жэневе з мэтай кансультацый у штаб-кватэры Міжнароднай арганізацыі працы па пытаннях падрыхтоўкі праекта Закона Рэспублікі Беларусь "Аб прафесійных саюзах". Выязджалі ў заходнім накірунку і "невыязныя" Козік ды Зімоўскі...

20 лютага прэм'ер-міністр падпісаў пастанову Савета міністраў №218 "Аб камандзіраванні У.У.Навумава ў г.Нью-Йорк".

"Камандзіраваць з 4 па 7 сакавіка 2007 года ў г.Нью-Йорк (Злучаныя Штаты Амерыкі) Міністра ўнутраных спраў Навумава Уладзіміра Уладзіміравіча для ўдзелу ў канферэнцыі па пытаннях барацьбы з гандлем людзьмі", — такая афіцыйная фармулёўка камандзіроўкі міністра.

"Амбасада не каменціруе візавыя пытанні", — паведаміў "Народнай волі" афіцыйны прадстаўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва. Аднак з неафіцыйных крыніц нам стала вядома, што амбасада ЗША **НЕ ВЫДАВАЛА** візу міністру ўнутраных спраў Уладзіміру Навумаву. Тады хто?

Узнікае і другое пытанне: асобы, унесеныя ў спісы невыязных, не могуць выязджаць у краіны Еўрапейскага Саюза і ЗША ўвогуле, ні пры якіх абставінах, ці ўсё-такі існуюць нейкія выключэнні з правіла?

Прадстаўнік амбасады ЗША ў Мінску заявіў, што ў выпадку, калі "невыязны" чыноўнік мусіць патрапіць у ЗША па лініі ААН (як у нашым выпадку: Навумаў едзе на міжнародную ААНаўскую канферэнцыю па пытаннях барацьбы з гандлем людзьмі. — **Рэд.**), амбасада мусіць выдаваць візу: ЗША ўзялі на сябе такое абавязацельства ў сілу таго, што ААН месціцца на тэрыторыі Злучаных Штатаў. Але... Як нам патлумачылі ў пасольстве: "Ёсць выпадкі, калі афіцыйныя, але непажаданыя ў ЗША асобы едуць у краіну па справах ААН. У такіх выпадках у візе спецыяльна адзначаецца: чалавек едзе па справах ААН, і ягонае месцазнаходжанне абмяжоўваецца перыметрам будынкаў ААН".

Аднак варта падкрэсліць, па стане на 26 лютага Уладзімір Навумаў не атрымліваў візу ў амерыканскай амбасадзе ў Мінску.

МУС не каменціруе магчымую камандзіроўку шэфа ў Нью-Йорк. Адмаўляецца ад каментарыяў і беларускі МЗС.

Георгій КУЗНЯЦОЎ.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Мяжа без памежнага слупа,

альбо Звычайны дзень на прапускным пункце «Рэдзькі», калі з расійскага боку машыны расцягнуліся больш як на чатыры, а з беларускага — больш як на пяць кіламетраў

Вёска Рэдзькі ўвайшла ў гісторыю. Менавіта тут Аляксандр Лукашэнка і Віктар Чарнамырдзін выкопвалі пагранічныя слупы, дэманструючы, што пасля падпісання пагаднення аб мытным саюзе мяжы паміж Беларуссю і Расіяй не існуе. Ельцын, як расказваюць, на гэтае мерапрыемства не паехаў, сказаўшы, што не царская гэта справа — слупы выкопваць...

Не так даўно я ездзіў у Расію, каб напісаць рэпартаж пра тое, як дастаўляецца са Смаленска ў Мінск чарговы тыраж "Народнай волі". На мінулым тыдні ехаў зноў тым жа шляхам, зноў уначы, але з іншым заданнем. Цяпер мая мэта была — аповед пра беларуска-расійскую дзяржаўную мяжу.

Так здарылася, што мая камандзіроўка ледзь не скончылася, толькі распачаўшыся. На шашы быў галалёд. Некалькі разоў машыну заносіла. Дзякуй Богу і кіроўцу — вырульвалі. Уздоўж дарогі ў кювеце бачылі фуры, якім не пашчасціла...

Але пазней не пашчасціла і нам. У раёне Талачына кіроўца ўсё ж не здолеў справіцца з машынай. Нас вынесла ў кювет. Добра, што селі на днішча, — а маглі і перакуліцца.

Пасля амаль гадзіны незапланаванага "адпачынку" ў халоднай кабіне (на вуліцы мінус 23, у кабіне — прыблізна тое ж) на розум самі сабою прыходзяць словы папулярнай песні: *"Там в степи глухой замерзал ямщик..."* Паведамленне кіроўцы, што дастаткова яшчэ двух градусаў у бок мінуса, і ў бензабаку замерзне салярка, ладна кладуцца ў змрочны настрой як рыфма ў паэтычны радок. Праўда, у адрозненне ад няшчаснага ямшчыка у нас ёсць рацыя, па якой мы можам звярнуцца па дапамогу, ды і траса-"алімпійка" (назва замацавалася за шашой Брэст—Масква яшчэ з 1980-х гадоў) — гэта не рускі стэп часоў Емяльяна Пугачова. І яшчэ, дзякуй Богу, ёсць шафёрская салідарнасць. На наш "SOS" адгукнуліся. Выцягнулі з кювета тросам. Далей, каб не выпрабоўваць лёс, ідзем з хуткасцю 60 кіламетраў у час.

На "алімпійцы" ад Брэста да дзяржаўнай мяжы чатыры пункты, дзе бяруць дарожны збор. Фура павінна пакінуць 32 тысячы беларускіх рублёў, бус (такі, як наш) — 4. Але плаціць можна па курсе і ў расійскіх рублях, і ў амерыканскіх долярах, і ў еўра. Тут жа можна і абмяняць валюту.

Плацяць і замежнікі, і беларусы. Прывілей ездзіць бясплатна тут маюць толькі кіроўцы легкавікоў з беларускімі нумарамі. Але праз год-два, калі будуць павялічаны прапускныя магчымасці пунктаў збору грошай, гэты прывілей скасуюць. Пакуль жа гэтага не робяць, каб не ствараць пробак на напружанай магістралі.

Пад'язджаем да мяжы. Даўжэзная чарга фур на мытню. Наш кіроўца тлумачыць, што многія машыны стаяць у чарзе з учарашняга дня. Стаяць ужо не адну гадзіну. Я пытаюся ў яго, калі, на ягоную думку, машына, што зараз апошняя ў чарзе, пройдзе мытню? Адказвае: "Добра, калі к вечару". Зараз — 5 гадзін раніцы.

Едзем уздоўж чаргі. Лічу фуры і іншыя велікагрузныя машыны ў чарзе. На чацвёртым дзесятку збіўся...

Даязджаем да беларускай мытні. Службовец пытаецца: "Як дарога?" Атрымаўшы адказ, спачувае і жадае добрага шляху. Больш пытанняў да нас, едучых на бусе, няма. Далей — шлях на мытню расійскую. Я выходжу з машыны. Кіроўца кажа, што, калі ўсё будзе добра, забярэ мяне на гэтым жа месцы гадзіны праз чатыры. Мароз. Я не супраць, каб мой спадарожнік вярнуўся раней.

Першае, што высвятляю падчас "экскурсіі" па беларуска-расійскай мяжы, гэта тое, што чэргі і з аднаго, і з другога боку скіраваны менавіта да расійскіх мытнікаў. З мытняй беларускай праблем як быццам няма. Прынамсі ў тых кіроўцаў, з якімі я здолеў пагаварыць у гэтым гармідары. Паводле іх слоў, прысутнасць беларускіх мытнікаў тут, лічы, сімвалічная.

У чэргах стаяць фуры і велікагрузныя аўтамабілі. Перш чым трапіць на расійскую мытню, яны павінны прайсці вагавы кантроль. Ад кіроўцаў, што ўжо неаднойчы праходзілі гэту працэдуру, я пачуў, што пры жаданні кантралёр можа лёгка зманіпуляваць "перевес" — звышнарматыўную нагрузку на вось аўтамабіля. А потым празрыста намякнуць кіроўцу, што за хабар ён згодны не звярнуць на "перевес" увагі. Для гэткага выпадку існуе нават пэўная такса.

Пасля ўзважвання машына трапляе на паркоўку транспартнага кантролю. Каб заехаць на гэтую стаянку, трэба заплаціць 50 расійскіх рублёў. Там кантралёр праглядае дакументы кіроўцы і, калі трэба, ставіць свой штамп на так званай *"шайбе"* — дыску, які для аўтамабіля тое ж самае, што для самалёта *"чорная скрыня"*. На *"шайбе"* зафіксаваны адлегласць, хуткасць, час ў дарозе і на стаянцы. Дарэчы, калі на *"шайбе"* зафіксавана відавочнае парушэнне рэжыму руху (скажам, кіроўца не адпачываў у дарозе, хоць інструкцыя гэтага патрабуе), дык на Захадзе заплаціш штраф у 1000 еўра. У Расіі ў такім выпадку ад інспектара ДАІ можна адкупіцца сотняй расійскіх рублёў.

Кантралёр можа спытаць у кіроўцы, ці мае ён дамову на грузаперавозку. Адказ "Не" не прымаецца. "Ідзі шукай!" Гэта азначае, што трэба падысці да кантралёра, зноў і зноў паказаць дакументы, пры гэтым не забыцца пакласці ў іх недзе 200 расійскіх рублёў.

Для легкавікоў і мікрааўтобусаў вагавы кантроль не прадугледжаны, таму на згаданую паркоўку яны едуць адразу, абмінаючы доўгую чаргу фур і велікагрузных аўтамабіляў.

Далей. Скончыўшы справы з "транспартнікамі" і пакінуўшы машыну на іхнім паркінгу, кіроўца ідзе да "дэкларантаў" (да мытнікаў). Гэта метраў 500 адлегласці. Пакуль дойдзеш — змерзнеш. А часта за мытнай дэкларацыяй яшчэ трэба і ў чарзе пастаяць. Тая дэкларацыя каштуе 200 расійскіх рублёў. Заплаціўшы дадаткова пэўную суму непасрэдна службоўцу, можна скараціць час апрацоўкі дакумента і, адпаведна, колькасць сваіх пакут. Па словах людзей у той чарзе, з пачатку года расійцы ўвялі дзяржпошліну за пераезд іхняй дзяржаўнай мяжы. Беларусы да такога яшчэ не дадумаліся. У нас плацяць толькі за карыстанне трасай-"алімпійкай".

На выездзе з паркоўкі прад'яўляеш дэкларацыю кантралёру пры шлагбауме — і ты ў Расіі.

Я ўжо згадваў шматкіламетровыя чэргі да расійскай мытні. Але ў тых чэргах здараюцца прагалы метраў па сто. Прычыны гэткай няшчыльнасці могуць быць розныя. Напрыклад, кіроўца, пакінуўшы машыну ў чарзе, сам пайшоў да мытнікаў. Мытнікі могуць з ім *"паразумецца"*, а могуць сказаць: *"Аформім дакументы, калі дойдзе твая чарга"*. "Паразумецца" каштуе грошай... Тыя, хто спяшаецца, плацяць і выязджаюць з чаргі.

Паколькі машыны стаяць у чарзе не адну гадзіну, перад кіроўцамі мусяць паўстаць бытавыя праблемы. Дзе пад'есці, як паспаць, памыцца, схадзіць у прыбіральню. Зрэшты, не змерзнуць. Ды і бавіць час у чаканні неяк трэба.

Пытанні гэтыя, трэба сказаць, неяк вырашаюцца. Не думаю, што гэта адбываецца паводле нейкага плана. Побытавая інфраструктура памежжа ствараецца хутчэй стыхійна, намаганнямі прыватнага бізнесу і здаровага сэнсу. Непадалёк ад мяжы з беларускага боку блізка ад дарогі я бачыў будынак гасцінічнага тыпу з вялікім дваром, спрэс застаўленым фурамі. Мяркую, там і машына пад наглядам, і кіроўца пры пэўным камфорце. Але спаць, зрэшты, можна і ў кабіне. Для гэтага ёсць прастора за крэслам кіроўцы. Кіроўца фуры ў кабіне не змерзне, бо ў ягонай машыне ёсць сістэма ацяплення, якая звязана з бензабакам і працуе на салярцы. Яна дзейнічае нават пры заглушаным рухавіку. Горш давядзецца кіроўцу і пасажыру буса, кшталту таго, на якім я прыехаў, калі нечакана завязнеш на мытні на няпэўны час. Такі самаход для зімовага экстрыму не прызначаны.

Блізка ад мяжы з беларускага боку дзве заправачныя станцыі, з расійскага — адна. Усе яны аднатыпныя. Пры АЗС — кавярня (з прыбіральняй), невялікая крама харчовых і прамысловых тавараў. У кавярні ёсць тэлевізар. Калі я праз пэўныя прамежкі часу ратаваўся ў тых кавярнях ад марозу, наплыву кліентаў не бачыў. Але падобна на тое, што кропкі ўсё ж прыбытковыя — проста я трапіў не на аншлаг.

Асобная гаворка пра паліва. Па словах субяседнікаў, у якіх у гэты мароз была патрэба выходзіць з цёплай кабіны і жаданне размаўляць з невядомым чалавекам, што прадстаўляецца журналістам, расійскае паліва ў шэрагу выпадкаў таннейшае, але пры наяўнасці выбару запраўляцца лепей усё ж у Беларусі. Бо па наш бок мяжы кіроўца можа быць упэўнены, што яму зальюць у бензабак менавіта тое, за што ён заплаціў, і ў замоўленай колькасці. У Расіі ў гэтым сэнсе магчымы варыянты...

Ці лічаць кіроўцы сітуацыю на мяжы ненармальнай, і калі так, дык як яе палепшыць? Тут разбег меркаванняў быў даволі шырокі. Але збольшага прызнаваўся аб'ектыўны характар існуючых цяжкасцяў. Чарга на гэтым сумежжы Беларусі і Расійскай Федэрацыі будзе заўжды, хоць павялічы тут прапускныя магчымасці і колькасць службоўцаў. Надта ж важная траса. Праўда, згадвалася, што калі на расійскай мытні быў дзень афіцыйнай праверкі, дык аўтамабілі праз мяжу рухаліся ўтрая хутчэй. А справа ў тым, што звычайна з чатырох-пяці службоўцаў мытнага офісу працуюць толькі двое, а астатнія знаходзяцца ў стане перманентнага перекуру, а тут — працавалі ўсе! Так што рэзервы ёсць... Дадам, што прайсці мяжу за чатыры-пяць гадзін на гэтым участку лічыцца ўдачай. Часта і ночы не хапае

Яшчэ, кажуць, вельмі цесная і нязручная паркоўка ў зоне расійскага транспартнага кантролю.

Да таго, што небяспечныя грузы, а таксама тытунёвыя і алкагольныя вырабы па дарозе праз Беларусь суправаджае канвой, прызвычаіліся. Але саміх канваіраў кіроўцы чамусьці не любяць і называюць іх "халяўшчыкамі".

...Блізіцца дзесятая гадзіны раніцы. Наш кіроўца-экспедытар звоніць мне на мабільнік. Кажа: пад'язджаю, хутка буду. Я прашу яго падлічыць па спідометры даўжыню чаргі машын з расійскага і нашага боку. Сустракаемся ў дамоўленым месцы. Едзем дадому. **З расійскага боку машыны расцягнуліся больш як на чатыры кіламетры, з беларускага — больш як на пяць.** Гэта быў не самы напружаны, хутчэй — самы звычайны дзень на прапускным пункце "Рэдзькі" беларуска-расійскай мяжы.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.
Фота аўтара.

ПУЛЬС

У «Дамадзедаве» затрымалі беларускую гандлярку людзьмі

Прозвішча жанчыны не называецца, але вядома, што яна — былы дырэктар беларускага мадэльнага агенцтва і знаходзілася ў міжнародным вышуку.

29-гадовую грамадзянку Беларусі вінавацяць паводле арт.181, ч.2 Крымінальнага кодэкса "Гандаль людзьмі". Прэс-служба маскоўскага УУС на паветраным і водным транспарце паведаміла, што ад беларускіх калег паступілі ўсе неабходныя дакументы і ў хуткім часе затрыманая будзе дэпартавана ў Беларусь.

У Пінску размалявалі Леніна

Невядомыя пакінулі на пастаменце помніка Леніну белыя роспісы на англійскай мове. Падзея адбылася ў выхадны дзень, таму роспіс на пастаменце застаўся некранутым да панядзелка.

Жыхары Пінска глядзелі на размаляванага Леніна з усмешкай: *"Гэта намёк на тое, што ўжо даўно прыйшоў час прыбраць помнік з галоўнай плошчы горада"*.

Па матэрыялах інтэрнет-рэсурсаў.

Наталлі Радзінай не пашанцавала

На рэпетыцыі да чарговай серыі рэаліці-шоу "Зорны цырк" адбыўся няшчасны выпадак. Адна з удзельніц праекта, вядучая АНТ, зламала руку.

Здарэнне адбылося 23 лютага, калі Наталля Радзіна рыхтавала чарговы нумар. Два акрабаты трымалі на плячах дошку, а Наталля, павінна была, падскокнуўшы, зрабіць сальта ў паветры. Але падчас прызямлення нечакана абарваўся страховачны трос. З вышыні ў паўтара метра дзяўчына ўпала на манеж. Адразу пасля атрымання траўмы ў цырк прыехала машына "хуткай дапамогі". Радзіну прывезлі ў 6-ю клінічную бальніцу Мінска. Тут Наталлі быў пастаўлены дыягназ — закрыты пералом прамянёвай косці левай рукі са зрушэннем. На зламаную руку наклалі гіпс, які будзе зняты не раней як праз месяц.

Нагадаем, што за два тыдні да гэтага яшчэ адзін удзельнік праекта і таксама супрацоўнік АНТ Сяргей Савіцкі зламаў нагу, упаўшы з вярблюда. Савіцкі быў вымушаны пакінуць праект. Зразумела, што і ў выпадку з Наталляй Радзінай ніякай размовы аб працяге яе ўдзелу ў "Зорным цырку" не ідзе. Сярод удзельнікаў праекта, а іх на сённяшні дзень засталося сем чалавек (ві-джэй Люся Лушчык, спявачка Алена Грышанава, стрыптызёр Віктар Арцёмаў, гіравік Вячаслаў Харанека, банкір Юрый Каштанаў і настаўнік Павел Кежа) ходзяць чуткі, што Радзінай шукаюць замену. Па адной з версій, гэта можа быць яе напарнік па эфіры Сяргей Дарафееў. Аднак стваральнікі "Зорнага цырка" такога пакуль не дапускаюць, баючыся страціць яшчэ аднаго супрацоўніка тэлекампаніі. Можа быць, ізноў будзе прынята рашэнне аб тым, каб пакінуць у шоу абодвух намінантаў (Паўла Кежу і Віктара Арцёмава), а можа быць, на месца Радзінай усё ж такі прыйдзе новы чалавек.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Прадпрымальнікі пратэстуюць...

12 сакавіка ў Мінску плануецца правесці мітынг індывідуальных прадпрымальнікаў, якія патрабуюць адмены незаконных указаў, дэкрэтаў прэзідэнта, іншых нарматыўных актаў, што перашкаджаюць прадпрымальніцкай дзейнасці.

Заяўку на мітынг падаў кардынацыйны савет прадпрымальнікаў Мінска. Кіраўнік савета Аляксандр Макаеў кажа, што прадпрымальнікі плануюць сабрацца 12 сакавіка апоўдні на сталічнай плошчы Якуба Коласа. Адказу з Мінгарвыканкама на заяўку няма. Аднак Аляксандр Макаеў кажа, што ў выпадку, калі гарадскія ўлады забароняць мітынг, акцыя можа прайсці ў несанкцыянаваным фармаце.

Прадпрымальнікі збіраюцца патрабаваць адмены прэзідэнцкіх указаў, дэкрэтаў, іншых нарматыўных актаў, якія істотна пагаршаюць іх умовы дзейнасці. Гаворка ідзе пра ўказ №20, паводле якога прадпрымальнікі, якія гандлююць парфумай, з 1 сакавіка 2007 года мусяць набываць спецыяльныя ліцэнзіі; пра ўказ №760, які забараняе з 1 студзеня 2008 года наймаць больш за трох рабочых, прычым наёмныя работнікі павінны быць з ліку членаў сям'і і блізкіх сваякоў прадпрымальніка; гэты ж указ з 1 красавіка 2007 года ўводзіць новыя падаткі пры гандлі вырабамі з футры і складаній бытавой тэхнікай, што таксама істотна звужае сферу дзейнасці прадпрымальнікаў.

Паралельна прадпрымальніцкія структуры працягваюць збор подпісаў пад зваротам у Канстытуцыйны суд.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 САКАВІКА 2007 г.

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

Преступный закон,

который позволяет осуществлять репрессии против активистов гражданского общества

Активные действия сотрудников КГБ в отношении “молодофронтовцев” заставляют еще раз вернуться к теме о конституционности статьи 193-1 УК и практике ее применения. По этой статье в уголовном порядке преследуются граждане за организацию деятельности либо участие в деятельности политической партии, иного общественного объединения, религиозной организации или фонда, в отношении которых имеется вступившее в законную силу решение уполномоченного государственного органа об их ликвидации или приостановления их деятельности, либо не прошедших в установленном порядке государственную регистрацию. Санкция статьи предусматривает штраф или арест до 6 месяцев, или лишения свободы на срок до 2 лет. Напомню, что эта статья была принята парламентом в канун выборов президента Республики Беларусь (декабрь 2005 года) и вступила в силу с 1 января 2006 года.

Еще до этого Министерство юстиции приняло постановление № 49 от 13.09.2005 г. “О некоторых вопросах создания общественных объединений и их союзов (ассоциаций)”. Данным актом установлено, что *“при проведении мероприятий политического характера и возможного создания блоков политических партий и профессиональных союзов, а равно создание каких-либо ”движений”, “инициатив”, “коалций”, объединяющих граждан либо юридических лиц, необходимо руководствоваться действующим законодательством и настоящим Постановлением”.* Нормы постановления предписывают необходимость государственной регистрации, указанных в п.1 постановления “блоков”, “движений”, “инициатив”, “коалиций” со ссылкой на ст.7 Закона от 4 июля 1994 г. *“Об общественных объединениях”*, запрещающей деятельность незарегистрированных общественных объединений.

Следует отметить, что по действующему законодательству государственной регистрации подлежат лишь общественные объединения как особая форма объединения граждан, дающая возможность приобретать права юридического лица. Само понятие “юридическое лицо” дано в ст.44 Гражданского кодекса Республики Беларусь. Иные формы реализации гражданами своего конституционного права, не требующие создания отдельного самостоятельного субъекта гражданских правоотношений, фиксации членства, регулирования процедур избрания руководящих органов и принятия решений, приобретения обособленного имущества, могут осуществлять свою деятельность без создания общественного объединения и, соответственно, без специальной регистрации. К примеру, граждане, не преследующие коммерческих целей, могут договориться и действовать на основании договора о совместной деятельности или в форме простого товарищества (ст.911 ГК). Распространение же действия Закона “Об общественных объединениях” на такие формы объединения граждан означало бы фактическое введение запрета на деятельность без образования юридического лица и, соответственно, без предварительной регистрации, например, родительских комитетов в школах и детсадах, совместных действий жильцов по благоустройству придомовой территории и на иные формы самоорганизации граждан, о которых упоминалось выше. Требование государственной регистрации подобных объединений граждан нарушает право граждан на свободу объединений, противоречит закону и здравому смыслу.

Издавая постановление №49, Министерство юстиции, по нашему мнению, и по форме, и по содержанию вышло за пределы своей компетенции, определенной Положением о Министерстве юстиции Республики Беларусь (пост. СМ РБ №1605 от 31.10.2001 г.). Однако Совет министров, куда обратилось Республиканское общественное объединение “Белорусский Хельсинкский комитет” (БХК), уклонился от рассмотрения обращения, предоставил это сделать тому же Минюсту, на действия которого мы и жаловались.

Издание постановления №49 эксперты БХК оценивают как незаконное введение ограничений в пользовании правом на свободу объединений (ассоциаций), гарантированным Конституцией Республики Беларусь и ее международными договорами и, в частности, Международным пактом о гражданских и политических правах. Очевидно, что нормативные предписания постановления предназначены прежде всего для обоснования административных и уголовных преследований граждан.

Анализ содержания (или, как говорят юристы, диспозиции): ст.193 ч.2 и ст.193-1 УК показывают, что привлечение к уголовной ответственности возможно не только за деятельность, причиняющую вред национальной безопасности, правам и свободам граждан, но и за организацию деятельности либо участие в деятельности любого незарегистрированного в установленном порядке общественного объединения независимо от направленности такой деятельности и ее последствий. То есть любая организованная инициатива активных граждан, преследующих благие намерения и действующих для общественной пользы, но без регистрации объединения, может повлечь уголовное преследование и наказание вплоть до лишения свободы до двух лет.

Именно такой подход к применению уголовной ответственности воспринят судебной практикой. Напомню, судом Центрального района Минска в феврале 2006 года к различным срокам лишения свободы были приговорены Т.Дранчук, Н.Острейко, А.Шалайко, Э.Броницкая, признанные виновными в организации деятельности и участии в деятельности незарегистрированного общественного объединения “Партнерство”. Молодые люди ставили целью наблюдение за проходившими выборами в Палату представителей. Рассматривая их дело, суд не согласился с квалификацией действий обвиняемых, данных органами прокуратуры, и переквалифицировал их на статью 193-1 УК. В приговоре отмечено, что *“государственным обвинением не представлено суду доказательств, а в судебном заседании таких доказательств не добыто, которые свидетельствовали бы о том, что вышеуказанная деятельность была сопряжена с посягательством на права, свободы и законные интересы граждан”.* То есть **суд установил, что деятельность данного объединения и его членов не была направлена на нанесение ущерба ценностям, защищаемым Конституцией.** При аналогичных обстоятельствах с обоснованием действий по ст.193-1 УК осужден в июле 2006 года тем же судом один из руководителей “Молодого фронта” Дмитрий Дашкевич.

4 февраля 2007 года Управлением КГБ Республики Беларусь по г.Минску и Минской области возбуждено уголовное дело в отношении Д.А.Федорука и О.М.Корбана по ст.193-1 УК. Как сказано в постановлении о возбуждении уголовного дела, молодые люди привлекаются к уголовной ответственности за *“действия, преследующие следующие цели и методы: объединение и воспитание молодежи на базе белорусской национальной идеи, строительство гражданского общества на основах демократии, свободы рынка и другие цели, а также методы достижения целей, в том числе путем проведения массовых акций, осуществления просветительской работы и социологических исследований, издания газет и других информационных материалов, в период времени с сентября 2006 года по настоящее время”.*

Обращает на себя внимание то, что установленные следователем цели, которые преследовали Федорук и Корбан, соответствуют интересам белорусского государства и не наносят ему вред. Они полностью основаны на правах и свободах, определенных Конституцией Беларуси и международными обязательствами Республики Беларусь в области прав человека. Даже в “расстрельном” 1937 году, в период массовых репрессий, органы НКВД, раскрывая различные “антисоветские организации”, привлекали к ответственности их членов за пусть и придуманную следователями, но враждебную советскому государству деятельность.

Возбуждение уголовного дела с указанной дознавателем КГБ формулировкой может быть справедливо расценено как фактический отход белорусского государства от демократического пути развития, что противоречит Конституции Беларуси и ее международным договорам, в частности, Международному пакту о гражданских и политических правах.

Следует отметить, что организаторы “Молодого фронта” не менее трех раз пытались в установленном законом порядке зарегистрировать в Минюсте свою организацию. Однако по всевозможным бюрократическим придиркам им отказывали, и молодые люди продолжили свою деятельность вне рамок зарегистрированного объединения. По изложенным обстоятельствам БХК обратился к генеральному прокурору П.Миклашевичу и председателю КГБ С.Сухоренко с требованием о прекращении уголовного дела, незаконно возбужденного в отношении Дмитрия Федорука и Олега Корбана. Мы намерены также обратиться в Палату представителей и Конституционный суд. При отрицательном решении БХК (надеюсь, нас поддержат и другие общественные объединения, профсоюзы, религиозные организации) подготовит и направит запрос в Венецианскую комиссию “За демократию через право” для дачи заключения о конституционности ст.193-1 УК.

Следует указать, что в главе 14 КоАП (административные правонарушения, посягающие на правосудие и установленный порядок управления) в ст.167-10 установлена административная ответственность за деятельность от имени политических партий, профессиональных союзов или иных общественных объединений, не прошедших в установленном порядке государственную регистрацию (перерегистрацию), в том числе повышенная за повторность подобного нарушения в течение года после применения мер административного взыскания — до ста базовых величин или арест до 15 суток.

Изучение диспозиций административно-наказуемого проступка по ст.167-10 КоАП и уголовно наказуемого по ст.193-1 УК показывает, что речь в них идет практически об одних и тех же действиях, связанных с организацией или участием в деятельности партий, общественных объединений, ликвидированных (приостановленных) по суду либо не прошедших в установленном порядке государственную регистрацию.

При этом в нарушение требований ст.11 УК (понятие преступления) в диспозицию ст.193-1 УК не включены обстоятельства, указывающие на наступление каких-либо вредных последствий. Между тем ст.193-1 УК расположена в главе 23 “Преступления против конституционных прав человека и гражданина” и предполагает наступление вредных последствий, связанных с нарушением конституционных прав граждан. При сопоставлении исследуемых норм оказывается, что запрещенные под угрозой наказания одни и те же деяния преследуются как в уголовном, так и в административном порядке. Критерии разграничения данных составов по правилам, установленным ч.4 ст.11 УК, никем не определены.

БХК направил в Конституционный суд Беларуси обращение о проверке конституционности введенной нормы (ст.193-1 УК). Однако суд отказал в возбуждении производства и рассмотрении вопроса по существу, сославшись на ст.116 Конституции относительно субъектов, имеющих право инициировать подобные дела. Таким образом, суд проигнорировал нормы Закона о Конституционном суде, Регламенте его деятельности и уклонился от выполнения требований ст.40, 59 Конституции об обязательном рассмотрении по существу обращений граждан в защиту их конституционных прав и свобод.

Между тем Конституция Беларуси (ст.36) закрепила право каждого на свободу объединений.

Анализ конституционных положений (стст.5, 16, 34, 23, 44 и др.) показывает, что обязательным условием признания допустимости ограничений свободы объединений и иных свобод, гарантированных Конституцией, является их необходимость для обеспечения защиты национальной безопасности, общественного порядка, защиты нравственности, прав и свобод других лиц. Указанный перечень является исчерпывающим и расширительному толкованию не подлежит.

Данные конституционные положения достаточно адекватно соотносятся с правилами ст.22 Международного пакта о гражданских и политических правах, ратифицированного нашей страной, а также с другими документами, устанавливающими общепризнанные принципы международного права. При этом необходимо отметить, что практика компетентных международных органов (Европейского суда по правам человека, Комитета по правам человека ООН) ориентирована на допустимость лишь минимальных ограничений, безусловно, необходимых в демократическом обществе.

Новым законом статья 361 УК дополнена частями 2, 3, предусматривающими уголовные меры наказания за призывы, обращенные к иностранному государству, иностранной или международной организации, совершить действия в ущерб внешней безопасности Республики Беларусь, ее территориальной неприкосновенности, национальной безопасности и обороноспособности либо распространение материалов, содержащих такие призывы с использованием средств массовой информации. Статьей 369-1 УК восстановлена ранее действующая в Советском Союзе ответственность за дискредитацию государства и органов власти. В ней, в частности, идет речь о действиях по предоставлению иностранному государству, иностранной или международной организации заведомо ложных сведений о политическом, экономическом, социальном, военном или международном положении Республики Беларусь, правовом положении граждан в Беларуси, дискредитирующих государство. Но кто будет оценивать заведомую ложность этих сведений, если в стране отсутствуют суды, отвечающие принципам компетентности, независимости и беспристрастности (ст.60 Конституции).

Норма о самовольном присвоении званий или власти должностного лица (ст.382 УК) дополнена диспозицией об участии на этом основании *“в переговорах или иных встречах с представителями иностранных государств, иностранных или международных организаций либо в заседаниях международных организаций”.*

Указанные новеллы направлены на запугивание наиболее активных граждан страны, усиление и расширение политических репрессий с использованием мер уголовного наказания.

Страна постепенно скатывается к уже осужденному историй периоду массовых репрессий за инакомыслие. К применению уголовных санкций как инструменту в политической борьбе с оппонентами власти. В этой связи хотелось бы напомнить всем должностным лицам правоохранительных органов и судьям об их личной, персональной ответственности за подобные действия. Надеюсь, многие из них помнят, что после известного Нюрнбергского процесса над военными преступниками в Германии прошли суды над прокурорами, следователями, судьями, обвинявшимися в массовых репрессиях. Все они ссылались на выполнение ими предписаний действующих тогда законов фашистской Германии. Однако трибуналами было признано, что эти законы не соответствовали демократическим принципам правового цивилизованного государства, что они были направлены против человечества и исполнители должны были осознавать это. Именно тогда появилось понятие “преступный закон”. А исполнители признаны виновными и осуждены. Другие лишились профессиональных званий и привилегий — каждому воздалось по заслугам его.

Гарри ПОГОНЯЙЛО,
заместитель председателя РОО “Белорусский Хельсинкский комитет”.

ОТ РЕДАКЦИИ

В статье известного юриста Г.Погоняйло затронуты принципиальные вопросы нормотворческой деятельности и правоприменительной практики по ряду новых статей Уголовного кодекса, введенных с 1 января 2006 года. Редакция газеты “Народная воля” хотела бы получить комментарии (и готова с согласия авторов опубликовать их), в частности, от ученых, законодателей, практических работников: судей Конституционного суда, Верховного суда, работников Прокуратуры Республики Беларусь, Министерства внутренних дел, Комитета госбезопасности и Министерства юстиции.

Надеемся, что широкая общественная дискуссия позволит остановить в стране репрессии.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Склады забітыя, адкуль жа будуць грошы?

Паводле звестак Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі, у лёгкай прамысловасці зафіксаваны самы высокі сярод усіх галін паказчык запасаў гатовай прадукцыі. На 1 лютага яны склалі 277,6 мільярда рублёў, або 128,3% да сярэднямесячнага аб’ёму вытворчасці. За студзень гэты паказчык павялічыўся на 4,2%.

У прыватнасці, запасы шарсцяных тканін перавышаюць сярэднямесячны аб’ём вытворчасці ў 4,5 раза, ільняных — у 4 разы. Запас шаўковых тканін складае 90,8% сярэднямесячнага аб’ёму вытворчасці, трыкатажных вырабаў — 167,3%, панчошна-шкарпэткавых — 252,8%, прадукцыі швейнай прамысловасці — 135,6%, абутку — 204,4%, дываноў і дывановых вырабаў — 110,2%.

Марына НОСАВА.

ЧУЛІ?

Зянон Ломаць звяртаецца...

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць звярнуўся да жыхароў Мінска з заклікам паведаміць пра факты карупцыі, хабару, бюракратызма чыноўнікаў.

Падчас прамой лініі, што пройдзе 1 сакавіка з 11.00 да 14.00 у Мінгарвыканкаме, *“вы можаце, не баючыся, падзяліцца са мной вядомымі вам фактамі”* — гаворыцца ў звароце старшыні КДК. *“Запэўніваю вас, што па кожным такім выпадку будзе праведзена разбіральніцтва”,* — перадае словы Зянона Ломаця прэс-служба КДК.

Ул.інф.

Ім снілася неба Конга

Прадстаўнікі Украінскай авіяцыйнай транспартнай кампаніі дапамаглі тром грамадзянам Беларусі выехаць з Конга, дзе тыя на працягу месяца знаходзіліся без сродкаў да існавання.

Як паведамляе прэс-служба Мінабароны Украіны, у нядзелю беларусы на борце самалёта Іл-76 былі дастаўлены з Конга ва Украіну.

Па інфармацыі прэс-службы, у авіяцыйную транспартную кампанію з просьбай аб дапамозе на мінулым тыдні звярнуліся прадстаўнікі амбасады Расіі і аддзялення арганізацыі Чырвонага Крыжа. Са звароту вядома, што грамадзяне Беларусі прыбылі ў сталіцу Конга — горад Кіншаса — для працы па кантракце пілотамі, паведамляе ўкраінскае інтэрнет-выданне “Форум”.

ІНІЦЫЯТЫВА

Грамадскасць заклікала беларускія ўлады аб’явіць 2007 год Годам памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій, а 29 кастрычніка — штогадовым Днём памяці рэпрэсаваных.

Пра гэта гаворыцца ў звароце “Да грамадзян Рэспублікі Беларусь і беларусаў свету”, які быў зачытаны на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

У звароце сустаршыні грамадскага аргкамітэта па ўвекавечанні памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій геолаг **Радзім Гарэцкі**, гісторык **Ігар Кузняцоў** і пісьменнік **Васіль Якавенка** заклікалі кампетэнтныя органы — КДБ, МУС і пракуратуру — перагледзець справы пакуль яшчэ не рэабілітаваных ахвяр тэрору, у тым ліку былых ваеннапалонных, а таксама жыхароў Беларусі, якія знаходзіліся на часова акупіраванай тэрыторыі ў 1941—1944 гадах, замежных грамадзян, абнародаваць імёны расстраляных у Курапатах і спісы афіцэраў польскай арміі, расстраляных у 1940 годзе.

Тэкст звароту таксама адпраўлены Аляксандру Лукашэнку.

Як зазначыў І.Кузняцоў, Беларусь з’яўляецца адзінай краінай у СНД, дзе з 1997 года прыпынена дзеянне льгот для былых рэпрэсіраваных. “Наша дзяржава павінна выплаціць кампенсацыі гэтым людзям, таму што Рэспубліка Беларусь з’яўляецца праваперaемніцай БССР”, — зазначыў вучоны. Паводле яго слоў, дасягнута дамоўленасць з шэрагам расійскіх выдавецтваў аб выпуску зборніка дакументаў “Канверт смерці” і кнігі гісторыка “Неразгаданыя трагедыі савецкай гісторыі”, прысвечанай тэме сталінскіх рэпрэсій.

Сярод запланаваных мерапрыемстваў Года памяці адказны сакратар грамадскага камітэта Уладзімір Раманоўскі назваў стварэнне інтэрнэт-сайта, выданне штомесячнага бюлетэня, зборнікаў навуковых прац, арганізацыю збору пісьмовых, рэчавых і выяўленчых рэліквій, якія маюць дачыненне да гэтай тэмы, правядзенне экскурсій па месцах рэпрэсій і сустрэч з былымі вязнямі ГУЛАГа, мемарыялізацыю месцаў гібелі ахвяр рэпрэсій. У.Раманоўскі лічыць, што ў Год памяці ў рэалізацыі гэтых мерапрыемстваў паміж грамадствам і дзяржавай павінна быць дасягнута калі не прымірэнне, то хаця б перамір’е, каб грамадства дастойна ўвекавечыла памяць бязвінных ахвяр масавага тэрору.

Марат ГАРАВЫ.

СТАЛА ВЯДОМА...

Гэта ўжо ў другі раз грамадскасць звяртаецца да А.Лукашэнкі з хадайніцтвам зрабіць дзень 29 кастрычніка Днём памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій. Першы раз пісьмо з такой просьбай было накіравана 21 снежня 2006 года. На вялікі жаль, адказ не быў атрыманы.

“...Для нас гэта, шчыра кажучы, нядобры знак, — гаворыцца ў паўторным лісце прадстаўнікоў грамадскасці на імя А.Р.Лукашэнкі. — Тым не менш мы разлічваем на грамадзянскае ўзаемапаразуменне з Вамі і падтрымку Аргкамітэта па ўшанаванні памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій”.

Гісторыя сведчыць...

У 1937-м крывавы патоп сталінскіх рэпрэсій дасягнуў найвышэйшага ўздыму. Няпрошаныя госці ўвальваліся ў гарадскія кватэры і сялянскія хаты. Цэлымі сем’ямі вывозілі людзей у Сібір і на Поўнач, чынілі расстрэлы ў шматлікіх Курапатах. Лепшыя з лепшых абвяшчаліся ворагамі народа і траплялі ў рукі бальшавіцкіх катаў. Кузьму Чорнага, класіка беларускай літаратуры, садзілі на кол. Народнага паэта Янку Купалу давялі да таго, што, пазбягаючы глуму над сабой, спрабаваў скончыць жыццё самагубствам. Пасля дзікунскага здзеку і гвалту дзяржаўны дзеяч і пісьменнік Цішка Гартны (Жылуновіч) загінуў у Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы. Глум над людзьмі і іх вынішчэнне чэкістамі насілі планавы характар. Толькі ў 1920—1950-я катаржныя гады ГУЛАГ праглынуў больш за 600 тысяч ураджэнцаў Беларусі, а з улікам другіх катэгорый афіцыйна рэпрэсаваных гэтая лічба сягае за 1,5 мільёна. Нават цяжка ўявіць: найбольш здольнае да творчай і стваральнай працы насельніцтва вялікага еўрапейскага горада, роўнага сучаснаму Мінску, і яно трапляе ў лапы і пекла ГУЛАГу! Шмат у якіх выпадках рэпрэсіі насілі характар генацыду беларусаў.

...А 29 кастрычніка 1937 года асабліва цяжкі і трагічны дзень у гісторыі беларускага народа. Толькі за адну ноч у Мінску сталінскія апрычнікі расстралялі 100 выдатных прадстаўнікоў творчай і навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі, у тым ліку народных камісараў асветы — **Аляксандра ВАРОНЧАНКУ** і **Аляксандра ЧАРНУШЭВІЧА,** наркама фінансаў **Івана КУДЗЕЛЬКУ,** рэктараў БДУ — **Ананія ДЗЬЯКАВА, Язэпа КАРАНЕЎСКАГА, Аляксея КУЧЫНСКАГА,** дэкана **Яўгена УСПЕНСКАГА,** прафесара **Сцяпана МАРГЕЛАВА,** дырэктараў Белпедтэхнікума — **Міхаіла РАДЗЕЎСКАГА, Ігната АФАНАСЬЕВА** разам з выкладчыкамі, другога сакратара ЦК КПБ(б) **Міколу АРАБЕЯ,** шэраг адказных работнікаў ЦК, СНК, ЦВК, іншых устаноў, 22-х пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў: **Міхася ЧАРОТА, Янку НЁМАНСКАГА, Платона ГАЛАВАЧА, Алеся ДУДАРА, Міхася ЗАРЭЦКАГА, Васіля КАВАЛЯ, Юлія ТОЎБІНА, Валерыя МАРАКОВА, Васіля СТАШЭЎСКАГА, Зяму ПІВАВАРАВА, Ізю ХАРЫКА, Тодара КЛЯШТОРНАГА, Анатоля ВОЛЬНАГА, Юрку ЛЯВОННАГА...** вядомых тады журналістаў **Віктара ВОЙНАВА, Паўла ШАСТАКОВА...** Многія з вязняў былі змардаваны настолькі, што не маглі стаяць на нагах і іх валакам цягнулі на расстрэл. А жонак, дзяцей і бліжэйшых родзічаў расстраляных тады ж кінулі ў канцэнтрацыйныя лагеры.

Вынішчэнне інтэлектуальнай эліты нацыянальнай супольнасці 29 кастрычніка было праведзена і ў абласных гарадах — Віцебску, Гомелі, Магілёве. І гэта — чарговы ўдар па беларускай адукацыі, па духоўнай культуры, па мове, жорсткая праява генацыду народа і нацыі.

***

Матэрыялы і дакументы, якія тычацца сталінска-бальшавіцкіх рэпрэсій, а таксама інфармацыю аб акцыях і мерапрыемствах, прысвечаных Году памяці, просьба перасылаць на адрас рабочай групы Ірыне Коваль: 220064, Мінск-64, п/с 128. Кантактныя тэлефоны: 8-029-613-60-87, 8-029-505-63-85.

E-mail: office@dy-jaryush.org.by

Выхад на сакратарыят: 8-029-634-50-78, 8-029-276-37-06.

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 САКАВІКА 2007 г.

Ён жыў для Беларусі

Да 80-годдзя з дня нараджэння вядомага кнігавыдаўца і перакладчыка, аднаго з пачынальнікаў нацыянальна-адраджэнскага руху ў Беларусі канца 1980-х — пачатку 1990-х гадоў Міхала Дубянецкага

Нарадзіўся Міхал Дубянецкі 4 сакавіка 1927 года ў вёсцы Востраў Пінскага раёна ў шматдзетнай сям'і, у якой заўсёды панавала атмасфера чалавекалюбства і дабрыні, выхоўваліся працавітасць, любоў да роднай зямлі, да пазнання новага, нязведанага. Ён выдатна вучыўся ў сямігадовай польскай школе ў роднай вёсцы, і ў 1938 годзе яго накіравалі на вучобу ў адну з гімназій у Познані. Але ў сувязі з пачаткам Другой сусветнай вайны і далучэннем Заходняй Беларусі да БССР ён вымушаны быў спыніць навучанне і вярнуцца дамоў. У лістападзе 1940 года органамі НКУС быў арыштаваны ягоны бацька Фёдар Ігнатавіч Дубянецкі, які абвінавачваўся ў агітацыі сярод аднавяскоўцаў супраць Савецкай улады і выбараў у Саветы, ва ўдзеле ў нейкім "контррэвалюцыйным Саюзе рэзервістаў"; пры пасляваенным пераглядзе справы бацьку прызналі невінаватым.

Пасля вайны М.Дубянецкі скончыў кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы, атрымаў вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці "журналістыка". Працаваў намеснікам рэдактара ганцавіцкай раённай газеты "Сялянская праўда", загадчыкам рэдакцыі і галоўным рэдактарам выдавецтва "Ураджай", інструктарам сектара друку ЦК КПБ, адказным сакратаром — намеснікам галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. На працягу васьмі гадоў узначальваў выдавецтва "Мастацкая літаратура", з'яўляўся сябрам тагачаснага Саюза пісьменнікаў Беларусі.

На гэтых пасадах найбольш поўна раскрыўся ягоны талент публіцыста, арганізатара кнігавыдавецкай і энцыклапедычнай справы. Добра ведаючы чыноўніцкую кухню партыйных органаў, Галоўліта і Дзяржкамвыдата БССР і "слабыя" месцы ў сістэме цэнзуры, ён прыклаў шмат намаганняў дзеля абароны ад іх лепшых твораў беларускіх пісьменнікаў, "нейтралізацыі" найбольш жорсткіх установак аб скажэнні гістарычнай праўды і аб'ектыўнай рэальнасці. Быў ініцыятарам стварэння і выпуску шматтомных твораў беларускай нацыянальнай літаратуры і фальклору. Пасля доўгага змагання з партыйна-чыноўніцкім свавольствам, катэгарычнай тэлеграмы-"патрабавання" сакратару ЦК КПСС М.В.Зімяніну яму ў 1982 годзе ўдалося дабіцца завяршэння выдання чатырохтомнага збору твораў Васіля Быкава і ўключэння ў яго забароненай вышэйшай партыйнай інстанцыяй аповесці "Мёртвым не баліць".

З 1964 года М.Дубянецкі выступаў як перакладчык з польскай, рускай і ўкраінскай моў. У ягоным перакладзе на беларускую мову выйшлі кнігі С.Жаромскага, В.Распуціна, Г.Цюцюнніка, зборнік украінскіх апавяданняў, "Блакадная кніга" А.Адамовіча і Д.Граніна і іншыя. Зробленыя ім пераклады пазначаны высокім мастацкім густам, выразнасцю слова, глыбокім пранікненнем у сутнасць і жанравыя асаблівасці арыгіналу.

Выхаваны пры таталітарызме, Міхал раней, чым хто, зразумеў ягоную антыдэмакратычную і антычалавечую сутнасць, змог пераасэнсаваць многае і ўзнявацца над самім сабой, стаць у перадавыя шэрагі тых, каму неабыякавы лёс роднай Беларусі, хто сваім асабістым прыкладам і канкрэтнымі дзеяннямі імкнуўся абудзіць грамадства, выхаваць у людзей пачуццё нацыянальнай годнасці і самакаштоўнасці.

У ліпені 1988 года, пасля адкрыцця першых фактаў пра злачынствы ў Курапатах па ініцыятыве гісторыка-мемарыяльнай камісіі, якую ўзначальваў М.Дубянецкі, і іншых камісій Беларускага фонду культуры была створана арганізацыйная група "Камітэт-58" (як напамінак аб адпаведным артыкуле Крымінальнага кодэксу РСФСР, па якім былі несправядліва асуджаны мільёны людзей ва ўсіх рэспубліках СССР). Гэтая група падрыхтавала Устаноўчы сход Таварыства памяці ахвяр сталінізму "Мартыралог Беларусі", які прайшоў 19 кастрычніка 1988 года. Міхал быў абраны ў склад Грамадскай рады гэтай арганізацыі, увайшоў у склад выбранага на гэтым сходзе Аргкамітэта па стварэнні Беларускага народнага фронту "Адраджэнне". На Устаноўчым з'ездзе БНФ, які адбыўся ў Вільні 24—25 чэрвеня 1989 года, ён быў абраны сябрам Сойму БНФ.

За актыўную наступальную пазіцыю па пашырэнні ідэй адраджэння нацыянальных традыцый і духоўных дэмакратычных каштоўнасцяў беларускага народа, удзел у падрыхтоўцы лістоў у ЦК КПСС супраць дзяржаўна-асімілятарскай палітыкі і практыкі дэнацыяналізацыі ў 1988 годзе па партыйнай лініі Міхалу вынеслі вымову "за ідэйнае перараджэнне"; у гэтым жа годзе ён добраахвотна выйшаў з шэрагаў партыі. Пастаянная і нястомная праца па пераадоленні перашкод і супраціўлення з боку цэрбераў-бюракратаў і рознага роду душыцеляў свабоды слова і друку, апантаных прыхільнікаў "лініі Сталіна" не маглі не адбіцца на стане ягонага здароўя. Памёр М.Дубянецкі 3 верасня 1990 года.

Па словах Васіля Быкава, Міхал Дубянецкі стаўся адным з першых ластавак нашага абуджэння, і тое, што ўдалося яму зрабіць, павышае яго чалавечы гонар, таксама як і маральны гонар нашай шматпакутнай нацыі.

М.Дубянецкі быў чалавекам вышэйшай ступені інтэлігентнасці, незвычайнай дабрыні і шчодрасці, якіх ставала на ўсіх, хто знаходзіўся з ім побач. Няўтольную прагу да ведаў, любоў і павагу да людзей, уменне працаваць з душой, на карысць сваёй маці-Айчыны ён перадаў сваім дзецям. Малодшая дачка Ірына скончыла БДУ, атрымала дыплом доктара багаслоўя і філасофіі ў Лёвенскім універсітэце. Дачка Галіна скончыла Мінскі лінгвістычны універсітэт, праявіла сябе як таленавітая паэтэса. Абедзве дачкі з'яўляюцца сябрамі Саюза беларускіх пісьменнікаў. Жонка Марыя Міхайлаўна — вядомы навуковец, кандыдат медыцынскіх навук.

У 1999 годзе ў часопісе "Полымя" апублікавана дакументальна-публіцыстычнае эсэ М.Дубянецкага "Злое вогнішча". Да гісторыі выдання аповесці Васіля Быкава "Мёртвым не баліць". Распачатая ў кастрычніку 2001 года публікацыя ў гэтым жа часопісе мемуараў Дубянецкага "Трэба рызыкаваць..." была спынена ў маі 2002 года с а стварэннем так званага холдынгу "Літаратура і Мастацтва" і звальненнем з працы галоўнага рэдактара часопіса Сяргея Законнікава.

Прапануем увазе чытачоў фрагменты з неапублікаванай (па сутнасці забароненай) часткі мемуараў Міхала Дубянецкага.

На фота: *Міхал Дубянецкі з жонкай Марыяй Мікалаеўнай.*

Міхал ДУБЯНЕЦКІ

«Трэба рызыкаваць...»

Фрагменты з неапублікаванай часткі мемуараў

16 лютага 1988 г. Нарэшце з партыйнага дазволу ў Мінскім Доме літаратара (са спазненнем на год) адзначана 100-годдзе з дня нараджэння вялікага сына Беларусі паэта Алеся Гаруна. На сцэне галоўнай залы — добра выкананы мастаком вялізны партрэт песняра-барацьбіта, песняра-мучаніка. Побач залачоная лічба "100". Злева ад партрэта — выказванне М.Чарота пра Гаруна. У прэзідыуме — сакратар ЦК КПБ таварыш Пячэннікаў (скажам так, хай яму спадабаецца), Максім Танк, Васіль Зуёнак, Іван Чыгрынаў, Ніл Гілевіч, Максім Лужанін, Алег Лойка, Уладзімір Казбярук, Барыс Сачанка, Вячаслаў Рагойша, Браніслаў Спрынчан. Усе яны, акрамя першых чатырох, выступалі з прамовамі. Усе 350 месцаў у зале былі заняты, у праходах таксама было цесна. Гэта пры тым, што цэлы тыдзень усё рабілася, каб сарваць святкаванне, каб зала была пустой. Запрашэнні не рассылаліся нават у выдавецтвы і рэдакцыі. Мабыць, запрашэнні забралі "кампетэнтныя" таварышы. Але ж нічога. Хоць без іх, вядома, не абышлося, але зала была поўная і жыла ідэямі неўміручага Гаруна.

Некалі Алесь Гарун пісаў у вершы "Людзям":

Скажу яшчэ чаго б хацеў:
З дзявочых вуст пачуць
Хаця б адзін мой бедны сьпеў,
Хаця б калі-нібудзь!

Сёння не адзін і не два ягоныя "сьпевы" прагучалі ў цудоўных выступленнях вядомых спевакоў. Адгэтуль яны будуць гучаць, пакуль будзе жыць Беларусь. Шкада толькі, што не чуў і не пачуе іх Творца. Свята гэтае ўпрыгожыла выдавецтва "Мастацкая літаратура", выпусціўшы факсімільнае выданне Гаруновага "Матчынага дару" з 1918 года. І тут не абышлося без перашкод і затрымак, у выніку чаго паспелі зрабіць тысячу экземпляраў усяго за гадзіну да пачатку вечара... Не будзем ужо казаць пра тую затрымку з выпускам "Матчынага дару", што нарадзілася яшчэ ў тым самым ЦК КПБ і КДБ у адказ на маю спробу выдаць яго. Тады абмежавалася ўсё змяшчэннем добрай нізкі з гэтага зборніка ў альманаху "Дзень паэзіі-1981" і маёй патаемнай падрыхтоўкай да самастойнага (на ўласную рызыку) выдання яго ў 1985 годзе.

Гэта ўжо далёкая гісторыя з часоў "застойных", але і цяпер, у перыяд "свабоды" і "дэмакратыі", яшчэ і яшчэ раз пад лупай прачытваўся зборнік Гаруна. Вядома, ён напалохаў тых чытальнікаў. Яны запатрабавалі "расказаць у Быкаўскім уступным слове ўсю праўду пра Гаруна-антысаветчыка". Быкаў прадумваў варыянты. Апошні з іх запатрабавалі ў ЦК. Чыталі там некалькі дзён тыя паўтары старонкі Блескучага Слова Васіля Быкава. Але ж мужны Васіль адмовіўся перарабляць. Ён палічыў, што звышдастаткова і таго, што ён вымушана напісаў: (Гарун вярнуўся ў Мінск) " Да канца разабрацца ў зменлівых і імклівых падзеях ён не здолеў. Адсюль вынікала непаслядоўнасць яго ідэйна-палітычных пазіцый".

Гэта, запамятаем добра, не Быкаўскія словы. Быкаўскія — гэта гімн Гаруну і ганьбаванне тых, хто "несправядліва асудзіў яго на немату". "Алесь Гарун, — кажа аўтар прадмовы, — прабыў у немаце ўдвая больш, чым ён пражыў на свеце". В.Быкаў звяртаецца да чытача з заклікам удумацца "ў гэтыя даўнія радкі, народжаныя самотай і горам — у іх нямала адзнак высокай людскасці і прагнай надзеі. Надзеі на нас, тых, каму наканавана часам жывіць лёс роднага краю, якому на сібірскай катарзе гэтак сардэчна і самазабыўна спяваў Алесь Гарун". Цяперашнія цэрберы вымушаны былі "прапусціць" такое, каб не было скандалу ў эру перабудовы, бо перарабляць ужо не было калі. Вось чаму атрымаліся новая "затрымка" і стрэсавая сітуацыя ў выдавецтве і друкарні.

Удзельнікі ўрачыстасці выказаліся за вяртанне на зямлю Беларусі праху двух вялікіх яе сыноў — Максіма Багдановіча і Алеся Гаруна. Сакратар ЦК у гэты момант разгублена пляскаў у далоні...

***

20 сакавіка 1988 г. Хлопцы і дзяўчаты з "Талакі" склікалі, як яны правільна кажуць, на пляцы Волі веча ў інтэнцыі абароны Верхняга горада. Абараняць яго сапраўды трэба ад бюракратаў і метрабудаўцаў.

На пляц сышлося да тысячы чалавек — у асноўным моладзь. Былі і дарослыя, былі, вядома, і назіральнікі ад афіцыйных і кампетэнтных органаў. Бясконца пстрыкалі фотаапараты, паважна рухаліся перад натоўпам кінакамеры. Добра напоўняцца фота-кінатэкі журналістаў, аматараў і кадэбістаў!

Усё тут было незвычайна, як на савецкую краіну, і ўсё было здорава. Пачынаючы, як кажуць любыя арганізатары, з лёзунгаў і плякатаў. А яны паўсюдна калыхаліся над натоўпам. "Нас ашукалі!"; "Злачынцаў — да адказнасці!"; "Спыніць пракладку метро пад Верхнім горадам!"; "Верхні горад — экзамен перабудовы!"; "Повернуть метро вспять!"; "Ратуйма!"...

Веча было далёка не ананімнае. На відным месцы пасярэдзіне плошчы стаяла вялікая шыльда "Арганізацыйны камітэт". Непадалёку — плакат "Талака" з яе адрасам і рэжымам функцыянавання. Тут упыркнуты ў снег чырванеў таксама і "дзяржаўны фляг БССР" — каб не абвінавацілі бюракраты ў антысавецкім накірунку веча. Праўда, "фляг" жалю варты — папяровы, маленькі, з тых, што прасавецкія бацькі даюць у рукі сваім немаўлятам, калі бяруць іх з сабою на першамайскі мітынг. Але ўсё-такі ён, галоўны савецкі "сымбаль", быў! Не будзе ж незаможная "Талака" траціцца на вялізны ядвабны фляг! Гэтыя рублі яна лепш унясе на рахунак-702 Фонду культуры на рэстаўрацыю аднаго з аб'ектаў Верхняга горада...

А там, на самым лобным месцы, — любімец "нефармальнай" моладзі (і мой таксама), кіраўнік "Талакі", мілы Сяргей Вітушка. Ён увесь палае. Агонь бачыш у яго вялікіх блакітных вачах, на яго, як мне здалося, запалых шчоках. Ледзь улоўна адчуваеш напружанне ва ўсёй яго стройнай постаці. Але вонкава ён нібыта нават спакойны, хоць, слухаючы яго, асэнсоўваючы тое, што ён кажа, немагчыма ў гэта паверыць. Прама хлопец можа валодаць сабою! Ён з веданнем справы мілагучна расказаў гісторыю Верхняга горада. Адважна казаў пра метадычнае яго разбурэнне ў савецкі час, заклікаў стварыць масавы рух "Родны горад".

Р.Бузук, М.Дубянецкі іВ.Быкаў на Устаноўчым сходзе "Мартыралогу Беларусі". 19 кастрычніка 1988 года.

"Пляц" аддзячыў самаахвярнаму юнаку гучнымі працяглымі воплескамі. Я б не прамяняў гэтага слаўнага юнака на ўсіх насельнікаў пяцівярховага будынка ЦК ЛКСМБ, уключна з шасцю яго фюрэрчыкамі і мноствам унтэрфюрэрчыкаў. Сяргей — сапраўдны лідэр свядомай беларускай моладзі. Тыя ж — падгалоскі закаранелых бюракратаў, дэспаты аморфнай, нацыянальна бясполай і безаблічнай казарменнай масы.

Сяргей даваў слова кожнаму прамоўцу і сам трымаў ім мікрафон (апошнюю "дзею" камсамольскія бонзы палічылі б сабе занізкай). Каля трох гадзін доўжыўся гэты цудоўны баль савецкай новай дэмакратыі! Выступіла шмат прамоўцаў вельмі розных паводле свайго ўзросту і поглядаў. Да мікрафона актыўна падыходзілі і веруючыя, запалоханыя перспектывай разбурэння дзеючага тут праваслаўнага храма ў былым касцёле бернардынак.

Упрыгожаннем сходу былі, апрача самога Сяргея Вітушкі, мужныя змагары за беларушчыну — шматпакутны мастацтвазнаўца і глыбокі знаўца гісторыі свайго народа Зянон Пазьняк і малады звонкі наш паэт Анатоль Сыс. Абедзве гэтыя постаці заслугоўваюць спецыяльнага слова, бо Зянон Пазьняк — адпавядае крытэрыям сапраўднага народнага вожака, а Анатоль Сыс — адзін з лепшых прадстаўнікоў беларускай "нефармальнай" моладзі, а зараз то і беларускай нефармальнай паэзіі.

***

18 красавіка 1988 г. Вось як шыкоўна разгарнулася ЦК Кампартыі Беларусі да 500-гадовага юбілею найвялікшага сына Беларусі Францішка Скарыны:

"Постановление Бюро ЦК КПБ от 25 мая 1984 года "О 500-летии со дня рождения Франциска Скорины".

Согласиться с предложениями, изложенными в записке отделов науки и учебных заведений, пропаганды и агитации, культуры ЦК КПБ по этому вопросу (прилагаются).

Секретарь ЦК КП Белоруссии Н.Слюньков"

А што ж "изложено в записке отделов"? Перш за ўсё прапануецца прыняць пастанову (мабыць, сапраўдную? Так і паверым!) "в год, предшествующий юбилею". Цікава, ці многа чаго можна паспець за год?! Хіба што абысціся без манументальнага ўвекавечання!

"Але ж ужо цяпер, — шчодра вяшчае тое Бюро, — неабходна даць канкрэтныя даручэнні адпаведным міністэрствам і ведамствам рэспублікі".

Вось гэтыя "даручэнні":

"1. В течение 1985—1987 гг. провести дополнительный поиск материалов и документов о Скорине в архивах и библиотеках СССР, ГДР, Польши , Чехословакии и других стран.

2. Госкомиздату БССР обеспечить переиздание оригинальных работ Ф.Скорины, а также лучших научных и науч-но-популярных трудов о его деятельности и творческом наследии. В 1995—1990 гг. издать альбом, буклет, посвященные Франциску Скорине.

3. Провести в 1988-1990 гг. республиканский конкурс на лучшее воплощение образа Франциска Скорины средствами искусства.

4. Белгоскино выпустить короткометражный фильм об истории белорусского книгопечатания, начатого Франциском Скориной.

5. Министерству местной промышленности БССР к 1990 году изготовить юбилейную медаль и другие памятные сувениры, а Министерству связи — издать в 1987—1990 гг. почтовые открытки, марки, конверты, подготовить юбилейный календарный штемпель.

6. Министерству культуры БССР до 1985 г. рассмотреть вопрос о создании в республике музея книги".

І што ж у выніку гэтага "мудрого руководства и неустанной заботы" мы атрымалі?

Кнігу прадмоў і пасляслоўяў Юбіляра.

Некалькі выданняў пра Яго дзейнасць.

Адзін альбом і адзін буклет (!!!).

Адзін кароткаметражны фільмік-панегірык пра росквіт у БССР выдавецкай справы (!).

Адзін памятны медаль (!!!) і некалькі безназоўных сувеніраў — мабыць, накшталт кніжных закладак.

Адну паштоўку (!!!).

Адну марку (!!!).

Адзін (!!!) канверт.

Вось " непасрэдны" ўклад "партии и правительства" ва ўшанаванне генія Скарыны! А другая такая ж зручная магчымасць будзе толькі праз... 500 гадоў!

Пра конкурс я не забыў. Але ж мастакі будуць "увасабляць вобраз Ф.С. сродкамі мастацтва" незалежна ад якой бы там ні было пастановы. Нават, калі б забаранялі "ўвасабляць"! А забараняць яны ой як спрытна ўмеюць! Нават у гэтай пастанове-"запісцы" яны чорным па белым забаранілі, лічы, самае галоўнае. Яны не пасаромеліся гэты свой дакумент завяршыць вялізным абзацам-табу наступнага сэнсу:

"Отделы ЦК КПБ считали бы целесообразным **воздержаться** от:

— учреждения Государственной премии БССР имени Франциска Скорины в области истории и культуры, поскольку существующая в республике система Госпремий дает полный простор для поощрения достижений в этой области;

— присвоения имени Ф.Скорины улицам, школам, высшим и средним специальным учебным заведениям и др.".

Здаецца, аддзелы раяць Бюро ЦК "устрымацца" і ад узвядзення помнікаў Юбіляру, паколькі ўжо адзін ёсць. Аддзелы "раяць", Бюро прымае гэтую "параду" і ператварае яе ў загад.

Ну што ж, будзем "раіць" і мы! ЦК ж пусціў вялікую справу на самацёк. Ні разу не праявралася выкананне і гэтага жалю годнага мізеру. У нас гатовы грунтоўны праект праграмы ўшанавання свайго вялікага гуманіста.

***

4 чэрвеня 1988 г. Сёння мяне ў бальніцы наведаў Алег Бембель. Ён прынёс апошні "ЛіМ". Яшчэ ніколі не было ў гэтай газеце жахлівейшага матэрыялу. Усё лічылася, што самыя страшныя матэрыялы — гэта пра крывавыя справы фашыстаў на нашай зямлі. Але ж цяпер дайшла чарга і да крывавых спраў бальшавікоў.

На 14-й і 15-й старонках з уступам Васіля Быкава змешчана сведчанне Зянона Пазьняка і Яўгена Шмыгалёва пра бальшавіцкі генацыд на Беларусі. "Курапаты — дарога смерці" — так называецца гэты крык аб помсце.

Побач з загалоўкам здымак, зроблены пры эксгумацыі магіл расстраляных ахвяр (эксгумацыю рабілі аўтары з дапамогай навакольных жыхароў). Стралялі, як правіла, у патыліцу. На некаторых чарапах па дзве кулявыя дзіркі — дабівалі.

Трэба выкрыць усіх гэтых сталінскіх забойцаў!

Мабыць, давядзецца мне сваю гісторыка-мемарыяльную камісію зарыентаваць на шырокамаштабны росшук ахвяр савецкага рэжыму 1920—1950-х гадоў... Аднавіць былую народную назву "Дарога смерці" — той дарогі, па якой энкавэдзісты вазілі беларусаў на смерць. На тых 10—15 гектарах таго сталінскага лагера імгненнай смерці пабудаваць мемарыяльны лагер. Упісаць яго ў памяць усіх народаў свету!

***

6 чэрвеня 1988 г. Дачка Галя прыйшла да мяне даволі позна, каля 9-й гадзіны вечара. Пры тым цікава, што да такога часу затрымалася на працы. Гэта і ім там незвычайна таксама, але ж быў "надзвычайны" занятак. Абмяркоўвалі, лепш сказаць, судзілі маладых вучоных, кандыдатаў навук Язэпа Янушкевіча, Пятра Васючэнку і аспіранта Алеся Бяляцкага за іх удзел у літаратурным аб'яднанні "Тутэйшыя". Разбіралі "маніфест" гэтай арганізацыі. Нечакана для ўсіх вельмі жорсткую пазіцыю заняў дырэктар Інстытута літаратуры заўсёды лагодны Віктар Каваленка. Ён заявіў, што адмаўляецца кіраваць навуковай працай аспіранта Бяляцкага. "А гэта, сказаў, раўназначна выключэнню з аспірантуры. Калі знойдзеце іншага кіраўніка, дык пакуль дазволім застацца. Паглядзім на паводзіны, а там вырашым".

Добра выступіла ў абарону хлопцаў Ірына Багдановіч. Моцна падтрымаў іх Адам Мальдзіс. Між іншым ён сказаў, што калі ў 1960-х гадах пачыналіся замаразкі пасля той памятнай хрушчоўскай адлігі, дык у аналагічнай сітуацыі нехта стукнуў аб стол, выгукнуўшы: "У рэшце рэшт, быў XX з'езд ці яго не было?!" "Мне таксама, — сказаў Адам, — хочацца грукнуць тут і спытаць, ці ёсць у нас перабудова, ці яе няма?!" Нармальна выступіў і Міхась Мушынскі. Прысутныя ад парткома Акадэміі навук увесь час задавалі хлопцам — вядома ж, па-руску — правакацыйныя пытанні.

***

10 чэрвеня 1988 г. Дамовіўся з Міхасём Чарняўскім, каб ён правёў 16 чэрвеня пасяджэнне нашай гісторыка-мемарыяльнай камісіі з пытаннем "Курапаты"! Ён узяўся за гэтую цяжкую справу з энтузіязмам, калі тут, дарэчы, гэтае слова... Трэба ж абмеркаваць праблему сур'ёзна і прыняць не ўмоўную, а катэгарычную рэзалюцыю з асуджэннем сталінска-чэкісцкіх злачынстваў на Беларусі. Я параіў Камісіі прыняць удзел у мітынгу, што арганізоўваюць "Тутэйшыя", можа, нават падрыхтаваць сумесную рэзалюцыю.

***

14 чэрвеня 1988 г. "Вячэрні Мінск" даў паведамленне "У Савеце Міністраў БССР" пра стварэнне ўрадавай камісіі па Курапатах. Раслякоў адгаворваў мяне ад правядзення пасяджэння нашай камісіі ў гэтай справе. А я лічу, што адступаць ад свайго намеру нам не трэба. Мы павінны націскаць на тую ўрадавую камісію і каб варушыліся, і каб не звярнулі не туды.

Аднак яны баяцца якіх бы там ні было рухаў вакол гэтага пытання. Не далей, як сёння, гарвыканкам не дазволіў "Талацэ" склікаць мітынг на месцы трагедыі. Хлопцы наважыліся звяртацца ў Вярхоўны Савет, а калі гэты забароніць — да XIX партыйнай канферэнцыі...

Мы вырашылі дамагацца ўключэння ў тую "ўрадоўку" некалькіх чалавек ад нас, а таксама абодвух аўтараў артыкула "Курапаты — дарога смерці", некага ад Вітушкі, ад пісьменніцкай грамадскасці. Мэтазгодна было б выпрацаваць наказ урадавай камісіі, альбо як мінімум сваім будучым прадстаўнікам у ёй. Сімвалічна пачаць збор сродкаў на мемарыял ужо на гэтым мітынгу. Хай хоць капейкамі! Хай мізэрная будзе сума, але ж ёю і распачаць рахунак у банку! Абвясціць навекі ганебнымі на Беларусі імёны ўсёй той сталінскай хеўры (Малянкоў, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Будзённы і інш., не кажучы ўжо пра асоб берыеўскай прафесіі)...

***

18 ліпеня 1988 г. Скончыў працу над апратэставаннем штрафаў, накладзеных на Сяргея Вітушку і Віктара Івашкевіча за мітынг у Курапатах. Атрымалася цэлых пяць старонак машынапісу. Аднак не спадзяюся, што пракурор горада заявіць пратэст супраць гарвыканкама і двух райвыканкамаў.

Не давяраючы пошце, я панёс сам дакумент у пракуратуру, тым больш што яна побач з маёй хатай, на Інтэрнацыянальнай, 24. Звярнуў увагу, што да гэтай установы прыбудавалі яшчэ шматпавярховы чырвоны гмах з вялізным гербам СССР (!) на фасадзе. Падняўшы над сабой парасон, паглядзеў, ці ёсць гэтая "цацка" на асноўным будынку. Ёсць. І таксама СССР, толькі разоў у чатыры меншая, чым на прыбудове.

У вестыбюлі сядзіць прынцыповая жанчына з павязкаю, а не міліцыянер у форме. Яна, дазнаўшыся, па якой я справе завітаў, накіравала мяне ў кабінет нумар 10. Гэта аказалася прыёмная. Адсюль паслалі мяне ў 8-ы кабінет — у канцылярыю. Адгэтуль накіраваліся ў 13 пакой. Тут таксама было цікава. Чатыры сталы. Тры пракуроры. Перад адным сядзіць эмацыянальная кліентка. Другі, маладзейшы за астатніх, беспаспяхова круціць тэлефон. Трэці — вольны. Ён мяне "прыняў".

Я падаў яму свой дакумент і праз паўхвіліны ўбачыў, што ён не ўмее чытаць! Цуд, дый і толькі! Пракурор не ўмее чытаць!.. Скажы дзе-небудзь па-за Беларуссю пра такое — не паверыць. А ў нас — гэта норма! Ён на першыя ж словы грыфа глядзеў так доўга і так трагічна, што мне аж няёмка было асіставаць яму. Чытаў і злева направа, і справа налева. Углядаўся то ў адно слова, то ў другое, а то паволі, няўмела слізгаў вачыма то па нейкім радку, то па цэлым абзацы, і ўжо не гарызантальна, а вертыкальна — зверху ўніз, альбо наадварот, знізу ўверх.

Мне падумалася, што каб перад ім быў не такі салідны з выгляду дакумент, дык ён, мабыць, і не мучыўся б, а зрабіў нешта іншае. А яму ж хацелася, відаць, разабрацца і пагутарыць са мной "прадметна". Некалькі слоў ён зразумеў і хацеў з іх дапамогаю дайсці да сэнсу. Пачаў мяне пытаць, быццам бы ўдакладняць "прачытанае". Я сказаў, што там гэта добра апісана. Тады ён здаўся:

— Гэта ж па-беларуску?

— Па-беларуску, — кажу я.

— А я слабавата чытаю па-беларуску, — сказаў ён, значна перааценьваючы свой дар паліглоцтва. Ён жа зусім не ўмее чытаць на гэтай мове.

— А гэта наша рабочая мова, — адказваю яму.

— А ў нас рабочая мова руская, так нам усе пішуць, — прызнаўся ён.

Вось у гэтым і ўся, бадай, трагедыя наша. А каб яму ўсе пісалі па-беларуску?! Напэўна, і гэты пракурор ведаў бы беларускую. Напэўна, і на іх будынках былі б гербы БССР, а не СССР...

Публікацыя
С.Ф.ДУБЯНЕЦКАГА
і М.М.ДУБЯНЕЦКАЙ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 САКАВІКА 2007 г.

ПОСЛУШАЕМ ДРУГУЮ СТОРОНУ

Тоомас Хендрик Ильвес президент Эстонии:
«Мы ведем себя как европейцы»

В Эстонии и России продолжаются споры вокруг памятника советскому солдату в Таллине. Мы много слышим об этом из уст российских политиков и комментаторов по российским телеканалам. А какие аргументы другой стороны — Эстонии?

Напомним, что на днях парламент Эстонии принял законопроект "О защите воинских захоронений", который предполагает перенос монумента советскому солдату. Президент Эстонии ***Тоомас Хендрик Ильвес*** *заявил, что не подпишет этот закон, поскольку он, по его словам, не согласуется с конституцией страны. С ним побеседовал главный редактор московского бюро Русской службы Би-Би-Си* ***Константин Эггерт****.*

Тоомас Хендрик Ильвес: — Я считаю, что этот закон преследовал цель получить как можно больше голосов на выборах, но сделано это было в нарушение конституции, что, кстати, было признано людьми, представившими этот законопроект. Речь тут вовсе не идет о том, что мне нравится или не нравится. Однако во всем этом есть ряд важных проблем. Например, тот факт, что Россия со 140-миллионным населением вдруг почувствовала себя оскорбленной этой супердержавой Эстонией с населением, немногим превышающим миллион человек. Москву возмутил тот факт, что эстонцы осмелились вспомнить историю. Проблема в том, что до сих пор нет признания того факта, что советский режим убивал и терроризировал людей в таких странах, как Эстония. Говоря об освобождении от нацистов, Москва забывает, что для эстонцев, латышей, литовцев и поляков это означает сотни тысяч депортированных, десятки тысяч убитых, Катынь. Для нас СССР олицетворяет именно это, а не освобождение от фашизма.

— Значит, Вы полагаете, что пройдет какое-то время, прежде чем Россия и Эстония станут нормальными соседями?

—Я бы сказал, что Эстония вполне нормальное государство. Мы входим в ЕС, и у нас нет никаких проблем с кем-то еще. И пока Россия будет прославлять советскую историю, у нас будут проблемы. Если бы немцы сейчас прославляли свое нацистское прошлое, у них была бы масса проблем с другими странами. Так что когда государство прославляет свое тоталитарное прошлое, то проблемы неизбежны.

— Москва продолжает утверждать, что в Латвии и Эстонии продолжают ущемляться права русского меньшинства. Этот вопрос поднимался в Страсбурге. Как эстонское правительство смотрит на эту проблему?

— Насколько мне известно, в Европе, кроме России, эту проблему никто не поднимает. Возможно, то, что я скажу, обидит некоторых, но в принципе есть параллель между белыми в ЮАР — группой людей, которая в прошлом была в привилегированном положении, а сейчас они, как и остальные. Я понимаю, что кому-то тяжело потерять привилегии. Эстонский закон о гражданстве гораздо либеральнее, чем во многих других европейских странах.

— Сейчас многие говорят, что внутри ЕС есть различия в том, что касается политики в отношении России.

— Это довольно истеричная реакция со стороны некоторых русских. Сожалею, но это просто люди, которые не умеют себя вести. Мы ведем себя как европейцы. Между Восточной и Западной Европой существуют различия в отношении к России в зависимости от личного опыта. Если ваши представления о России основаны на чтении романов Достоевского, то у вас будет одно представление о стране. А если вы пережили массовые депортации, то, возможно, у вас будет другая точка зрения.

Однако ЕС функционирует в таких рамках. Мы обсуждаем все вопросы, и я не вижу причины, по которой к России должны относиться отлично от, скажем, стран Латинской Америки. Очевидно, что испанцы и португальцы хорошо понимают страны Латинской Америки и этот опыт учитывается в ЕС. У нас такая же роль, потому что мы лучше знаем Россию.

ЭТО ИНТЕРЕСНО

Мост над морем

Власти Йемена заявили, что ведутся переговоры о строительстве 14-километрового моста через Красное море, передает агентство "Рейтер". В соответствии с проектом, сооружение должно появиться над Баб-эль-Мандебским проливом и соединить Йемен и Джибути.

Эмиратская газета, на которую ссылается агентство, сообщает, что строительство оценивается в один миллиард долларов и начнется в течение двух месяцев. По словам главы йеменского правительства, если проект будет осуществлен, то новый мост станет главными воротами между Азией и Африкой.

Помимо автодороги для легковых и грузовых машин на мосту будут и железнодорожные пути для перевозки в Африку грузов из России, Индии и Китая.

Предлагают шпионить за любовниками

Правительство Малайзии будет вербовать среди граждан осведомителей, которые бы доносили религиозным властям, следящим за соблюдением исламских норм, на неженатых любовников. "Под колпаком" окажутся неженатые пары, которые целуются или просто держатся за руки, что противоречит установлениям ислама.

Готовятся высадиться на астероид

В кабинетах NASA полным ходом идет подготовка к космической экспедиции на астероид Апофиз, который, по расчетам астрономов, 13 апреля 2036 года может столкнуться с Землей.

С одной стороны, оснований для паники нет. Вероятность столкновения с Апофизом-99942 крайне мала — всего 1 шанс из 45 тысяч. *"Но мы должны его рассмотреть, если астероид может причинить значительный урон. Это наша прямая обязанность. Было бы просто безответственно с нашей стороны не сделать этого",* — говорит доктор Дэн Барри, бывший астронавт NASA, который входит в группу американских ученых, занимающихся вопросами потенциальной угрозы Земле со стороны небесных тел.

Сейчас Американское космическое агентство разрабатывает планы высадки астронавта на астероид, мчащийся в межпланетном пространстве со скоростью более 30 тыс. миль в час. Ученые считают, что эта экспедиция будет значима как для науки, так и для демонстрации возможностей человечества, пишет "The Guardian".

...Жыццё кожнага сваю сілу мае — часам злую, нядобрую сілу...

Апошнія тры ці чатыры начы, ушчэнт пасварыўшыся з жонкай, Ступак начаваў у гаражы. Зрэшты, і дняваў таксама, бо цьвёрда вырашыў не вяртацца на свой пяты паверх сілікатнай хрушчоўкі. Калі так ужо сталася, што ён там нялюбы і ненавісны, што паявіўся лепшы, дык хай жонка падавіцца той кватэрай ды нацешыцца новым жаніхом; для законнага мужыка шляху туды няма. Усё ж ён чалавек з гонарам і прасіцца ня будзе. Тым болей, што ўсё ягонае жыцьцё, падобна, пайшло на скрут, чаго ўжо бедаваць па кватэры?

Ягоная нявыкрутка абрынулася на яго нечакана, напрыканцы зімы, як пачала яўна здыхаць ягоная фірма, што нядаўна яшчэ квітнела пад назвай "паштовая скрынка". Заказы міністэрства абароны скончыліся, рабочым перасталі плаціць, і Ступак, плюнуўшы на новыя парадкі, звольніўся "па ўласным". Думаў, трохі адпачне і прыгледзіць што-небудзь болей для сябе здатнае. Праўда, тады была немалая надзея на жонку Людмілу Пятроўну, якая рабіла бухгалтаркай у банку. Але, мусіць, так ужо заведзена ў жыцьці, што дзе тонка, там і рвецца, парвалася і з Людкай. Нечакана для сябе ён уведаў, што ў той паявіўся стороньні ўхажор і не абы хто, а генеральны дырэктар таго ж банка. Вядома ж, не абышлося бяз лаянкі, жонка сьпярша апраўдвалася, клялася і бажылася, але як ён даў ёй добрага кухталя, са злосьцю прызналася, што так: ёсьць чалавек, мужык, ня тое, што ты — тля. Ня можаш пракарміць сябе, ня толькі жонку з дзіцём. Тады Ступак усё зразумеў і, правільна ацаніўшы становішча, узяў пінжак і з трэскам грукнуў дзьвярыма. Усё ж ён — ня тля, ён чалавек з характарам, да таго ж — афганец. А калі часам лішняе вып'е, дык цяпер хто ня п'е? Хворы, або каму не даюць. Хто ня мае за што.

Адно праўда, апошнім часам ён ня меў за што выпіць.

Гэты яго металічны, некалі зваран з жалезных лістоў гараж прытуліўся на ўскрайку гарадскога падворку ля радка маладых ліпак, поруч з шасьцю іншымі гэткімі ж часовымі збудоўкамі для аўтамабіляў. Гаражы тыя прастаялі тут гадоў мо па дзесяць, але нядаўна аказалася, што незаконна — прыйшла пастанова іх зьнесьці. Куды? — папыталіся іхнія ўласьнікі і, не атрымаўшы здатнага адказу, вырашылі: во вам, выкусіце! Нікуды зносіць ня будзем. Надзіва, ад іх пакуль што адсталі, перасталі наклейваць грозныя абвесткі на іржавых дзьвярах. Гаражнікі было падумалі, што перамаглі, як у пачатку лета ўсіх выклікалі ў падатковую інсьпекцыю, дзе выпісалі падатак і штраф. Штраф быў немалы, ды гаражнікі-пенсіянеры, дачакаўшыся пенсіяў, змусілі ўсё заплаціць. Ступак жа другі раз сказаў: "Выкусіце!" — у яго ўжо даўно не было грошай ня толькі на штраф, а на які куфаль піва, каб захмялець зранку.

Трошкі ўбаку ад гаражоў за ліпкамі мясьцілася дзіцячая пясочніца і альтанка з паламанай падлогаю, увогуле пустыя ўвесь дзень, бо дзеці ў навакольных дамах, здаецца, павырасталі ўжо, а новых не нараджалася. І толькі пад вечар ці на пачатку начы там паяўлялася якая-небудзь хэўра падлеткаў з недалёкага ПТВ ці суседняй школы, гэтыя і выпівалі, і курылі, а можа, і калоліся, часьцяком з дзяўчатамі, што нароўні з хлопцамі рагаталі і мацюкаліся, ніколькі не зважаючы на рэдкіх дарослых ля гаражоў. Неяк, не стрываўшы іхняга гвалту, Ступак паспрабаваў іх уціхамірыць, паабяцаў паклікаць міліцыю. У альтанцы трошкі аціхлі, і з цемрадзі даляцеў малады басок: "Думаеш, жалеза, дык не гарыць?" У Ступака адняло язык: намёк быў дужа выразны, ён ужо ведаў, як гарыць жалеза. Сам пад Кандагарам ледзьве пасьпеў вынесьці ногі з БТРа, які заняўся такім жахлівым полымем, што расплавіўся асфальт на дарозе. Тады ён добра шурануў са злосьці маладую хэўру, хоць і падумаў, што тое суседства можа для яго кепска скончыцца. Не згарэў у Афгане, дык не хапала згарэць на падворку.

Зрэшты, можа, тое была адна балбатня, можа, ніхто б яго і не падпаліў у гаражы, і ўсё абышлося б. Неяк сьцярпелася б і ў гаражы — не такі ён пан, каб кожнай начы спаць на мяккай канапе, пад белымі прасьцінамі. Але калі б былі грошы. Неяк неўпрыкмет і хутка разышліся тыя васемсот баксаў, што выручыў вясной за свой 412-ы "Масквіч" — з гэтага ж гаража. Тады здавалася, васьмісот баксаў хопіць надоўга, усё ж гэта былі немалыя грошы; гэтак жа лічылі і сябры-суседзі, што вечарком прысаджваліся ў ягоным ацусьцелым гаражы да заслай газеткай прамазучанай табурэткі. Суседзі ўвогуле былі неблагія людзі, яны і падбілі яго расстацца з надаедам-"Масквічом", і ўсё падказвалі агораць іншамарку, якіх на той час стала паяўляцца ў двары. Канешне, ён быў не супроць перасесьці на "Опель" ці "Мерседэс" і ўжо прыглядваўся да іх на вуліцы, ды сталася так, што ягоныя баксы скончыліся раней, чым ён выбраў патрэбную мадэль.

Да таго, што засталося, трэба было добра дакласьці, але дакласьці не было адкуль, а да жонкі ён не хацеў патыкацца. Тады ён плюнуў на ўсе іншамаркі разам і на апошнія дзесяць баксаў купіў два паўлітры, нейкую закусь і справіў хаўтуры па сваім наіўным намеры. Урэшце, можна было пражыць і без машыны — меней клопату і вальней было павярнуцца ў гаражы.

Тое, аднак, толькі здавалася — бяз грошай пражыць было немагчыма, у тым ён неўзабаве ўпэўніўся.

Калі-нікалі надвячоркам ці ў сьвяты ля гаражоў зьбіраліся іх уладальнікі, расчынялі дзьверы і пачыналі поркацца ў рухавіках ці перабіралі майно ў багажніках. А то перакурваючы на падворку, пачыналі няспешныя размовы пра прыкрыя няспраўнасьці сваіх "Запарожцаў" ці пра бензін. Пасьля даволі працяглага перыяду бензінавага дэфіцыту, той нарэшце паявіўся на заправачных, але цэны на яго так заскакалі ўгору, што аж замільгацела ўваччу. Праўда, Ступака тое ўжо мала цікавіла, бензін яму быў непатрэбны, той клопат яго не кранаў. Яго кранала іншае: калі скончыцца гэтае бязладдзе, беспрацоўе і безграшоўе, калі ён, здаровы малады мужык, прыдбае працу і стане зарабляць на жыцьцё? Маладжавы дацэнт Мінкевіч, што езьдзіў на ніштаватай "сямёрцы", глыбакадумна даводзіў, што прычына ўсяго — у энергетычным крызісе, што трэба шукаць альтэрнатыўныя крыніцы забесьпячэньня нафтай, але ўсё ўпіраецца ў рэакцыйнае кіраўніцтва, якое арыентуецца адзіна на ўсход. Сазон Іванавіч, сівы ветэран з другога канца гаражоў, на тое імпэтна пярэчыў, што ўсё — у развале вялікай магутнай дзяржавы пад назвай Савецкі Саюз. Ягоны сусед, таксама пенсіянер, якога яны клікалі трошкі зьняважліва Плешка — за ягоную лысіну на патыліцы, звычайна гаварыў мала, але заўжды, нібы забіваў цьвік: за каго галасавалі, таго і напаткалі. Лепшага не заслужылі. Камлюкаваты Плешка ведаў, за каго галасавалі суседзі, аб тым даўно ўжо папрызнаваліся адзін аднаму ў Ступака за табурэткай, ведаў тое і Ступак, бо сам галасаваў за таго ж. Цяпер на каго было наракаць? Сьпярша ён сумняваўся ва ўласным выбары, усё думаў: справы ў дзяржаве як-небудзь паправяцца, але ішоў час, а справы катастрафічна горшалі. Тыя, што кралі, сталі красьці болей, а галоўнае — на законнай падставе. За горадам, бы на дражджах, расьлі дачы-палацы, рабочых звальнялі, бо заводы "паштовыя скрынкі" спыняліся адзін за адным, а ў тых, што яшчэ працавалі, амаль перасталі плаціць — не было грошай. Затое грошай хапала для вялізнае зграі міліцыі, АМАПу, усіх гэтых сьпецслужбаў, якія кішмакішэлі на вуліцах сталіцы. Даведзены з галадухі да адчаю, Ступак пайшоў па дапамогу да кіраўніка таварыства афганцаў, ды той толькі разьвёў рукамі — што я магу? Грошай у мяне няма. Але ж ён па тэлевізары ўсё гаворыць, што воінам-афганцам трэба памагаць. Во хай ён і паможа, калі так гаворыць, адказаў кіраўнік. Ступак прыкруціў да пінжака свой ордэн і пайшоў у рэзідэнцыю-палац, але там яго на парозе спыніла ахова. Як ён ні даказваў ёй, што і ардэнаносец, і паранены, прайсьці ўнутр не далі. Ён аблаяў іх, а заадно і іхняга ўладара і паплёўся дадому. У свой апусьцелы гараж. Усё неяк стрываў бы, каб кожнага дня не хацелася есьці.

На сваім падворку сярод знаёмых і незнаёмых ён, аднак жа, маўчаў. За жыцьцё ён не прывык выказвацца, асабліва наконт улады, ведаў, лепей язык трымаць за зубамі. Так некалі вучыў яго бацька, вучылі ў камсамоле, затым у войску і ў партыі, з якой ён лічы што выбыў у памятную восень дзевяноста першага. Партбілет, праўда, тады не спаліў — сунуў пад бялізну ў жончынай шафе, хай ляжыць. Мабыць, ляжыць і цяпер.

Аднойчы ён добра набраўся з хлопцамі на саракавінах інваліда, таксама афганца, што да пары згарэў ад гарэлкі, і ўначы ледзьве дабрыў да свайго жытла. Уранку прачнуўся, пачуваў сябе надта паскудна, балелі галава і сэрца, зусім не хацелася жыць. Неяк дачакаўшыся, пакуль разьвіднее, устаў, прыладзіў пад столлю пятлю з капронавага буксіру, на сярэдзіну гаража пасунуў табурэтку. Толькі хацеў стаць на яе, як у дзьверы ціха пастукалі, і ён зразумеў: то быў хтосьці з сваіх. Адпіхнуўшы ўбок табурэтку, расчыніў дзьверы — насупроць стаяў сусед, малады хлопец Аляксей, пытаўся струбцыну, заціснуць шарнір. Ступак мусіў падацца ў свае цёмныя закуткі, шукаць струбцыну. Стоячы пасярод гаражу, Аляксей пытаўся: "А што гэта — вяроўка ў вас?" — "Ды так, прывязваў нешта", — схлусіў гаспадар замагільным голасам, бы вяртаючыся з таго сьвету. Пасьля, як хлопец пайшоў, ранейшая рашучасьць яго і зусім зьнікла, засталася толькі ўсеадольная прыкрасьць. З расплюшчанымі вачыма ён праваляўся паўдня на раскладусе, а затым пабрыў да піўнога ларка, дзе доўга чакаў першага знаёмага. Ледзьве дажыў той дзень да вечару.

Сам Ступак быў чалавек маўклівы, але слухаць размовы іншых любіў, асабліва, калі размова ішла пра палітыку, ад якой цяпер залежала ўсё. Ды яшчэ ад такой палітыкі, у якой палягала ня столькі розуму і развагі, колькі цынічнага гвалту. Гвалтавала ўлада, гвалтаваў крыміналітэт, які множыўся, шчырэў, ад якога простаму чалавеку не было прадыху. Днямі ў суседнім падворку з-пад самага вакна ўкралі, праўда, няновы ўжо БМВ, толькі што прыгнаны з Нямеччыны. Не зважаючы на надта ж шыкоўны "алярм", які гаспадар дэманстраваў цэлы вечар, тым даючы зразумець, што ня варта красьці — загудзе-загалосіць. Аж не загаласіў, і ніхто не пачуў, як машыну выгналі з падворку, і яна назаўжды зьнікла. Людзі казалі — міліцыя, хто ж яшчэ так умее? Можа, і міліцыя, думаў Ступак. У пенсіянера з суседняга дому менавіта міліцыя знайшла скрадзены ўзімку "Жыгуль", але нумары аказаліся перабітыя, кузаў перафарбаваны, і машыну гаспадару не аддалі: у міліцыі, ці бачыце, зьявіўся сумнеў. Пасьля таго, як машына паўгоду прастаяла ў міліцэйскім двары, той сумнеў зьнік, але мала што засталося і ад машыны — раскулачылі дашчэнту. Стаяў голы кузаў. Можа, і добра, што Ступак збыў да чортавай матары свой "Масквіч", менш будзе клопату і менш небясьпекі.

З прычыны безграшоўя ён амаль не чытаў газетаў, хіба калі-нікалі выпадкова, але тады кожны раз нерваваўся і расстройваўся, ажно карцела лаяцца. Газеты хлусілі гэтак нахабна, як не хлусілі ніколі раней пры саветах. Апроч таго, у кожным нумары — указы, дакрэты, законы і безліч папраўак да ранейшых законаў і да папярэдніх папраўак, бясконцыя выступы самога, ад якіх хацелася ванітаваць. Усё ўказваў, патрабаваў, гразіўся і падманваў, — як калісьці палітрукі ў войску, як у тым Афгане. Што значыць пачатковец-міліцыянт, які дарваўся да ўлады не накамандаваўшыся ў паліцэйскай службе і зараз імпэтна спаганяў свой камандзірскі сьверб. І, як ні дзіўна, тое шмат каму падабалася, пенсіянеры, былыя вайскоўцы-адстаўнікі, бы зачараваныя, чыталі ўсе ягоныя выступы ў газетах, усе ягоныя дакрэты, і наўрад ці што разумеючы ў іх пустазвонным шматслоўі, адабралі. "Можа, парадак навядзе" — было іх нязьменным аргументам. Хоць які ім патрэбны парадак у бяспраўнай краіне, было невядома. Наўрад ці яны тое разумелі самі.

Колькі разоў Ступак спрабаваў яго слухаць па тэлевізары, але не мог стрываць і пяці хвілінаў, сподам душы адчуваючы фальш яго пыхлівых словаў, і толькі дзівіўся, як таго не адчувалі іншыя. Хоць бы і ягоная жонка. Варта было Ступаку пасярод яго выступленьня ткнуць пальцам у які іншы сенсар, пераключаючы на іншы канал, як яна кідалася да тэлевізару і вяртала ўсё на ранейшае месца. І жонка, і яе малодшая сястра гатовыя былі з замілаваньнем глядзець і слухаць яго хоць да ранку. А на Ступаковы папрокі звычайна адказвалі: як можна грэбаваць такім выступленьнем гэткага інтэлігентнага, віднага сексуальнага мужчыны? Яны проста млелі ад аднаго толькі выгляду яго заўжды старанна паголенага, напамажанага твару з загадкавым, амаль сакалінным позіркам, тугімі пашчэнкамі і сківіцай капылом, што лезла наперад з экрану.

(Працяг на 6-й стар.)

ДИПКУРЬЕР

3 марта в минской церкви Александра Невского будут молиться за белорусов, погибших за освобождение Болгарии

Еще с советских времен нам известны популярные болгарские бренды — коньяк "Плиска", вино "Монастырская изба", водка "Ракия", габровский юмор, курорты Золотые пески и Солнечный Берег да баба Ванга с ее пророчествами... Но не только это связывает наши народы.

3 марта Республика Болгария в 129-й раз отметит свой национальный праздник — День освобождения от османского владычества, которое длилось около 500 лет. По этому случаю мы задали Чрезвычайному и Полномочному послу Болгарии в Беларуси ***Петко ГАНЧЕВУ*** *несколько вопросов.*

— Что послужило толчком к освободительной войне болгар против османов в 1877—1878 гг.?

— Мужественное сопротивление наших соотечественников в Апрельском восстании 1876 г. и заступничество за болгар великих и известных людей мира. К примеру, Д.Гарибальди, У.Гладстона, Ф.Достоевского, Л.Толстого. Виктор Гюго тогда сказал: "Когда закончится мученичество этого маленького героического народа? Пора цивилизации выдать свой величественный запрет. Мы, народы, приказываем своим правительствам выдать такой приказ".

— Участие в войне России стало решающим для победы болгар. Но сегодня многие на Западе подчеркивают вместе с тем и геополитические интересы Российской империи в стремлении к теплым морям и проливам Босфор и Дарданеллы.

— Под эти интересы невозможно было бы собрать для войны солдат многих национальностей. В ополчении участвовали и воины из Беларуси в составе Минского и Могилевского пехотных полков. Только в Минской губернии в 1877 году были мобилизованы и посланы на фронт 11.561 человек, по всем селам и городам собирали деньги на помощь им. Воины 54-го Минского полка, слава которых была известна еще со времени Крымской войны, обеспечили первую победу русской армии в освобождении болгарских городов. Они впервые вошли в город Свищов на Дунае. Затем под командованием белоруса генерала Иосифа Гурко русская армия завоевала большую часть северной Болгарии. У нас в Болгарии бытуют легенды о смелости белорусов — генерала Михаила Скобелева, который воевал в белом мундире и на белом коне, и генерала Николая Столетова.



Чрезвычайный и Полномочный посол Болгарии в Беларуси ***Петко ГАНЧЕВ.***

— Но и потери белорусы несли значительные...

— Да, как свидетельствуют историки, только в одной из атак под Плевной погибло 326 человек из Могилевской губернии, в сражении при Шипке — значительно больше...

В память о погибших за свободу Болгарии героях белорусский народ построил в конце XIX века храм-памятник "Св. Александр Невский" на Военном кладбище в Минске. Каждый год 3 марта работники нашего посольства возлагают здесь цветы и молятся в церкви о погибших.

— Мир сегодня такой хрупкий, что поневоле заставляет прислушиваться к разным пророчествам. А что знаменитая Ванга говорила по этому поводу о наших краях, о России?

— Вспоминаю, что будто бы она говорила, что придет "Восьмой Владимир и долго будет влиять на умы многих людей", а также что у славян хотя и была славная история, все предстоит в будущем.

— 1 января Болгария вступила в Европейский Союз. Чего ожидают ее граждане от этого шага?

— В период 2007—2009 гг. Болгария получит возможность дополнительно освоить из фондов ЕС суммарно 4168 миллионов евро на условиях соблюдения стандартов ЕС и поддержания соответствующего уровня инвестиций. Так что придется потрудиться. Но зато для нас сейчас полностью открыт рынок труда в десять стран ЕС, движение людей в странах ЕС вполне свободно.

— Отразится ли вступление Болгарии в ЕС на торговле с Беларусью?

— За последний год наш товарооборот равен 50 миллионам долларов и продолжает расти. Поскольку ЕС является основным торговым партнером Беларуси, то существенно не будет изменений и в торговле с Болгарией.

— А если говорить о визах, нужно ли белорусам ожидать изменений?

— Думаю, пока не предвидится подорожания виз. Сегодня одноразовая туристическая коллективная виза стоит 20 евро. Что касается безопасности путешествия по Болгарии, то мы работаем с белорусскими турфирмами и заранее решаем здесь все возможные проблемы. О том, что работаем успешно, считаю, говорит и всплеск туристического интереса белорусов к Болгарии в прошлом году...

— Господин посол, мы поздравляем и Вас, и болгарский народ с наступающим праздником!

Галина ШАРАЕВА.

ФОТООКНО

На днях Владимир Путин посетил Сочи, ознакомился с ходом строительства спортивных объектов.
На фото: *заместитель председателя правительства РФ Александр Жуков и президент России Владимир Путин (слева направо) поднимаются в закрытой кабинке нового фуникулера на гору Псехако на горнолыжном курорте Красная Поляна.*

Зять президента Казахстана собирается купить в Европе футбольный клуб

Зять президента Казахстана Нурсултана Назарбаева Рахат Алиев ведет переговоры о приобретении акций бельгийского клуба "Мускрон", выступающего в высшей лиге чемпионата этой страны. Об этом сообщает "Чемпионат.ру" со ссылкой на казахские СМИ.

"Наши интересы не ограничиваются именно бельгийским клубом. Мы ищем стабильный европейский клуб, на базе которого можно было бы построить площадку для отечественного футбола, чтобы казахстанские игроки могли играть в быстрый современный футбол в высшем дивизионе в Западной Европе", — сообщил Алиев, который является главой федерации футбола Казахстана.

По его словам, на данный момент переговоры с бельгийским клубом не дали конкретного результата, поскольку бухгалтерия клуба "осталась непрозрачной", а схемы покупки, которые предлагали хозяева "Мускрона"6 показались казахской стороне "сомнительными". "Но мы продолжаем искать европейский клуб, и продолжаем переговоры", — подчеркнул Алиев, выразив при этом надежду, что уже в этом году казахстанские любители футбола "получат повод болеть за иностранный клуб".

Ранее интернет-издание SPORTS.KZ сообщало, что Алиев готов выплатить за контрольный пакет "Мускрона" 9 миллионов евро.

Клуб "Мускрон" занимает в настоящее время 15-е место в бельгийском чемпионате. Клуб был основан 1 июля 1964 года. В сезоне 1996/1997 команда завоевала единственные в своей истории бронзовые медали национального первенства. Тогда же состоялся и дебют команды в Кубке УЕФА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 САКАВІКА 2007 г.

(Працяг. Пачатак на 5-й стар.)

У такія хвіліны Ступак гатовы быў узьненавідзець увесь жаночы род, ня толькі ўласную жонку. Яго ж ён ужо даўно ненавідзеў, нутром адчуваючы яго фальшывую сутнасьць, таннае акцёрства, разьлічанае на дурняў або нягоднікаў. А як ён езьдзіў па горадзе? Рух на вуліцах заміраў, даішнікі пераключалі сьветлафоры і з палкамі выскоквалі на перакрыжаваньні зганяць тых, што замарудзілі зьнікнуць з дарогі. Усё пруцянела на вуліцы, бы ў чаканьні канца сьвету, як здаля шалёна выскоквалі трычатыры чорныя аўтамабілі ўступам управа ці ўступам улева і сьледам за міліцэйскай "мігалкай" на вялікай хуткасьці імчалі далей. Скрозь на іхняй дарозе кідаліся да тратуараў машыны прыватнікаў, ці, як іх звыкла называлі "аўтааматараў". Аднойчы Ступак замарудзіў у такі момант спыніцца са сваім "Масквічом" бо не было як прыткнуцца да тратуару, дзе стаялі аўтобусы, як даішнік каршуном накінуўся на яго, аблаяў, адабраў дакументы, за якімі пасьля давялося пахадзіць у іхнюю кантору.

Агледзеўшыся і зразумеўшы нарэшце, каго абралі, мужыкі пачалі папракаць адзін аднаго за свой неразумны выбар. З такім жа правам мог папракнуць сябе і Ступак. Ён таксама галасаваў за яго. Але як было не галасаваць ці галасаваць за ягонага суперніка, як некаторыя казалі — нацыяналіста? Той можа, быў і неблагі хлопец, вучоны, але што б ён зрабіў з гэтым задушаным народам які ўмеў толькі піць, лайдачыць і красьці? Які напалову складаўся з камуністаў ды камсамольцаў, а другой паловай абслугоўваў КДБ? А яшчэ той абвясьціў, што ўзаконіць прыватную ўласнасьць ды ўвядзе абавязковай нацыянальную мову, на якую амаль усе забыліся — і ў горадзе, і ў вёсцы. Ступак пачаў ад яе адвыкаць яшчэ ў войску, хоць для яго, вясковага хлопца, авалодаць як сьлед расейскай было нялёгка. Ён доўга ня мог правільна вымавіць шмат якія расейскія словы (тряпка, напрыклад, за што яго так і дражнілі ў роце — "трапка"). Толькі адвучыўся ад вясковага, збольшага загаварыў, як і ўсе ў горадзе, на расейскай, як гэты вучоны-нацыяналіст зьбіраецца ўсіх перавучыць назад, па-вясковаму. Не, на тое Ступак быў нязгодны. Хай ужо вясковыя бацькі дагаворваюць свой век, як умеюць, ён жа застанецца пры гарадской мове. Як начальства. Як усе навакол. Зноў жа мітынговыя пагрозы камуністам, наменклатуршчыкам ды кадэбістам. Якраз перад тым Ступака прынялі ў партыю, зьявіліся нейкія магчымасьці, і ён сьвядома прагаласаваў за міліцыянта, таксама камуніста. Праўда, тады слабенька паспадзяваўшыся, што, можа, таго яшчэ і не выберуць. Ды во выбралі — на сваю галаву.

Недзе на сярэдзіне лета, як яго асабліва дапякла нэндза, удумаў зьезьдзіць на вёску да бацькі. Якраз у той бок ехаў на сваім "Запарожцы" сусед Плешка, узяўся падвезьці. Выехалі раненька, па халадку, на вуліцах яшчэ было вольна ад аўтамабіляў, Плешкаў "Запарожац" нязвыкла стракатаў рухавіком, здавалася, вось-вось пойдзе ў разнос і разваліцца. Але не разваліўся, порстка каціў па шашы. За гарадской рысай на раздарожжы ўперліся ў шлагбаум ДАІ — праверка дакументаў, усё роўна, як калісьці ў Афгане. Але там ішла вайна, а тут... Пахмурыя з бессані хлопцы ў камуфляжы з аўтаматамі на грудзях прыдзірліва агледзелі Плешкавы правы, зазірнулі ў салон і ў багажнік наперадзе. Плешка нечакана для свайго ўзросту і, пэўна, насуперак характару пачаў лісьліва лепятаць штось, бы падлізвацца, нібы быў вінаваты. Ступак жа адчуваў толькі злосьць, калі гэтыя малакасосы прыдзірліва, з-пад ілба азіралі яго, запасьніка-афганца, узнагароджанага баявым ордэнам. Хто яны такія? Ці стрэльнулі яны хоць раз з тых аўтаматаў па жывым чалавеку, раздражнёна думаў ён.

Пасьля, ужо на дарозе, мабыць разьмякшы на КПП, Плешка пачаў скардзіцца, як цяжка жыць. На сваю працоўную пенсію трэба яшчэ ўтрымліваць і дачку з унукамі, якая два гады нідзе не працуе. На старасьці год замест таго, каб забіваць у даміно ці сядзець з вудай над рэчкай, ён змушаны рамантаваць чужыя машыны, адбіваць пальцы на кузаўным рамоньце. Але ўсё нейкі рубель на прыварак для дачкі і ўнукаў. Зрэшты, у гэтым сэньсе Плешка ня быў выключэньнем, цяпер шмат маладых жыло на жабрацкія пенсіі бацькоў. Ступак, едучы ў вёску, таксама меў спадзеў чым-небудзь пажывіцца ад бацькі. Ён расслаблена сядзеў побач з засяроджаным на дарозе Плешкам і, як той змоўк, пачаў гаварыць сам. Карцела пагаварыць, расказаць пра сваё набалелае. Там ля гаражоў, гэтаму Плешку не было калі слухаць, тут жа нідзе ня дзенецца, будзе слухаць, — думаў Ступак.

— Кажу ім там, у ваенкамаце, што я ня сам туды напрасіўся, мяне паслалі выконваць інтэрнацыянальны доўг, а што мне за гэтае выкананьне?

— Лепш бы ты яго не выконваў, — ня надта ласкава зазначыў Плешка.

— Як гэта — не выконваў?

— А так. Болей карысьці было б.

— Каму карысьці? — чагось ня мог зразумець Ступак. — Каб ня мы, душманы захапілі б Афган.

— А чаго ім захопліваць? Ён і так іх.

— А амерыканцы? Яны б жыва селі на нашыя межы.

— І хай бы сядзелі. Нам што да таго?

— Ну, знаеш! — пачаў гарачыцца Ступак. Яму было не зразумела пярэчаньне суседа, з такім ён яшчэ не спатыкаўся.

— Во цяпер гэта Чачня,— спакойна працягваў Плешка. — У Афгане інтэрнацыяналісты, у Чачні — федэралы. А ўсё нашая моладзь гіне. Навошта яе гробіць? — разважаў Плешка, разьехаўшыся з трактарам, які валок за сабой віхлясты прычэп.

— У Чачню нашых не пасылаюць. А то б я, мусіць, зьехаў,— сказаў Ступак. — Ад жызьні такой.

— Ну і дурань! — проста адгукнуўся Плешка. — У Афгане не навучыўся?

Называецца, пагаварылі, — падумаў Ступак. Гэты пенсіянер Плешка меркаваў дужа пасвойску, маладзейшыя ўсё ж былі інакшай думкі — што значыць розныя пакаленьні. Хаця Плешку што — ён атрымлівае пенсію, а што і дзе атрымае Ступак?

Ён добра выпіў тады ў бацькі, які жыў бабылём у крайняй ад лесу хаціне. Ды і ўсяго ў вёсцы засталіся чатыры хаты, у якіх ліпелі адзінокія старыя. Каровы ў бацькі даўно не было, не было нават курыцы. Ды і навошта? У двары за плотам расло некалькі баразён бульбы, хлеб прывозілі ў суседнюю вёску, давалі па дзьве буханкі на тыдзень, старому хапала. І ён ня скардзіўся. Як прыехаў сын, схадзіў да суседа Петрака, прынёс бутэльку самагонкі, затым прыклыпаў і сам сьсівелы сагнуты Пятрок. Старыя, нямоглыя, аднак, няблага выпілі з маладым, не спыняючы сваёй ня дужа разумнай старэчай балбатні, калі кожны цягнуў сваё, ня слухаючы іншага. Бацька захацеў, мусіць, пахваліцца перад суседам і папытаўся ў сына, за што яму далі ордэн, такі ж самы, які і ён атрымаў у партызанку — "Чырвонай зоркі". Ступак без асаблівага ажыўленьня пачаў распавядаць.

— Ды пад Кандагарам было. Ехалі на маршы з батальёнам Краўцова, толькі калона ўцягнулася ў "зялёнку", ну духі і пачалі лупіць. Пярэдні БТР адразу палыхнуў, загарэўся, хлопцы, бы гарох, — у канавы. А я, ведаеце, сьпярша прамарудзіў, не пасьпеў выскачыць, у трэцім ехаў, а як ачомаўся, зразумеў: позна. Духі смаляць, а ў нас устаноўка "град" стаіць пакінутая, пасьля аказалася, першага нумара забіла, а другі зьбег. Ну, я за ўстаноўку, Аньціпенка таксама падскочыў, стаў памагаць, як урэзалі мы па "зялёнцы", дык тыя духі — хто куды. Ураз выкурылі з зарасьнікаў, яны — у кішлак, канешне, а мы і туды перанесьлі агонь, ды з кулямётаў яшчэ, з зенітак — толькі ад дувалаў пыл хмарай да неба. Пасьля тыдзень немагчыма было праз кішлак праскочыць, так сьмярдзела, хоць проціграз надзявай. Трупы людзей ды скаціны...

— Во, дык і мы ж, гэта самае, — у працяг сынавай размовы загаварыў зап'янелы бацька. — У партызанку. Ляжым у Гразкім балоце ў засадзе, ляжым і ляжым, нікога на дарозе няма, толькі камары гудуць. Аж глядзім: едуць нямецка-фашысцкія захопнікі на фурманках. На пярэдняй немец гармонік у руках трымае, грае ці што? Але, мусіць, ня граў, так ехаў. Ну тут мы і ўрэзалі. Я ці ведаеш, з ручным кулямётам быў, дык як лупану! Тыя — у канавы, а ў канаве таксама кулямёт нарыхтавалі ды — па нас! А мы — па іх! А тым часам ззаду яшчэ калона падышла іхняя, ну на падмогу. Нашыя і драпанулі. А я ж ня ведаў, што драпанулі, ды сяку па іх канаве са свайго "дзегцяра", ну і выбіў. І тады нашыя вярнуліся на адным, камандзір Дзенісенка вярнуў. Ну і за тое мне праз паўгода — ордэн "Чырвонай зоркі", як палагаецца.

— Во героі! У аднэй сям'і бацька і сын! — п'янавата дзівіўся Пятрок.

— А што ж, яе матары! Будзе вайна — зноў пойдзем. Проціў нямецка-фашысцкіх, чачэнскіх, мерыканскіх захопнікаў. НАТА гэтае прэ на ўсход...

Бацька зусім ап'янеў, сын паклаў яго на скамячаны без прасьцінаў ложак, сам выйшаў на падворак падыхаць сьвежым вясковым паветрам. Блытаная гэта справа, вайна, думаў ён, карысьці з яе — гулькін нос. За пралітую кроў — дурацкія льготы. Як у гэтых старых — бясплатны праезд у межах раёна. Куды ўжо ім ехаць, апроч як на могілкі.

З вёскі Ступак прывёз дзясятак пазычаных у суседкі яек, кавалак ёлкага леташняга сала і думаў, у каго раздабыць грошай на хлеб? Зноў давядзецца прасіць у Плешкі, хоць таму ён і так вінаваты тысячаў сто. Але, можа, дасьць і яшчэ. Сядзець увесь час у расчыненых дзьвярах гаражу было сьпякотна і нудна, асабліва ў паўдзён, калі над падворкам навісала пякучае сонца. Ступак тады спрабаваў зачыняцца, але рабілася і яшчэ горш, і ён мусіў замыкаць гараж і куды-небудзь сыходзіць.

Неяк у нядзелю, дабрыўшы да прасьпекту ў цэнтры гораду, згледзеў там штось незвычайнае, небывалае ў выходны дзень відовішча.

Найперш здалёк яшчэ ўчуліся шум, гамана, рух мноства людзей, што суцэльнай плыньню рушылі кудысь у напрамку да цэнтральнай плошчы, несучы нейкія лозунгі. Вецер угары матляў бел-чырвона-белыя сьцягі — мноства сьцягоў, аж да канца калоны, якая хавалася за перагінам вуліцы. Пачатак гэтага шэсьця ўжо мінуў завулак, дзе паявіўся Ступак, і хто там усіх вёў, не было відаць. Поруч жа шэсьце з абодвух бакоў атачалі міліцыянты. Адны з іх стаялі ў няроўных шэрагах, іншыя (мабыць, начальства) бегалі-мітусіліся ў сваім міліцэйскім клопаце. Ступак сьпярша зьдзіўлена прыпыніўся, уражаны відовішчам, а затым нечаканая хваля ўзрушэньня падхапіла яго з тратуара і вынесла да людзей. Малады міліцыянт на краі тратуару спрабаваў заступіць дарогу, дзе Ступак плячом рашуча адпіхнуў яго і выйшаў на асфальт — да ўсіх. Поруч на ўсю шырыню вуліцы ішлі і маладыя, і старыя, і сярэдняга веку мужчыны з жанкамі і дзяўчатамі; твары ва ўсіх былі прыемна-сьвяточныя, бяз звыклай паўсядзённай змрочнасьці ці нават нярэдкай па часе жорсткасьці. Уражвала вялікае мноства нацыянальных сьцягоў, якія над людскімі галовамі паласкаў сьвежаваты ранішні вятрыска. Трохі меней было плакатаў з рознымі надпісамі, зробленымі часам прафесійна, а болей — ня дужа ўмелымі рукамі. Ступак, паазіраўшыся, прачытаў тыя, што былі бліжэй: "Беларусь — у Эўропу!", "Не — бальшавікам!", "Міліцэйскае пудзіла — у Менскае мора!" Якраз над яго галавой хістка калыхаўся лозунг-плакат, што нёс малады хлопец у джынсовай камізэльцы з мноствам кішанькоў: "Мы хочам есьці!" То было якраз пад настрой Ступаку — ён таксама быў галаднаваты зранку, хацеў есьці і ня меў у кішэні ніводнага "зайца". І ён пайшоў разам з усімі,— ня надта борзда ступаючы ў бязладным натоўпе, стараючыся не наткнуцца на каго наперадзе, не ступіць на чыесьці запяткі. Грандыёзная суладнасьць людскога натоўпу надавала адчуваньне ладу і ўпэўненасьці, здавалася, гэткаю сілай яны дамогуцца чаго хочаш. А чаго дамагаліся, відно было з мноства плакатаў над галовамі. Хто мог адмовіць у законнасьці тых патрабаваньняў? Хто мог спыніць гэты шматтысячны паток гараджанаў?

Але неўзабаве паток чамусьці замарудзіў хаду, чым далей, тым болей людзі пачалі спыняцца. Некаторыя наперадзе сыходзіліся шчыльней, рух пачаў заміраць, і было невядома: чаму? Пачуліся выкрыкі нязгоды ці, можа, пратэсту, і тады Ступак здагадаўся ў чым справа. Стараючыся не штурхаць іншых, ён памкнуўся наперад, мінаючы найболей шчыльныя групы. У адным месцы прабег па тратуары пад носам у заклапочаных, спатнелых міліцыянтаў, якія таксама напружана ўзіраліся наперад. І тады яму стала відаць перашкода. Шэсьце ўперлася ў шчыльныя, бы спрасаваныя, тры шэрагі АМАПу, што ад сьцяны да сьцяны будынінаў выцягнуліся ўпоперак прасьпекту.

(Працяг у наступным нумары.)

АДКРЫТЫ ЛІСТ

Аляксандр Рыгоравіч, я прашу Вас добраахвотна падаць у адстаўку

Шаноўны Аляксандр Рыгоравіч!

Вы добра ведаеце, як я Вас доўгі час падтрымліваў па радыё, тэлебачанні, на сходах апазіцыі, на палітычным дыялогу ў 2000 годзе.

Мне гаварылі, што я раблю памылку, што буду аб гэтым шкадаваць.

Так і здарылася. Вы не здзейснілі мае надзеі. Я дрэнна ведаў Вас як палітыка і проста чалавека.

Я прыйшоў да цвёрдай высновы, што надалей заставацца Вам прэзідэнтам краіны вельмі небяспечна для ўсіх, і ў першую чаргу для Вас асабіста. Вы не ўмелі раней і не ўмееце зараз наладжваць адносіны, Вам здаецца, што Беларусь — ваша вотчына, што Вы сапраўдны "бацька" беларускага народа. Ваша спрэчка з Расіяй, з яе лідэрам, прэзідэнтам У.У.Пуціным, прывядзе да сумных вынікаў.

Я асабіста ў роспачы ад Вашых паводзін, ад Вашай палітыкі як унутры краіны, так і па-за межамі яе. Я прашу Вас добраахвотна падаць у адстаўку, як гэта колісь зрабіў Барыс Ельцын. Гэтым самым Вы парадуеце жыхароў Беларусі, усю Еўропу і Амерыку і нават ужо Расію.

Ну навошта Вам вось гэтыя турботы? Няўжо за 12 гадоў Вам было мала часу нацешыцца гэтай уладай?

Аляксандр ЛАПІЦКІ, жыхар г.Мінска.

ШЧЫРА

Ганаруся і абураюся

Шаноўная рэдакцыя!

Даражэнькі Іосіф Сярэдзіч!

Вялікі дзякуй за газету і грамадскую пазіцыю. "Народная воля" вельмі патрэбна для нашай Бацькаўшчыны, але ж шкада, што далёка не ўсе гэта разумеюць. І ўсё ж ганаруся вамі, як і В.У.Быкавым, З.С.Пазьняком, Я.Брылём, Р.Барадуліным, Г.Бураўкіным, акадэмікам А.Вайтовічам, А.Мілінкевічам, А.Казуліным, нашай моладдзю, якая змагаецца за светлую будучыню Беларусі, і многімі іншымі мужнымі і сумленнымі людзьмі, якія не скарыліся. Дзякую ад шчырага сэрца А.Лябедзьку, які не захацеў служыць дыктатарскай уладзе. За гэта яму помсцяць.

Сорамна і агідна за У.Навумава, які сцвярджае, што ў Беларусі няма палітычных зняволеных. Гэты чалавек выканае любы загад, як і многія яго падначаленыя. Адвярнуўся ад гэтых людзей Бог, і твораць яны тое, за што ім і іх дзецям будзе сорамна.

Сумую аб Ю.Захаранку і ад шчырага сэрца спачуваю яго маці і ўсім блізкім, як і сем'ям В.Ганчара, А.Красоўскага і Д.Завадскага. А што датычыцца тых жанчын, якія выйшлі пановаму замуж, то вінаваціць іх не трэба. Не дай Бог каму-небудзь перажыць тое, што перажылі яны...

Сцяпан ЛАГОДЗІЧ, жыхар в.Яечкавічы Іванаўскага раёна.

ПОЗИЦИЯ

Дайте жару чиновникам!

Оппозиции нужно "входить в народ" и работать с народом. Но, как пишет академик А.Войтович, они сейчас оторваны от народа.

Я уже несколько месяцев один веду письменную борьбу с Администрацией президента Республики Беларусь, с Министерством торговли. Вопрос, который меня волнует: кто допустил "развал" овощей и фруктохранилищ?

Я уже получил ответ из Минторговли за подписью зам.министра М.Свентицкого, где сказано, что 70 процентов овощехранилищ не пригодны к эксплуатации и намечается их реконструкция, а также частичное новое строительство. Но это не так быстро делается, а овощехранилища нужны уже сейчас, в 2007 году

Как же быть? Вот оппозиция и должна "дать жару" чиновникам, которые призваны решать данный вопрос, а не сидеть "в стороне от народа" и ждать от "А.Г.Л." каких-то "ошибок" и так далее и тому подобное. Должна быть у оппозиции конкретная работа по конкретным направлениям.

А оппозиция настоящая нужна любому государству для его нормального развития.

А.А.ШУЛЬГА, житель пос.Чисть Молодечненского района.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Блуканні па пакутах

Басейн на страсе

У Малой Сваротве няшмат такіх людзей, якія б не карысталіся паслугамі індывідуальнага прадпрымальніка **Івана Афанасіка.** Агарод узараць, бульбу пасадзіць ці выкапаць, дроў прывезці — усё зробіць Іван Сцяпанавіч за невялікую плату.

Але кіраўніцтву мясцовага калгаса "Зарэчанскі" ён не падабаецца. Бо ніколі не ломіць шапку перад начальствам, заступаецца за бедных і пакрыўджаных, змагаецца за справядлівасць. Словам, па іхнім разуменні, лезе на ражон. Па гэтай прычыне некалькі гадоў таму яго, эканаміста з вышэйшай адукацыяй, дарэчы, адзінага эканаміста ў калгасе, скарацілі. А за кампанію і жонка засталася за парогам канторы. Суд аднавіў іх на рабоце, але праз некаторы час зноў скарацілі.

Думалі, прападзе Афанасік. А ён сваімі рукамі сабраў трактар, набыў прычапны інвентар, узяў зямлю і працуе ад рання да змяркання. Трымае дзвюх кароў, свіней, сто галоў бройлерных курэй. Разам з жонкай за мінулы год прадалі дзяржаве дзевяць тон малака.

Іван Афанасік для мясцовага начальства як стрэмка ў воку. Перад прэзідэнцкімі выбарамі збіраў подпісы за **Аляксандра Казуліна.** Угаворвалі кінуць гэтую справу, службовыя людзі нават дадому прыходзілі з угаворамі. Нічога не выйшла. Подпісы ён сабраў.

Сям'я Афанасікаў жыве на другім паверсе чатырохкватэрнага дома з так званым мяккім пакрыццём. Калі ідуць дажджы ці тае снег, на страсе ўтвараецца басейн. Вада цячэ ў кватэру. Раней Іван Сцяпанавіч прасіў, каб дазволілі кватэру прыватызаваць. Былы старшыня сабраў сход, папярэдне падвучыўшы людзей, як трэба галасаваць. А трэба было супраць. Яны, апусціўшы долу вочы, так і прагаласавалі. А цяпер ідуць да Івана Сцяпанавіча з рознымі просьбамі. І ён дапамагае.

Афанасік пачаў хадайнічаць, каб адрамантавалі страху, раз не далі прыватызаваць жыллё. Абяцалі, але нічога не рабілі. Тады ён купіў будаўнічыя матэрыялы, наняў людзей, і тыя, як маглі, страху адрамантавалі. Потым папрасіў кнігу скаргаў, каб выказаць набалелае. Не далі. Паскардзіўся раённаму пракурору. Старшыню пакаралі. Ён затаіў на Афанасіка яшчэ большую злосць.

Пакралі зерне

Мінулай вясной Іван Афанасік пасеяў тры гектары пшаніцы і гектар ячменю. Засуха была, і ўраджай вырас небагаты. Хацелася яго своечасова ўбраць, каб не дапусціць страт. Пайшоў у калгасную кантору прасіць камбайн, бо свайго не мае. Пшаніцу ўбраў своечасова, а гектар ячменю так і застаўся на полі. Пачаліся дажджы. Зерне асыпалася, зарастала травой. У канторы абяцалі даць камбайн, але не давалі ажно да 20 верасня.

Нарэшце ўбраў тое, што не паспела змарнавацца. Ураджай выдаўся слабы. Прасушыў яго, ссыпаў у мяшкі. Аднойчы пайшоў у калгасную кантору заплаціць за камбайн.

— Не ведаем, колькі з цябе браць. Пытай у старшыні, — сказалі там.

А старшыня загадаў аддаць 150 тысяч за гектар.

— Вельмі дорага! — абурыўся Іван Сцяпанавіч.

— А ты скардзіўся пракурору, і мне давялося заплаціць штраф.

— Усё зерне, што я сабраў з таго няшчаснага гектара, не каштуе такіх грошай. Я вам яго аддам як плату за камбайн.

Ён і праўда сабраў ў дзесяць мяшкоў збожжа, нячышчанае, са смеццем, і павёз на калгасны склад. Але кладаўшчык Тамара Пашкевіч прымаць не стала:

— Мне ніхто не казаў пра гэта.

Афанасік павёз мяшкі да калгаснай канторы і паставіў іх на ганку, паведаміўшы пра гэта галоўнаму бухгалтару Ліліі Півавар.

Назаўтра двух мяшкоў на ганку ўжо не было. Праз дзень знікла яшчэ сем, адзін застаўся. А потым і яго скралі.

Прайшоў месяц. Афанасік напісаў у калгасную кнігу скаргаў: "Куды дзелася збожжа?" Яму прыйшоў адказ: "Мы яго на ганку пільнаваць не павінны". Праўда, платы за камбайн ніхто больш не патрабаваў.

Каму помсцілі?

Жылі ў Малой Сваротве браты Гармановічы — Уладзімір і Віктар. Удвух жылі. Працавалі ў калгасе. Іншы раз на сезонныя работы іх наймаў Іван Афанасік. Віктар нібыта ў космасе існаваў, бо ніколі не меў пашпарта і наогул не значыўся ў сельсавецкіх кнігах. Афанасік дапамог напісаць просьбу ў Баранавіцкі райвыканам: маўляў, дапамажыце. Там выдзелілі 60 тысяч рублёў на атрыманне пашпарта: на паездкі ў райцэнтр, фотакарткі і г.д. Грошы гэтыя перадалі ў сельсавет, і Віктар тры разы хадзіў за восем кіламетраў, каб іх атрымаць. Нялёгка давалася гэта дарога, бо ў яго балела нага.

Нарэшце Віктар Гармановіч атрымаў пашпарт.

А праз месяц ён цяжка захварэў. Паклалі ў бальніцу, дзе неўзабаве бедалага памёр. Але пра яго смерць брату Уладзіміру ніхто не паведаміў. Выпадкова даведаўся. У аднавяскоўца Аляксандра Ціхановіча памерла маці, і ён забіраў яе з морга. Прыехаўшы ў вёску, знайшоў Уладзіміра Гармановіча і кажа:

— У моргу твой брат ляжыць мёртвы... Я сам бачыў.

Калі паехалі забіраць Віктара, накінуліся з папрокамі на медыкаў:

— Чаму не паведамілі, што Віктар памёр?!

— Мы званілі ў калгасную кантору, прасілі, каб перадалі. А яны ў адказ: "У нас такі не працуе".

Вось да чаго дажыліся канторскія работнікі! Помсціць пачалі не толькі жывым, але і мёртвым. І невядома, колькі б ляжаў у моргу няшчасны Віктар Гармановіч, калі б яго выпадкова не ўбачыў зямляк...

Лішні чалавек

Валянцін Палулех не цураўся ніякай работы: быў у калгасе і конюхам, і вартаўніком. Жыў ён адзін, і спадзявацца на дапамогу не прыходзілася. Аднойчы Валянціну перасталі даваць работу.

— Няма, — казалі.

Чалавек галадаў. Дайшло да таго, што варыў і еў кармавыя буракі.

Яго знайшлі мёртвым ва ўласнай хаце. Сядзеў ля адкрытай патухлай печкі. Было Валянціну ўсяго 53 гады...

Мікалай РЫМАРЧЫК.

Баранавіцкі раён.

ГЛАЗАМИ ОЧЕВИДЦА

Линия сталинского позора

Газета "Вечерний Минск" из номера в номер печатает рекламу так называемой "Линии Сталина". Призывает минчан и гостей столицы посетить "мемориал".

Кому же пришла в голову такая маразматическая забава? При чем здесь Сталин? Его нога не ступала возле так называемого противотанкового рва. Как очевидец тех далеких событий, считаю, что это мемориал изнурительному мартышкину труду. Сотни тысяч колхозников с лопатами рыли это сталинское посмешище, позорище. До сих пор в памяти картинка, как два мужика делали после нас идеальные откосы, которые так и не потребовались никому. А как придирчиво два военных их осматривали и принимали!

Стоп! Эта "линия" понадобилась немцам для захоронения трупов солдат, а потом и расстрелянных евреев. Может, ее лучше переименовать в сталинско-гитлеровскую "линию" позора и убийства?

И, что обидно, так это то, что она, "линия", в оборонительном смысле не сыграла никакой роли. Немцы ее преспокойно объехали на танках по большаку.

Чем кичитесь, господин президент? Нам живым свидетелям тех страшных событий, стыдно за сегодняшнюю политику. Кого восхваляете? Тирана всех времен и народов, загубившего миллионы жизней.

Люди! Требуйте этот позор убрать немедленно. А того, в чью голову пришел этот бред, притянуть к ответственности. Это же издевательство над здравым смыслом, над памятью народа. Победа в войне, которую приписывают Сталину, добыта не благодаря его "мудрому" руководству, а благодаря горам трупов, зарытых в противотанковых рвах. Он избавил немцев от копки могил. Этот маразм надо предать анафеме, проклинать, а не возвеличивать в веках.

Виталий Моисеевич ПАРХОЦИК, житель Минска, инвалид Великой Отечественной войны.

НЕРАВНОДУШНЫЙ ВЗГЛЯД

...А убийцей может стать и стиральная машина

В 2005 году многие газеты, в том числе и "Народная воля", сообщили о гибели в Витебске моей пятнадцатилетней внучки Лены. Ее убила стиральная машина.

Этим делом занималась комиссия, которая ставила целью не допустить повторения подобных случаев.

Прошло более года, и что изменилось? Мама и сестра погибшей ежедневно проливают слезы, кошмары не дают покоя. Пришлось менять квартиру, но и это не помогло.

Что касается принятых мер по повышению безопасности работы электротехнического оборудования в быту, то ситуация изменилась не в лучшую сторону. Единственный документ, который имеет, скажем, владелец квартиры — это так называемый технический паспорт, форма которого утверждена приказом Минжилкомхоза Республики Беларусь. Но что же за информацию содержит технический паспорт квартиры?

Все познается в сравнении. Сравним паспорт квартиры с паспортом швейной машины 31 ряда. В паспорте на квартиру даже о площади ничего не узнать. Оказывается: есть площадь виртуальная и есть площадь настоящая. Виртуальная значительно превышает настоящую, но оплата производится по большей. Подвальная площадь имеется, но не упоминается в паспорте.

Сведения о материалах, из которых построена квартира, приводятся по названиям, но не упомянуты стандарты, которые определяют характеристики этих материалов. В паспорте квартиры отсутствуют данные по технике безопасности, надежности, санитарии и так далее.

Кому и для чего нужен такой паспорт, в котором нет упоминания о стандартах?

В паспорте, например, на швейную машину информация базируется на десятках стандартов, имеются все разделы, которых нет в паспорте на квартиру.

За истекший период на пороге моей квартиры появилась стиральная машина, аналог машины-убийцы, опасные узлы электросети перекрыты шкафами с книгами. На обращение к МЧС о сложившейся ситуации ответили, что на ширину прохода не предусмотрен регламент.

Парадокс: на швейные нитки имеются десятки стандартов, а на квартиру фактически ни одного. Мне известно, что когда-то Н.С.Хрущев лично определил ширину прохода в "хрущевках" — 80 сантиметров. Были даны письменные указания мебельным и строительным организациям по такому регламенту, а МЧС утверждает, что нет регламента.

Ситуация к лучшему не изменится, если и в дальнейшем будет пренебрежительное отношение Минжилкомхоза к требованиям стандартов. В течение года можно было внести запись в паспорт квартиры, что электрическая система заземлена и соответствует требованиям техники безопасности. Ничего не сделано.

Падают балконы, текут крыши, проваливаются потолки, гибнут люди из-за неисправности электропроводки. Только непонятно, из-за чего: из-за цинизма или некомпетентности чиновников? Показываешь пальцем опасные точки, а тебе в ответ: мол, нет регламента. Так создайте регламент, если вас не устраивает предложенный Н.С.Хрущевым.

В паспорте сказано, что электропроводка скрытая. И все! О заземлении ни слова!

Ни слова и о надежности других систем. От такого документа веет безразличием к нашему здоровью, к нашей жизни, к нашей экономике. Неслучайно при возникновении конфликтных ситуаций ЖЭСы отправляют людей в суды, они-то хорошо знают, что по важнейшим причинным факторам ЧП регламентов нет, а если так, то и суда нет. Значит, оставайтесь, квартиросъемщики при своих интересах.

Владимир Валерьянович РАЧЕК, житель г.Минска.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
1 САКАВІКА 2007 г.

ЗА КАДРОМ

«Любовь-Морковь» Андрея Курейчика и Александра Стриженова понравилась Алле Пугачевой

2 марта в столичных кинотеатрах — премьера российской комедии "Любовь-Морковь", сценарий к которой написал молодой белорусский драматург Андрей Курейчик.

Благодаря усилиям столичного кинопроката у нас премьера состоится почти на неделю раньше, чем в Москве.

Правда, на днях в Москве состоялся полузакрытый показ фильма. Специально для **Аллы Пугачевой.** Дело в том, что одну из главных ролей в фильме играет **Кристина Орбакайте**, и, чтобы мама не осталась без дочкиного кино, Кристина с режиссером организовали засекреченный ночной спецпоказ.

Режиссер-постановщик фильма — **Александр Стриженов.** В фильме снялась не только Орбакайте, но и другие не менее известные деятели: **Гоша Куценко, Андрей Краско, Михаил Козаков, Евгений Стычкин, Андрей Ургант, Валдис Пельш**.

Журналисты "Московского комсомольца", которым удалось попасть на спецпоказ, пишут, что **Кристина Орбакайте** сыграла роль женщины, которая через семь лет супружеской жизни заявила мужу **(Гоша Куценко)** о своем намерении подать на развод. Ведь детей они так и не завели, а на первое место в жизни вышла карьера. Но супруг предложил воспользоваться последним шансом, чтобы спасти брак: вместе они отправляются к семейному психологу **(Михаил Козаков)**. Психолог врачует души не вполне традиционным способом. Утром они просыпаются, и оказывается, что таинственный доктор поменял их телами. Теперь Кристина Орбакайте играет роль адвоката Андрея, а Гоша Куценко — искусствоведа Марины...

"Я вообще-то должна была родиться мальчиком, — разоткровенничалась с "МК" Кристина, разгоряченная просмотром. — *Тогда не было УЗИ, и те, кто судил по внешним признакам — форме живота, цвету лица, пророчили маме мальчика. Даже имя уже придумали — Стасик. А родилась я. Но близкие друзья семьи меня и сейчас иногда называют Стасиком".*

Алле Борисовне фильм понравился. По ее словам, он получился *"добрый и просветленный".*

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Віктар Каліна адпушчаны пад падпіску ад нявыездзе

Вядомаму выканаўцу Віктару Каліну і яго жонцы Святлане зменена мера стрымання. Як паведамілі БелаПАН у МУС Беларусі, спявак быў адпушчаны са следчага ізалятара пад падпіску аб нявыездзе, яго жонка — пад заклад. "Следства працягваецца і будзе даведзена да канца", — заявіў суразмоўца агенцтва.

Абвінавачанне ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага артыкулам 209 (махлярства) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, было прад'яўлена В.Каліне 5 студзеня. У той жа дзень яго арыштавалі. 27 снежня ў Мінску была затрымана, а потым арыштавана жонка В.Каліны Святлана. Яе затрымалі ў "Абсалютбанку" пры спробе незаконнага атрымання страхавой сумы ў памеры больш як 71 млн рублёў у сувязі з нібыта выкраданнем у Маскве машыны, застрахаванай на 34 тыс. долараў. Аўтамабіль "Мерседэс", які, згодна з заявай С.Каліны, быў выкрадзены, на самай справе быў прададзены, лічаць праваахоўныя органы. У дачыненні да С.Каліны расследуецца крымінальная справа таксама па артыкуле 209 Крымінальнага кодэкса.

"Гісторыя банальная. Быў "Мерседэс", а куды ён дзеўся і пры якіх абставінах — следства разбіраецца, а той факт, што страхавая кампенсацыя ўжо была перададзена ў рукі, — у наяўнасці", — так гэтую сітуацыю на сустрэчы з журналістамі 17 студзеня пракаментаваў генпракурор Пётр Міклашэвіч.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

Ганна ХІТРЫК:

«На сцэне страшна толькі першыя тры хвіліны...»

Маладую актрысу Купалаўскага тэатра Ганну Хітрык можна сустрэць дзе заўгодна. Ледзьве не штодзень у тэатры. Кожны вечар у "Калыханцы" на Першым нацыянальным. А таксама на канцэртах гурта "Детидетей" разам з акцёрамі Купалаўскага Міхаілам Зуем і Дзмітрыем Есяневічам.

А нядаўна Ганна Хітрык узрушыла мінскіх гледачоў удзелам у спектаклі "Матылёк" (Тэатр юнага гледача), дзе сыграла галоўную ролю — радавога Колю Лябёдушкіна, які ператвараецца ў дзяўчыну. Знакаміты рэжысёр спектакля Мікалай Пінігін, які ўжо 8 год працуе ў Пецярбургу, прызнаўся, што паставіў гэтую п'есу ў Мінску спецыяльна для Ганны Хітрык. Маўляў, калі ён ставіў яе ў Пецярбургу, на першым плане была іншая роля, але толькі таму, што Хітрык у Пецярбургу не было.

Сама Ганна гаворыць, што пра гэта не ведала.

— Мне Мікалай Пінігін патэлефанаваў у верасні мінулага года, спытаў, як у мяне з занятасцю, — распавядае Ганна. — Я якраз была вольная, і ён прапанаваў мне ролю Колі Лябёдушкіна. Але ён ніколі не казаў: гэтая роля спецыяльна для цябе і ўсё такое... Потым Пінігін з'ехаў на два месяцы, а затым за два тыдні мы паставілі спектакль. Дарэчы, там два саставы — яшчэ адна актрыса іграе Лябёдушкіна. Але гэтая роля мне вельмі блізкая, нягледзячы на тое, што іграю хлопца.

— Цяжка было працаваць у такім хуткім тэмпе?

— Так, два тыдні — гэта вельмі мала. Але мы загадзя ведалі, што будзе такі кароткі тэрмін, гэта не было нечаканасцю. Калі Пінігін прыехаў, усе ўжо ведалі тэкст і былі падрыхтаваны.

— А як Вам наогул удаецца спалучаць працу ў трох тэатрах: Вы ж і ў Купалаўскім працуеце, і ў Сучасным мастацкім тэатры, а цяпер яшчэ і ў ТЮГу?

— А яшчэ я ў школе выкладаю, працую на тэлебачанні. І вельмі шкадую, што ў сутках толькі 24 гадзіны — можна было б яшчэ столькі ўсяго паспець! Некаторыя людзі вельмі любяць сябе шкадаваць: вось у мяне ўсё кепска, я такі няшчасны, мне не даюць роляў... Мне здаецца, гэта нядобрая рыса. Яны проста апускаюць рукі і закідваюць сябе, а ўсім кажуць, што іх да такога становішча давялі іншыя. Але ж ёсць столькі розных работ, столькі ўсяго цікавага! Праўда, я таксама часам вохкаю і ахкаю, што ў мяне баліць спіна, нага... Але я ведаю, што буду іграць у пластычным спектаклі "С.В." і што папярэдняя актрыса амаль усю ролю стаяла на пуантах. Значыць, мне таксама трэба на іх устаць, нягледзячы ні на што, хаця раней я ніколі не займалася балетам і танцамі.

Пасля гэтага інтэрв'ю я паеду запісваць дыск нашага гурта *"Детидетей"*. Ён выйдзе ўжо зусім хутка. Там будзе каля 15 кампазіцый. Некаторыя, як мы называем іх, "старушкі", але ёсць і новыя. Дыск доўгачаканы. Калі ўсё паспеем, *6 сакавіка* маем намер даць вялікі канцэрт у канцэртнай зале "Мінск".

— Што для Вас зараз важнейшае — тэатр ці такі спосаб самавыяўлення, як *"Детидетей"?*

— І тое, і тое для меня вельмі важна. Але гэта розныя рэчы. Нашаму гурту яшчэ толькі год. А ў тэатры я працую ўжо шэсць гадоў. Што тычыцца тэатра, то спачатку я набывала прафесію, вучылася, пасля пайшла працаваць. А музыкай я займалася ў дзяцінстве. Праўда, з тых часоў ужо амаль нічога не памятаю. Але *"Детидетей"* таму і дарагія, што там усё па-сапраўднаму: я спяваю свае песні, сваю музыку, тое, што мне блізка. Я расказваю ўсё ж такі чужыя гісторыі, хоць і прапускаю іх праз сябе.

— Як ставіцеся да таго, што камусьці Ваша творчасць можа не падабацца?

— Было б дзіўна, калі б усім падабалася! Узяць той самы спектакль "Матылёк". Я лічу, што п'еса — выдатная, рэжысёр — цудоўны. Карацей кажучы, мне ў "Матыльку" ўсё падабаецца! А многім маім сябрам і знаёмым не спадабалася наогул нічога. Я з імі не згодна, але сварыцца і даказваць нешта не буду. Тое самае, калі ў іншых не такія каштоўнасці, як у мяне, — гэта нармальна. Я спяваю пра тое, што для мяне важна. Многія кажуць, праспявай лепей пра тое, як нам весела і добра жывецца, а я адказваю: не хачу, бо мне гэта не цікава.

— Можаце расказаць пра сваю самую складаную ролю?

— Самыя складаныя заўжды самая першая і самая апошняя. Кожны раз думаеш: усё, не спраўлюся, ганьба будзе... А пасля пераадольваеш сябе і спраўляешся. Любая роля — гэта адказнасць. Лёгкіх роляў не бывае, бо кожны раз ты іграеш чыйсьці лёс. Адказнасць вялікая — і перад гледачом, і перад рэжысёрам, і перад самой сабой, і перад бацькамі. А калі яшчэ шмат работ, баішся паўтарыцца, забыць тэкст, не ўвайсці ў ролю. На сцэне, праўда, страшна толькі першыя тры хвіліны... А пасля "адлятаеш" — недарэмна ж сцэну называюць наркотыкам!..

— Некаторыя вядомыя артысты называюць тэатр тэрарыумам. "Купалаўская сям'я" дружная?

— Кажуць, што так, што ў нас атмасфера лепей, чым у іншых тэатрах. Але, канешне, заўжды хтосьці кагосьці не разумее. Ды гэта нармальна — нас так шмат, і мы ўсе такія розныя...

— А якое, дарэчы, у Вас сямейнае становішча?

— У мяне вялікая сям'я: мама, у яе — муж. А ў мяне ёсць каханы чалавек. І яшчэ сястра, мой анёл. А ў яе — муж Колька і мой пляменнік Ванюшка, які з'яўляецца маёй музай у песнях. Сястра кажа: *"Калі нараджу другога, ты зусім разарышся на падарункі"*. Але я так яго люблю!

— А ён глядзіць "Калыханку?"

— Яму яшчэ толькі паўтара года, і ён любіць пад музыку танчыць. Але Ванюша адзіны, хто пазнае мой голас паўсюль. І калі ідзе "Калыханка", ён адразу крычыць: "Аня! Аня!" Пазнае мяне ў Лісічцы, як я ні намагаюся змяніць голас!

Наогул, з "Калыханкай" так цікава атрымалася... Калі вучылася ў Акадэміі мастацтваў на лялечным аддзяленні, у нас быў "падпольны" эцюд "Калыханка", дзе мы паказвалі жорсткае стаўленне да лялек. Яшчэ ў дзяцінстве мне не падабалася "Калыханка", бо лялькі былі нейкія напалову жывыя, дзіўна так перасмыкаліся — было бачна, што яны несапраўдныя. І калі я прайшла кастынг на "Калыханку", то вельмі доўга смяялася: заўжды ганіла гэтую перадачу, а цяпер сама там працую! Але я рада гэтаму кавалачку дзяцінства ў маім жыцці.

— А пра сваіх дзяцей пакуль не думаеце?

— Думаю з 19 год! Усё думаю і думаю *(смяецца)*. Мне ўжо 26. Мяркую, тым людзям, якія для мяне з'яўляюцца аўтарытэтамі, я ўжо нешта даказала. Мая сям'я ў мяне верыць — і насамрэч, для мяне гэта галоўнае. Канешне, я яшчэ не зрабіла ўсё, што хацела... І разумееце, я проста не хачу быць такой мамай, якая кіне дзіцё бабулі і будзе займацца сваімі справамі. Хачу, каб было пасапраўднаму... І ў той жа час я не хачу губляць таго, што ў мяне цяпер ёсць. Сумняваюся, што ў 90 год буду ганарыцца толькі тым, дзе я працавала. Хутчэй я буду цаніць сваіх унукаў... Я ўжо ведаю, што дачку Машкай назаву!

— А яшчэ я чула, што Вы хочаце адкрыць сваю "жывую краму"...

— Так, і там будуць прадаваць тое, што я буду рабіць у сваёй майстэрні — цацкі-лялькі, з вялікімі выразнымі вачыма і смешнымі насамі. На мой погляд, менавіта такія "жывыя" цацкі прываблiваюць дзяцей. Напэўна, калі я буду іграць у тэатры раз у пяць месяцаў чыю-небудзь бабулю, то якраз гэтым і займуся. Вязаць я наўрад ці змагу — не высяджу. А цацкі — якраз для мяне...

Вальжына КОРСАК.

ГАСТРОЛЬ

Интим заказывали?

7 марта в Центральном доме офицеров театральный проект "Виртуозы сцены" представляет спектакль "Новые ресские мужчины, или Мужчины на час".

Одни утверждают, что это довольно глупая и даже пошловатая комедия. Другие называют спектакль "бастионом русской народной антрепризы". Комедия заслуживает внимания и потому, что это режиссерский дебют известного актера **Андрея Краско**, не так давно скончавшегося от сердечного приступа.

Сюжет простой: трое друзей — вдовец, рогоносец и молодой муж — открывают фирму под названием "Мужчины на час". За час они должны обслужить женщину по полной программе. А программа в бюро утех разнообразная: от экскурсии в музей и аттракционов в городском парке до секса (если деваться некуда)...

Коротко: драматург Виктор Мережко; жанр — комедия; актеры — Алексей Маклаков, Валентин Смирнитский, Анна Терехова, Юрий Чернов, Инна Милорадова.

Божена ЯНТАРЕВА.

СЛЫШАЛИ?

В МВД борются с лишним весом

В органах внутренних дел Беларуси начинают активную борьбу с лишним весом сотрудников милиции и внутренних войск. Как сообщает "Интерфакс", *"врачи будут искать новые средства убедить сотрудников вести правильный образ жизни, потому что медики имеют все основания буквально бить тревогу — в последнее время избыточный вес становится одним из наиболее распространенных факторов, способствующих серьезным, опасным для жизни заболеваниям среди сотрудников белорусской милиции".*

В МВД говорят, что *"в течение трех лет будет проведен скрининг метаболического синдрома (МС) у сотрудников органов внутренних дел".*

МС — комплекс взаимосвязанных состояний, к основным из которых относят нарушение жирового обмена, повышенное артериальное давление, повышенное содержание сахара в крови, избыток холестерина.

"Мониторинг практически не потребует финансовых затрат, — говорят в МВД. — *Терапевты во время профилактических осмотров будут измерять сантиметровыми лентами габариты сотрудников милиции, взвешивать, а тонометрами и глюкометрами измерять артериальное давление и уровень сахара в крови".*

Сейчас МВД Беларуси несет немалые потери из-за болезней, которым предшествовал метаболический синдром.

В минувшем году только в центральную поликлинику МВД Беларуси доставили 9 сотрудников МВД с инсультами, двоих с инфарктами, 35 со стенокардией.

ПРЭМ'ЕРА!

Трагічнае каханне Вольгі

16 сакавіка ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы прэм'ера — спектакль "Вольга" па аднайменнай п'есе сучаснага фінскага драматурга Лауры Руахонен.

Твор ужо быў паспяхова пастаўлены на сцэнах тэатраў у Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, ЗША, але ўпершыню ставіцца ў нашай краіне. Галоўныя ролі выконваюць народная артыстка Беларусі **Марыя Захарэвіч** і артысты Купалаўскага тэатра **Андрэй Гладкі** і **Раман Падаляка**.

Над пастаноўкай спектакля працуе знакаміты гродзенскі рэжысёр **Алег Жугжда** *(на фота)*.

"Перш за ўсё гэта будзе вялікая работа для Марыі Захарэвіч — як кампенсацыя за тое, што яна не працавала ў апошнія гады, — сказаў "Народнай волі" **Алег Жугжда.** — *Артыстка такога ўзроўню, як Захарэвіч, канешне, магла б быць больш запатрабаванай. Мы хацелі, каб прэм'ера адбылася напярэдадні юбілею актрысы, але не паспелі. Таму спектакль будзе постфактумам да юбілею".*

Дарэчы, Алег Жугжда ўпершыню працуе ў Мінску менавіта над драматычным спектаклем. Дагэтуль Жугжда працаваў у Мінску толькі непасрэдна па спецыяльнасці — у Тэатры лялек.

"Гэта неверагоднае здарэнне для мяне! — прызнаецца рэжысёр. — *Пастаноўка ў Купалаўскім стала магчымай дзякуючы менавіта Марыі Георгіеўне Захарэвіч. Калі яна знайшла гэтую п'есу, то папрасіла мяне ажыццявіць яе на сцэне".*

У аснове сюжэта "Вольгі" — кранальная гісторыя кахання жанчыны ва ўзросце і маладога чалавека.

"Дзве чалавечыя істоты знаходзяць адна адну ў гэтым свеце, — распавядае рэжысёр. — *Але яны заўсёды раздзеленыя калі не прасторай, дык часам. Вось у гэтым спектаклі якраз трагічнае раздзяленне часам. Чалавек старэе целам, але ўнутры ўсё яшчэ малады. Пра гэта наш спектакль..."*

Выканаўца адной з галоўных роляў артыст **Раман Падаляка** бачыць галоўную ідэю спектакля па-іншаму.

"Там нават не каханне, а проста такая чалавечая любоў на ўзроўні падобнага светаадчування, агульнага стаўлення да нейкіх рэчаў, — выказвае сваё меркаванне малады артыст. — *На мой погляд, галоўная тэма спектакля — пошук сэнсу ў жыцці... Калі казаць зусім шчыра, то ў маім жыцці не было кахання альбо проста стасункаў з такой вялікай розніцай ва ўзросце. Мая каханая дзяўчына маладзейшая за мяне, і я зараз не разумею, як можа быць іначай. Але пры гэтым я лічу, што ўзрост сапраўдным пачуццям не перашкода. Я не бачу ў гэтым нічога забароненага".*

Жонка Алега Жугжды, наадварот, старэйшая за яго.

"Але ў нас, нягледзячы на розніцу ва ўзросце, цудоўныя адносіны", — гаворыць Жугжда.

Галоўная гераіня ўсёй гэтай гісторыі **Марыя Захарэвіч** пакуль што адмаўляецца распавядаць і пра спектакль, і пра сваё асабістае жыццё. Верагодна, баіцца сурочыць. Але абяцае адказаць на ўсе пытанні пасля прэм'еры...

Будзем чакаць!

Андрусь ЛЯСКО.



ПОСТФАКТУМ

Одесская группа заставила минчан мяукать

В минувшие выходные в столичном клубе "Степ" состоялся первый для белорусов концерт одесской группы "Flëur".

"Есть ли на свете цветы, что не вянут, глаза, что на солнце глядят и не слепнут?" — спрашивала со сцены солистка "Флёр" **Елена Войнаровская.** И пришедшие на концерт отвечали ей утвердительно.

К слову, людей на концерт пришло не просто много, а очень много! Но ни переполненный зал, ни задержка начала концерта не смогли испортить впечатление от выступления группы. Все это напоминало цыганский табор в самом лучшем смысле этого слова.

Началось выступление с экспрессивной "Пустоты", и каждая последующая песня сопровождалась все большим шквалом аплодисментов. А под "Теплых котов" мяукал весь зал...

Музыканты были приятно удивлены теплым приемом и пообещали, что минский концерт станет началом хорошей традиции белорусских гастролей. А продюсер группы **Дмитрий Веков**, отметил, что этот концерт был одним из лучших выступлений группы: и по звуку, и по отдаче артистов, и по отзывчивости публики.

После того, как "Флёр" отыграли запланированную программу, посетители стали настойчиво требовать выхода на бис. Солистки не остались равнодушны к просьбам и исполнили еще две песни, после чего под аккомпанемент бурных аплодисментов принялись раздавать автографы и фотографироваться с поклонниками...

Ольга ПРУДНИКОВА.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Беларускамоўны Герман Гесэ

Фактам беларускай літаратуры стаў нарэшце славуты твор класіка нямецкай прозы XX стагоддзя Германа Гесэ — паэма ў прозе "Сідхартха".

Над перакладам надзвычай складанага па форме твора тры гады працаваў віцебскі філолаг, выпускнік ВДУ імя П.Машэрава **Арцём Арашонак.**

"Выбар гэтай кнігі для перакладу на беларускую мову тлумачыцца велізарнай гуманістычнай, культурнай значнасцю паэмы Гесэ, перакладзенай дагэтуль ледзь ці не на ўсе мовы свету", — сказаў 25-гадовы лінгвіст.

На прэзентацыі перакладу, якая днямі адбылася ў Музычнай гасцёўні Віцебска, адзначаліся высокія мастацкія вартасці працы Арцёма Арашонка, дзякуючы таленту і настойлівасці якога класік нямецкай літаратуры "загаварыў" і па-беларуску.

Арцём Арашонак — не пачатковец у літаратуры. Ягоныя артыкулы, проза і пераклады публікаваліся ў часопісах "Дзеяслоў", "Arche", "Маладосць" і ў газеце "Наша Ніва".

Цяпер віцебскі літаратар працуе над перакладамі іншых нямецкіх класікаў — Эрыха Марыі Рэмарка і Пауля Маара.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 САКАВІКА 2007 г.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Фантастычная рэчаіснасць Плошчы

Гасцей Мінска часам здзіўляе тая акалічнасць, што наша сталіца не мае адзінага цэнтра, галоўнай плошчы.

Дакладней, ажно чатыры прэтэндуюць на гэты статус. Плошча Перамогі, плошча Незалежнасці, плошча перад Палацам Рэспублікі і плошча Свабоды. Кожная з іх увасабляе нейкі аспект гісторыі горада, нейкую іпастась нашай краіны. Аднак, не памылюся, калі скажу, што леташняй вясной увага ўсёй краіны ды і ўсёй Еўропы была прыкаваная да плошчы, якая ў сакавіцкія дні ўвасабляла для беларусаў і Перамогу, і Незалежнасць, і Свабоду, і якой людзі Плошчы — жыхары намётавага гарадка надалі імя Кастуся Каліноўскага. Гэту плошчу сёння мы лічым галоўнай, тут цяпер душа і сэрца горада.

Мастак Аляксей Марачкін прысвяціў Плошчы сімвалічнае палатно. На ім — фантастычная трансфармацыя рэальных падзей. У разуменні мастака на Плошчы сышліся гераічнае мінулае, супярэчлівая рэчаіснасць і годная будучыня нашай краіны. Гэту будучыню ўвасабляюць постаці маладых беларусаў — дзяўчына з нацыянальным сцягам і хлопец са сцягам аб'яднанай Еўропы.

Прэзентацыя гэтай карціны і іншых твораў Аляксея Марачкіна адбудзецца 2 сакавіка а 18-й гадзіне ў сядзібе БНФ на праспекце Машэрава, 8 (былая вуліца Варвашэні).

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

ЗАКУЛІССЕ

Каго на «Рок-каранацыі» хацелі закідаць яйкамі

Чарговае ўручэнне рок-карон беларускім музыкам адбылося ў мінулыя выхадныя ў Мінску

Фестываль "Рок-каранацыя" пачаўся традыцыйна — паўгоденыя дзяўчаты ў чорным амаль сінхронна адбілі чачотку, і на сцэне з'явіліся вядучыя. **Яна Каменская** і **Віталь Маліноўскі** расказалі кароткую гісторыю фестывалю і агучылі асноўныя сёлетнія намінацыі. Дарэчы, пераможцаў у кожнай з іх абіраў асобны склад журы, які не агучваўся. Акрамя традыцыйных намінацый з'явілася некалькі новых. Шкада, што "згубілася" леташняя традыцыя вызначаць найлепшы рэгіянальны гурт. Затое застаўся шумамер — спосаб вызначаць прыз глядацкіх сімпатый па гучнасці апладысментаў. Сёлета яго атрымаў "Стары Ольса".

Першым з выступоўцаў на сцэну падняўся *"Таварыш Маўзер"*. І на пытанне вядучых, ці рады ён выступаць на фестывалі, Ян быццам бы жартам адказаў, што зусім не рады і нават быў бы вельмі задаволены, калі б іх закідалі памідорамі і яйкамі — есці вельмі хочацца. Пасля некалькіх пакутлівых спроб настроіць інструменты і слоў: *"На "Каранацыі" ёсць хто-небудзь, хто займаецца гукам на сцэне? Работнікаў сцэны няма ўвогуле! Мерапрыемства ж сур'ёзнае..."* — падалося, што Ян не жартаваў. Разнерваваны вакаліст нават дэманстратыўна сышоў са сцэны. Праўда, неўзабаве вярнуўся і ўсё ж заспяваў. Ды заскакаў так, што джынсы з яго ледзь не зваліліся канчаткова, паказаўшы фанаткам беласнежныя майткі... Але ў намінацыі *"Цяжкая музыка"* перамог не *"Таварыш Маўзер"*, а *"Зьніч"*. Тым не менш магілёўскі гурт ушанавалі крыху пазней — Яна Маўзера, згодна з вынікамі галасавання слухачоў праз *sms* і інтэрнэт-партал *"Тузін гітоў"*, прызналі *"Выканаўцам года"*.

Далей пацягнулася традыцыя — выступаюць адны, кароны атрымліваюць іншыя. Так, публіку заводзілі намінанты *"Пазітыўнай музыкі" "Вірус ліха"*, а перамог *"Нагуаль"* з альбомам *"У Земли под юбкой"*. Шчыра кажучы, сустракалі яго гледачы не так цёпла.

"Традыцыі і сучаснасць", па меркаванні невядомага нам журы, найлепш сумяшчае ў сваёй творчасці *"Юр'я"*. Гурт гэты так і не прыйшоў па ўзнагароду, затое парадаваў выступам *"Стары Ольса"*. Як я казала вышэй, ён атрымаў *"Прыз глядацкіх сімпатый"*. Падчас выступу гурта зусім недарэчна побач з апранутымі адпаведна стылю музыкамі танчыў "мульяшны" парсючок — сімвал сёлетняй "Рок-каранацыі". *"Закалоць яго трэба б"*, — падзяліўся думкамі хтосьці з гледачоў.

Напэўна, яшчэ больш садыскія думкі ўзніклі ў некаторых галовах аматараў року, калі яны пачулі, хто перамог у намінацыі *"Альбом года"*. Ды вы, напэўна, здагадаліся, што гэта быў *"Босиком по мостовой" групы "J_торс"*. Тут прыгадаліся пажаданні Яна Маўзера наконт памідораў і яек. Прадукты харчавання скарыстоўваць не прыйшлося — гурт вырашыў нікога не злаваць і праігнараваў мерапрыемства.

Уладальнікі галоўнай кароны — гурт "Rasta".

Намінацыю *"Дэбют года"* сёлета наогул пакінулі без увагі — маўляў, яркіх дэбютантаў не было. А *"Праектам года"* зрабілі другую складанку *"Прэм'ер Тузін"*. Тут можна падумаць пра неаб'ектыўнасць — "Тузін гітоў" быў адным з арганізатараў фестывалю. Мусіць, "Песні Свабоды" былі б сур'ёзнымі канкурэнтамі...

Найлепшым рок-выканаўцам 2006 года прызнаны **Атмараві**. Праўда, мяркуючы па рэакцыі гледачоў на абвешчаных намінантаў *("Drum extazy", "Zet", "Indiga")*, іх сімпатыі значна адрозніваліся ад сімпатый журы.

"Apple tea" з аднайменным і даволі прафесійна зробленым кліпам перамог у адпаведнай намінацыі. Рэжысёр роліка **Уладзімір Янкоўскі** здымаў яго ў Парыжы і *"атрымаў ад гэтага вялікую асалоду"*.

"Хітом года" прызнана *"Аўтабіяграфія"* **Лявона Вольскага** і **Ігара Варашкевіча.**

Спецпрызам *"Надзея беларускага року"* адзначаны зусім малады ва ўсіх сэнсах ВІА *"Визит"* — маладая, калі не сказаць малая, сімпатычная дзяўчынка-вакалістка і чатыры не менш сімпатычныя і не старэйшыя па выглядзе хлопчыкі. Зусім школьнікі. Ды так яно і ёсць. Дзяўчынцы ўручылі таксама шкляную ружу ад завода "Нёман" — за жаноцкасць. Відавочна, так замянілі намінацыю *"Рок-князёўна"*, у якой, па меркаванні Русі, магла б перамагчы палачанка — Даша з гурта *"Lilith"*.

У якасці гасцей фестывалю былі запрошаны пераможцы мінулага "Басовішча" гурты *"Парасон" і "S.D.M."* і ўладальнік Гран-пры полацкага фестывалю "Рок-кола" расійскі *"DEIMOS"*. Вось гэта быў сапраўдны падарунак — гурт сустракалі на ўра. І са шкадаваннем адзначалі, што якасць музыкі ў нашых усходніх суседзяў значна лепей. Да таго ж, *"DEIMOS"* уразіў тым, што размаўляў з гледачамі выключна па-беларуску. Расійскім гасцям таксама ўручылі карону як найлепшым замежным выканаўцам беларускіх песень.

Але ж вы, канешне, хочаце даведацца, хто забраў галоўную карону? Гэта быў гурт *"Rasta"*. Не здзіўляйцеся: калі вы не аматар цяжкага року, то маглі і зусім не чуць пра яго. Аднак "Rasta" займае адно з першых месцаў па продажы альбомаў у Беларусі. Хоць і арыентаваная на замежжа. Гурт выконвае песні на англійскай мове, удзельнічае ў шматлікіх буйных замежных фестывалях і мусіць быць першым "экспартным" беларускім гуртом. Аднак і на радзіме на музыкаў не забываюцца...

Што б там ні было, можна са стопрацэнтнай упэўненасцю сказаць, што прынамсі тры гледачы не сышлі з фестывалю незадаволенымі. Бо спонсары фестывалю зладзілі латарэю. Сімвал сёлетняй "Рок-каранацыі" — вясёлы парсюк называў рад і месца, і глядач, які там сядзеў, атрымліваў бясплатна скрыню піва "Бобров" — гэткае *"свінячае шчасце"* ад сімвала года...

Вальжына КОРСАК.

СІТУАЦЫЯ

Валуны на «Востраве слёз» — крадзеныя?

Сваю гісторыю пра валуны, якія цяпер сталі помнікам воінам-афганцам ля Траецкага прадмесця сталіцы, расказвае акадэмік Радзім Гарэцкі.

Дзень памяці воінаў-афганцаў. "Востраў слёз". "Востраў слёз" сёння — гэта перадусім помнік, які выкананы ў выглядзе Храма. Ён стаіць на 16 слупах, умацаваных валунамі. Перад храмам — закладны валун з бронзавай іконай Божай маці і памятным тэкстам. На востраве яшчэ каля 30 валуноў. Усе яны маюць арыгінальную форму, вялікія ў аб'ёме і на кожным — бронзавыя шыльды з назвамі афганскіх гарадоў на фарсі.

Адкуль на штучным востраве ледніковыя прышэльцы?

Найлепшы знаўца беларускай геалогіі — акадэмік Радзім Гарэцкі. Ягоны адказ пралівае святло на запозненую сенсацыю.

— Гэтыя камяні — з унікальнай калекцыі ледавіковых, што размешчана ў Мінску ў невялікай лагчыне жылога мікрараёна "Уручча-1", — кажа акадэмік і некалькі разоў паўтарае, што ўсе камяні на востраве — скрадзеныя.

Прозвішчы чыноўнікаў, якія бесцырымонна парушылі экспазіцыю музея валуноў, акадэмік не называе. Але прыгадвае, што ў Адміністрацыю прэзідэнта быў накіраваны ліст, у якім супрацоўнікі Інстытута геалогіі, геахіміі і геафізікі НАН Беларусі патрабавалі тлумачэння: на якіх падставах і хто даў дазвол на рабаўніцтва тэматычнай экспазіцыі?

— Да мяне прыехаў чыноўнік, які займаў вельмі высокую пасаду. Ён прасіў "не ўзнімаць шум", патрабаваў, каб я напісаў, што камяні наш інстытут "дараваў добраахвотна". Ліст я не напісаў.

Да сёння шчыміць сэрца акадэміка. Даходзяць да яго чуткі, што валуны на мінскім востраве служаць за сталы для пляшак. Вясёлыя кампаніі разліваюць тут гарэлку і віно. Асабліва, калі пад'язджаюць вясельныя картэжы. Улетку на камянях грэюць свае азадкі распранутыя маладзіцы. Імкнуцца адкалоць ад валуна кавалачак іхнія партнёры.

...У 1977 годзе была створана спецыяльная экспедыцыя дзеля збору і дастаўкі валуноў у Мінск. У той час загадчык аддзела геахіміі і геафізікі Гаўрыла Гарэцкі дабіўся прыняцця спецыяльнай пастановы ўрада на тое, каб стварыць у сталіцы музей камянёў пад адкрытым небам. Выкладзеную з іх "Мапу Беларусі" напачатку засеялі травою аднаго колеру, астатнія плошчы — травой іншага адцення. Была сканструявана сістэма інжынерных збудаванняў, каналізацыя, палівачны і пітны водаправоды, абсталяваны два фантанчыкі — дзеля наталення смагі наведнікамі. Пешаходныя дарожкі выклалі пліткай. Паўсюль усталявалі паркавыя ліхтары, каб музей можна было наведаць і ўвечары. Каб ён стаў месцам не толькі экскурсій, але і месцам адпачынку.

У цяперашняй улады нібыта не хапае грошай на ўсё гэта. А меркавалася зрабіць яшчэ "Прысаду валуноў". Мусілі ажывіць яе скульптурнымі кампазіцыямі на розныя тэмы: "Валуны — сімвалы галоўных вех гісторыі развіцця геалагічнай навукі Беларусі", "Дарога паданняў пра валуны", "Каменны заапарк" ды іншыя. Скульптар Янушкевіч выканаў для музея цудоўныя бронзавыя барэльефы па матывах легенд пра валуны. Нарэшце, меркавалася абсталяваць усю пляцоўку па-мастацку выкананымі ўказальнікамі, каб наведнікі не пачуваліся тут, на ягоных сцяжынах, "глухімі і сляпымі". З паспяховым завяршэннем усіх гэтых прац музей валуноў стаў бы выдатнай мясцінай сталіцы, адмысловым мастацкім творам, сапраўднай каменнай песняй-баладай на гонар роднага краю. Ды, на жаль, спадзяванням гэтым не суджана было спраўдзіцца. Памёр акадэмік Гарэцкі, а затым — і іншыя заснавальнікі музея. Акадэмія навук Беларусі фінансава збяднела — і музей, забраўшы з яго каштоўныя экспанаты, проста знядбалі.

Галіна БАРАВАЯ,
www.bulletinonline.org

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Нам не хапае вас!

Скажам шчыра: фінансавая сітуацыя газеты палепшылася б, калі б яе прыхільнікаў было на тысячы трычатыры болей. Таму ў нас вялікая просьба да сталых чытачоў: дапамажыце, калі ласка, загітаваць тых, хто ў бліжэйшы час змог бы зрабіць **перадаплату** за будучыя нумары. Калі грошы будуць пералічаны ў бліжэйшыя дні, то мы зможам аператыўна даслаць нават першыя сакавіцкія нумары. Дзеля гэтага мы і друкуем сёння ўзоры плацежкі і абаненцкай карткі. Дарэчы, яны патрэбны і тым, хто спазніўся з перадаплатай за сакавіцкія нумары, але хоча бесперабойна атрымліваць іх. Не ўпусціце свой шанц.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский наиск обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ЧУЛІ?

Калі ўбачыце, што самалёт садзіцца на шасэ, не здзіўляйцеся

У баявую падрыхтоўку авіяцыі Узброеных сіл Беларусі ў 2007 годзе ўключана некалькі новых элементаў. Пра гэта паведаміў намеснік камандуючага ВПС і войскамі СПА — начальнік авіяцыі генерал-маёр Міхаіл Лявіцкі.

У прыватнасці, адным з элементаў баявой падрыхтоўкі стане пасадка самалётаў на аўтамабільныя дарогі (падобнага ў Беларусі яшчэ не было). У пачатку красавіка пройдзе навучальна-метадычны збор з лётным саставам, які будзе задзейнічаны ў пасадках на аўтастрады.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

У Брэсце загінуў сямікласнік, які ўпаў з 15-га паверха

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры Маскоўскага раёна, якая праводзіць праверку па гэтым факце, трагедыя здарылася 25 лютага ў 16.55 у доме па вуліцы Гаўрылава. Паводле папярэдняй версіі, хлопчык 1994 года нараджэння гуляў з сябрамі на вуліцы. Замёрзлыя дзеці зайшлі пагрэцца ў пад'езд дома. Вучань 7-га класа вырашыў паказаць сваю смеласць і паспрабаваў пералезці з карніза балкона на дах суседняй лоджыі 15-га паверха. Ён ступіў нагой на дах лоджыі, не ўтрымаўся і ўпаў.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 28.02.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №